«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 ЖНІЎНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 150
(26263)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Водаправод ужо адрамантавалі. А ён зноў «парваўся»...

Паводле слоў жыхаркі вёскі Белае Лагойскага раёна Ірыны Мікалаеўны Рублеўскай, праблемы з водаправодам у іх населеным пункце турбуюць месцічаў ужо гадоў з пятнаццаць: яго ўвесь час прарывае. Пасля апошняга такога здарэння вяскоўцы, як сказала заяўніца, паўтара месяца не маюць вады.

— На ўсю вёску — толькі два калодзежы. А на лета ж да нас прыехалі дзеці, унукі — вады патрэбна шмат. Пачалі, што зробіш, браць яе з тых калодзежаў. Дык у тых, хто вымушаны быў яе спажываць, пачалі ўзнікаць праблемы са здароўем. Выклікалі санстанцыю, тая пацвердзіла: калодзежы трэба чысціць, выпісала адпаведнае прадпісанне сельскаму Савету. Аднак прайшоў час, а нічога не змянілася: ні калодзежы не пачышчаныя, ні водаправод не адрамантаваны. Хоць, як мы чулі, старшыні райвыканкама спецыялісты мясцовага камунгаса, на чыім балансе знаходзіцца водаправод, паведамілі: маўляў, вада ў людзей ёсць. Тое ж нам сказалі і ў санстанцыі: чаго зноў тэлефануеце, калі ваша праблема прынамсі з водаправодам павінна ўжо быць вырашана. Але ж вады няма — казала нам увечары ў панядзелак у тэлефоннай гутарцы Ірына Мікалаеўна.

Дапамагчы высветліць сітуацыю мы папрасілі загадчыка сектара кантролю кіраўніцтва справамі Лагойскага райвыканкама Алену Дэйнар. Пасля праверкі ўсіх акалічнасцяў наконт рамонту водаправода ў вёсцы Белае яна паведаміла рэдакцыі наступнае.

Ніхто і нікога не думаў уводзіць у зман. Свідравіна была забітая пяском, яе пачысцілі і далі ваду. Але як толькі гэта зрабілі (адпаведна, напор павялічыўся), водаправод (дарэчы, яшчэ савецкіх часоў) не вытрымаў у двух іншых месцах. І цяпер даводзіцца мяняць трубы на ўчастках агульнай працягласцю 200 метраў. Як запэўніла Алена Анатольеўна, работнікі камунгаса будуць імкнуцца зрабіць гэта да канца дня (размова адбылася пасля 15 гадзін у аўторак. — **С.Р.**) і даць вяскоўцам ваду.

Што да калодзежаў у вёсцы, дык прадпісанне санстанцыі ніхто не адмяняў: да 15 жніўня з іх павінны адпампаваць ваду, прадэзынфікаваць. Як сказала Алена Дэйнар, ні тэхнічных, ні матэрыяльных перашкод (спецыяльныя таблеткі для дэзынфекцыі каштуюць нядорага) няма.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў неабходнасць завяршэння ўборкі 80 працэнтаў ураджаю да канца тыдня

Аб гэтым ён сказаў на нарадзе па найбольш актуальных пытаннях жыццядзейнасці рэгіёнаў краіны.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Калі да канца тыдня мы не выканаем уборку на 80 працэнтаў, будзе вельмі складана». Пры гэтым ён растлумачыў, што ў выпадку несвоечасовай уборкі сітуацыя ўскладніцца тым, што няўбраныя палі будуць зарастаць травой. Акрамя таго, з другой дэкады жніўня кожны дзень будзе прыносіць страты ўраджаю з-за асыпання каласоў.

Як адзначыў Прэзідэнт, сёння самая галоўная і вострая праблема — гэта ўборка ўраджаю, а дакладней, яе заканчэнне, эфектыўнасць работы. «Што робіцца ў абласцях для паскарэння тэмпаў уборкі? Ці ўсё рацыянальна і прадумана ў арганізацыйным плане? Ці няма неапрацаваных простояў тэхнікі?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што на нядаўняй нарадзе ў Камянецкім раёне былі вызначаны аб'ёмы вытворчасці збожжа і кармоў, на якія трэба выйсці ў гэтым годзе, а таксама агавораны графікі ўборачных работ у рэгіёнах.

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што сітуацыя ў рэгіёнах патрабуе больш глыбокага аналізу, у тым ліку ў вызначэнні важнейшых напрамкаў у рабоце ўпаўнаважаных прадстаўнікоў кіраўніка дзяржавы ў абласцях і горадзе Мінску. «Патрабуе таксама большай увагі дзейнасць памочнікаў Прэзідэнта — галоўных інспектараў па рэгіёнах. Апошнім часам, на жаль, яны працуюць вельмі пасіўна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Яшчэ раз хачу нагадаць: ні памочнік, ні ўпаўнаважаны не павінны быць прыдаткам губернатара. Гэта вочы і вушы Прэзідэнта ў рэгіёне. У нас жа атрымліваецца наадварот: памочнікі (я наогул, шчыра кажучы, іх работы не бачу) сталі поплеч з губернатарамі, падтакваюць ім або спрабуюць апраўдаць якія-небудзь іх няўдачы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У вас рычагі павінны быць іншыя. Вы павінны ўсё бачыць, заўважаць, своечасова даводзіць да Прэзідэнта патрэбную інфармацыю і пры гэтым па магчымасці вырашаць на месцы тыя праблемы, якія можна вырашыць».

Павінна быць зроблена ўсё, каб парламенцкія выбары ў Беларусі ў 2008 годзе прайшлі адкрыта, дэмакратычна, у поўнай адпаведнасці з беларускім заканадаўствам. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Гэта самая важная палітычная кампанія ў гэтым годзе, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы павінны ведаць, якія настроі людзей, чым яны не задаволены, па якіх пытаннях крытыкуюць уладу».

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад памочнікаў Прэзідэнта — галоўных інспектараў па абласцях і горадзе Мінску, а таксама ад упаўнаважаных прадстаўнікоў кіраўніка дзяржавы ў рэгіёнах аб'ектыўнай ацэнкі сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў кожным рэгіёне краіны.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

Месца	Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
1.	Кітай	13	3	4	20
2.	ЗША	7	6	8	21
3.	Паўднёвая Карэя	5	6	1	12
4.	Італія	3	4	2	9
5.	Аўстралія	3	2	5	10
6.	Японія	3	1	2	6
7.	Германія	3	1	1	5
8.	Расія	2	4	3	9
9.	Вялікабрытанія	2	1	2	5
10.	Чэхія	2	0	0	2
11.	Паўночная Карэя	1	2	4	7
12.	Азербайджан	1	2	0	3
13.	Нідэрланды	1	1	2	4
14.	Славакія	1	1	0	2
15.	Іспанія	1	0	1	2
16.	Румынія	1	0	1	2
17.	Фінляндыя	1	0	1	2
18.	Індыя	1	0	0	1
19.	Тайланд	1	0	0	1
20.	Францыя	0	7	2	9
21.	Зімбабвэ	0	2	0	2
22.	Аўстрыя	0	1	1	2
23.	Казахстан	0	1	1	2
24.	Куба	0	1	1	2
25.	Венгрыя	0	1	0	1
26.	В'етнам	0	1	0	1
27.	Калумбія	0	1	0	1
28.	Нарвегія	0	1	0	1
29.	Турцыя	0	1	0	1
30.	Швецыя	0	1	0	1
31.	Бразілія	0	0	3	3
32.	Арменія	0	0	2	2
33.	Інданезія	0	0	2	2
34.	Тайвань	0	0	2	2
35.	**Беларусь**	**0**	**0**	**1**	**1**
36.	Алжыр	0	0	1	1
37.	Грузія	0	0	1	1
38.	Мексіка	0	0	1	1
39.	Таджыкістан	0	0	1	1
40.	Тога	0	0	1	1
41.	Туркменістан	0	0	1	1
42.	Узбекістан	0	0	1	1
43.	Украіна	0	0	1	1
44.	Харватыя	0	0	1	1
45.	Швейцарыя	0	0	1	1

Па стану на 18.00 12 жніўня.

Беларусь мае намер прыняць меры па паляпшэнні адносінаў з краінамі Еўрапейскага саюза і ЗША

Аб сітуацыі на асноўных напрамках знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь 12 жніўня кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку далажыў міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў. Былі прадметна абмеркаваны існуючыя пытанні па галоўных вектарах знешнепалітычнай дзейнасці.

Прэзідэнт асабліва падкрэсліў, што Беларусь імкнецца развіваць максімальна глыбокія, канструктыўныя і плённыя адносіны абсалютна з усімі сваімі стратэгічнымі партнёрамі, суседзямі, краінамі блізкага і далёкага замежжа.

У сувязі з гэтым было закранута пытанне аб неабходных мерах па паляпшэнні адносінаў з краінамі Еўрапейскага саюза і Злучанымі Штатамі Амерыкі. Прэзідэнт даў канкрэтныя даручэнні адносна таго, што павінна быць зроблена ў мэтах паляпшэння адносінаў з гэтай групай дзяржаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

КАПІТАНЫ БЛІЖНЯГА ПЛАВАННЯ

Генадзь МАЛАШЧАНКА з сынам Мацвеем на сваёй «Жамчужыне» вяртаюцца з чарговага плавання.

На прыгарадным возеры Вечалле Ушацкага раёна курсіруе плыт-дом, у якім можна не проста пракаціцца — жыць. Яго прыдумаў, сканструяваў і стварыў жыхар Ушачаў Генадзь Малашчанка.

— Калі сыну Мацвею споўнілася два гады, мы пачалі з ім марыць пра свой уласны карабель, а вады на Ушаччыне, дзякуй богу, хапае, адных азёр болей за дзвесце, — кажа гаспадар і кіроўца незвычайнага выхаходства.

Яму спатрэбілася тры гады, каб ажыццявіць задуманае. Надзейны плыт-падлога, лёгкая і моцная канструкцыя дома-каюты, рухавік, штурвал... Само сабою, прывабны выгляд, утульнае абсталяванне пакоя — дзве канапы, музыка, на палубе стол для снедання, канапа-арэлі. Яшчэ ёсць водная горка, вуда і абавязковы атрыбут — самавар на вуглях — гэта ўжо як візітная картка. І галоўнае, без чаго судна не бывае сапраўдным, — бартавы нумар і, зразумела, імя. І вось ужо няма адбою ад ахвотных правесці час на гэтым азёрным судне.

— Спачатку думак пра тое, што буду здаваць «Жамчужыну» ў арэнду, не было — для сваёй сям'і рабіў, для свайго задавальнення. Але жадаючых прапліць усё болей і болей. На ім ужо адзначалі дні нараджэння і нават вяселле.

Для цікаўных не лішне паведаміць, што «Жамчужына» развівае хуткасць да пяці кіламетраў за гадзіну. А возера Вечалле якраз мае даўжыню пяць кіламетраў. Але глыбіня месцамі амаль марская — да 36 метраў.

Ва ўшацкай раённай газеце падказалі, што Генадзь Малашчанка не проста цікавая асоба, ён ужо шмат гадоў аказвае фінансавую падтрымку ўшацкаму дзіцячаму прытулку і спансіруе многія спартыўныя спаборніцтвы раёна. А яшчэ за ўласныя сродкі пабудаваў выдатную спартыўна-гульнявую дзіцячую пляцоўку, якую з задавальненнем наведвае ўшацкая дзятва.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

«МОЦНЫ НАПОЙ» З... НОВАГА ЎЗРОСТУ?

У Беларусі скарачаюцца натуральныя страты насельніцтва. Паводле слоў намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны ШЭМЕТАВЕЦ, у першай палове гэтага года адносна аналагічнага леташняга перыяду паказчыкі нараджальнасці павялічыліся на 2,3, а паказчыкі смяротнасці — знізіліся на 1,1 працэнта. Адначасова адзначана станоўчае сальда міграцыі. Як вынік, замарудзілася скарачэнне колькасці жыхароў Беларусі. З пачатку года нас стала менш на 14,5 тысячы — па стане на 1 ліпеня ў краіне пражывала 9 мільёнаў 675,3 тысячы чалавек.

«МАЦЯРЫНСКІ КАПІТАЛ»: ПЫТАННЕ НЕВЯДОМАЕ

Найбольш высокімі тэмпамі нараджальнасць павялічвалася ў Гомельскай і Гродзенскай абласцях, у Мінску. Сталіца аказалася адзіным рэгіёнам, які выйшаў на натуральны прырост насельніцтва. Гэта можна патлумачыць дэмаграфічнай сітуацыяй — у Беларусі назіраецца павелічэнне колькасці жанчын ва ўзросце 20—29 гадоў. Даводзіцца канстатаваць рост колькасці «адкладзеных нараджэнняў» з канца мінулага стагоддзя — жанчынамі ва ўзросце ад 30 да 39 гадоў. Адыгрываюць сваю ролю і меры сацыяльнай падтрымкі.

Між тым, адна з па-сапраўднаму папулярных тэм зараз — увядзенне «мацярынскага капіталу». З'явілася нават паведамленні: пасля нараджэння другога дзіцяці сям'я зможа разлічваць на выплату ў памеры 10 млн рублёў. Наколькі верагодны такі варыянт?

— З пункту гледжання стымулявання нараджальнасці сістэма «мацярынскага капіталу» цікавая, такая прапанова сапраўды ёсць, аднак пакуль не трэба разглядаць толькі як прапанову, — паведаміла Таццяна Шэметавец. — Прынамсі, на сёння ні Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, ні Міністэрства фінансаў ніякіх канкрэтных дакументаў на гэты конт не рыхтуюць. Да таго ж не сакрэт: у дадзеным выпадку многае будзе залежаць ад нашых фінансавых магчымасцяў. Пры гэтым, заўважыла Таццяна Шэметавец, у адрозненне ад Расіі, дзе сістэма «мацярынскага капіталу» ўжо працуе, Беларусь мае сваю мадэль сацыяльнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі і ў нечым — больш важкую. У якасці прыкладу тут можна ўзгадаць ільготы на будаўніцтва жылля.

Яшчэ адной мерай падтрымкі з'яўляюцца дзіцячыя дапамогі. Як падкрэсліваюць у міністэрстве, у самы бліжэйшы час памер дапамогі па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў павялічыцца і выйдзе на аднаку 100 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму.

ГАЛОЎНАЯ ПРАБЛЕМА — АЛКАГОЛЬ

Галоўнымі прычынамі смяротнасці ў Беларусі, як і ва ўсёй Еўропе, застаюцца сардэчна-сасудзістыя і анкалагічныя захворванні. Разам з тым, адзначыў начальнік управлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Ігар Броўка, паказчыкі тут зменшыліся — у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 4,3 і 0,3 працэнта адпаведна. Не ў апошнюю чаргу гэта сталася вынікам укаранення новых тэхналогій.

Не менш значнай акалічнасцю аказалася агульная дыспансэрызацыя. За першае паўгоддзе яе прайшлі 54,4 працэнта дарослых грамадзян Беларусі, прычым у выніку абследаванняў медыкі выявілі і прызначылі лячэнне па... 1,7 млн новых захворванняў.

Праўда, заўважыў Ігар Броўка, адначасова трэба весці гаворку аб праблемах. Адна з іх — недахоп урачоў. Па рэгіёнах дэфіцыт складае ад 200 да 2,5 тыс. спецыялістаў, прычым у сумных лідарах тут апынуўся Мінск. Зрэшты, пытанне з медыкамі вырашальнае — дзякуючы павелічэнню набору ў прафільныя ВНУ сітуацыя павінна змяніцца ў лепшы бок на працягу бліжэйшых 5—6 гадоў. Горш іншае. Статыстыка сведчыць, што сёлета назіраецца рост смяротнасці ад самазабойстваў і выпадковых атручванняў алкаголем. Прычым апошняе асабліва актуальнае для вёскі.

У сувязі з гэтым, паведаміў Ігар Броўка, зараз прапануецца пайсці на дадатковыя антыалкагольныя меры. У прыватнасці, ***у найбліжэйшы час ёсць намер абмежаваць рэкламу піва і слабаалкагольных напояў у сродках масавай інфармацыі, «узаконіць» забарону на рэалізацыю спіртнога ў вячэрні і начны час на ўзроўні ўсіх без выключэння рэгіёнаў. Плюс да таго Міністэрства аховы здароўя выступае з ініцыятывай: дазволіць продаж алкаголю моладзі не з 18, а з 21 года.***

ЧАКАЕМ... «КАРТУ БЕЛАРУСА»

З пачатку года на сталае месца жыхарства ў Беларусь пераехала 6858 чалавек, у той час як эмігравалі за мяжу 4162 нашыя суайчыннікі. Паводле слоў **першага намесніка начальніка дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі Аляксея БЕГУНА**, больш за 90 працэнтаў грамадзян, якія прыбылі ў нашу краіну, дагэтуль пражывалі ў краінах СНД. Пры гэтым цікавы факт: 80 працэнтаў мігрантаў маюць працаздольны ўзрост.

Апошнім часам Міністэрства замежных спраў актывізавала работу перш-наперш у Расіі, Казахстане і ва Украіне з нашымі суайчыннікамі, якія выказваюць жаданне перасяліцца на Беларусь. Плюс да таго, пытанні прадастаўлення дазволаў на пастаяннае жыхарства і грамадзянства сталі разглядацца больш аператыўна. Пры гэтым, як паведаміў Аляксей Бягун, дзейнасць па вяртанні суайчыннікаў працягнецца — плануецца ўвесці «карту беларуса». Яе мяркуецца выдаваць асобам, што маюць беларускае паходжанне і актыўна супрацоўнічаюць з нашай краінай на ўсіх сферах.

Паралельна распрацаваны праект шэрагу мераў па вяртанні на Беларусь высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія з'яўляюцца нашымі грамадзянамі, аднак працяглы час працуюць па кантрактах за мяжой. Да слова, у асобныя гады колькасць «працоўных» мігрантаў дасягала 15—19 тысяч чалавек.

Разам з тым, падкрэсліў Аляксей Бягун, іміграцыя ў Беларусь будзе выбарачнай. У прыватнасці, у пражыванні на тэрыторыі Беларусі будзе адмаўляцца іншаземцам, якія маюць праблемы з законам або з'яўляюцца носьбітамі шэрагу сацыяльна небяспечных захворванняў.

Сяргей ГРЫБ.

ЖНІВО-2008

УСЯГО ПА КРАІНЕ:
5 млн. 561,5 тыс.тон;
64,12%;
37,79 ц/га.

Віцебская
534,83 тыс.тон;
45,64%;
33,75 ц/га.

Мінская
1 млн. 333,68 тыс.тон;
60,18%;
37,34 ц/га.

Гродзенская
1 млн. 97,22 тыс.тон;
66,26%;
48,18 ц/га.

Магілёўская
716,27 тыс.тон;
57,39%;
38,41 ц/га.

Брэсцкая
1 млн. 3,03 тыс.тон;
75,51%;
38,3 ц/га.

Гомельская
876,46 тыс.тон;
83,21%;
31,51 ц/га.

Намалочана | Убрана | Ураджайнасць

Мужаў і жончын камбайн

Таццяна Аляксандраўна і Уладзімір Вітальевіч ЖУКІ другі сезон працуюць на ўборцы ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Цішоўка» Магілёўскага раёна.

Абедзенны час на полі — гэта не гадзіна, а літаральна дзесятак хвілінаў на ежу, за якой засяроджана назіраюць два буслы. А ўся мужчынская кампанія камбайнераў уважліва слухае, як Таццяна Аляксандраўна, адзіная сярод іх жанчына — памочніца камбайнера, таропка даядаючы булку, дае інтэрв'ю.

Яна ўжо пенсіянерка і ў жніве бярэ ўдзел дзеля заробку. Няблага папоўніць сямейны бюджэт удалося летась, і цяпер Таццяна Аляксандраўна разлічвае зарабіць як мінімум мільён рублёў. Плюс заробак мужа.

Галоўны расходны артыкул — апрануць і набыць розныя неабходныя рэчы (не дробязі, а нават камп'ютар) для 8-гадовай дачкі Алены, якая сёлета пойдзе ў 3-ці клас.

Таццяна Аляксандраўна — жвавая жанчына, з адкрытай маладой усмешкай. Цяжка паверыць, што ў яе чацвёра дзяцей. Яна прыехала на Беларусь з Варкуты 15 гадоў таму і знайшла тут сваё шчасце і любімага мужа.

— А кажуць, што мужу з жонкай працаваць разам нельга. Ці праўда?

— Не, можна. Трэба толькі ступаць адно аднаму. Няважна, хто каму. Каб толькі добра было, — дзеліцца рэцэптам сумеснай з мужам працы Таццяна Аляксандраўна.

— Ды нармалёва. На працы не трэба лаяцца — лепш пасмяяцца разам, — падае голас муж Уладзімір Вітальевіч.

Як і іншыя сельскія працаўнікі, механізатар Жук — чалавек сціплы, лішняга слова з яго не выцягнеш. Калегі вызначаюць яго як аса ў сваім механізатарскім майстэрстве, і на жніве ён працуе ўжо нямала гадоў.

Экіпаж разлічвае сёлета быць у перадавіках сваёй гаспадаркі. Іх асноўныя сапернікі — таксама сямейны экіпаж, Пётр Іванавіч Юркоў з сынам Леанідам. Яны таксама працуюць другі год, і летась ужо атрымалі падарункі ад УКСП «Цішоўка». Так што барацьба ідзе жорсткая. Як толькі адзін камбайн кранаецца з месца, усе размовы абрываюцца: сыняецца інтэрв'ю, а механізатары з усіх ног бягуць да сваіх машын, дый заклікі сфатаграфавацца па-належнаму не кранаюць суровыя сэрцы камбайнераў. Што ж, у хлебаробаў цяпер не стае часу. У «Цішоўцы» жніво толькі пераваліла за экватар: працы яшчэ шмат!

Увогуле Магілёўскі раён, паводле інфармацыі на 12 жніўня, — лідар па вобласці ў намалоце збожжа — амаль 87 тысяч тон.

Сярэдняя ўраджайнасць у Магілёўскім раёне — 48 цэнтнераў з гектара, што болей за леташні паказчык. У лідараў — СВК «Палыкавічы» і ЗАТ «Зара» — 78-79 цэнтнераў з гектара. У раёне на гэтым тыдні збіраюцца ўшаноўваць ужо «трохтысячнікаў»: з прэміямі, падарункамі і добрымі канцэртамі.

— Мы сёлета яшчэ ад вясны шмат зрабілі для добрага ўраджаю, ды і ўмовы надвор'я нас не падвялі, — лічыць старшыня Магілёўскага райвыканкама Аляксандр Разганаў. — Сёння мы на апошнім этапе: трэба хутка і добра сабраць хлеб. Кажуць, што бліжэйшыя дні будуць гарачымі ў сэнсе тэмпературы паветра, але яны будуць гарачымі і для хлебаробаў. На гэтым тыдні асноўныя работы на палях гаспадарак трэба завяршыць і дапамагаць людзям убіраць іх надзелы.

Ілона ІВАНОВА.

Магілёўскі раён.

ООО «Союзфинлизинг» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже трехэтажного кирпичного нежилого капитального строения (инвентарный номер 500/С-46792) общей площадью 5 978 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, проспект Независимости, д. 58 (здание производственного корпуса № 7).

Начальная цена – 29 024 000 000 белорусских рублей без учета НДС.

Продаваемый объект расположен на земельном участке площадью 0,3179 га, кадастровый номер 500000000008004104.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка в размере 290 240 000 белорусских рублей и платы за участие в аукционе в размере 4 базовых величин; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток и плата за участие в аукционе перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2 (двух) месяцев с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится 15 сентября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 12 сентября 2008 года до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

УНП 190398583

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк»

С 13 августа 2008 г. на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 01.08.2008 № 105, размер ставки рефинансирования установлен в размере 10,5 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада **«Универсальный»**, заключенных в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и **«Сберегательный»**, заключенных в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 **на 0,25 процентного пункта с 13.08.2008 г.**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней:
звонок со стационарного телефона – бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БеСТ, Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 13.08.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША 2 111,00
1 еўра 3 145,71
1 латвійскі лат 4 468,20
1 літоўскі літ 910,62
1 чэшская крона 130,28
1 польскі злоты 957,20
1 расійскі рубель 86,72
1 украінская грыўня 456,83

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD 24,3424
10 UAH 52,6322
1000 BYR 11,5258
EUR 36,1850

Курс у гандлёвых кампаніях (на 12.08.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ПАКУЛЬ НАРОД СМЯЕЦЦА, ЁН НА ЗЯМЛІ ЖЫВЕ!

Рэпартаж з колаў

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 12 жніўня.)

...Адметнасць сёлетняга шостага фестывалю заключалася ў тым, што з'ехаліся на яго не толькі дарослыя гумарысты, але і дзеці. Уражвала шэсце: каманды ад кожнай з абласцей і горада Мінска суправаджаў экскорт матацыклістаў, у асобнай калоне ішла дзятва, у асобнай — госці (у тым ліку з Украіны і Расіі). Па традыцыі ўжо на верталёце прыляцелі ў Аўцюкі галоўныя «журылышчыкі» — пісьменнік, старшыня дзіцячага фонду, рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі, мастацкі кіраўнік хору імя Цітовіча, народны артыст Беларусі, прафесар Міхаіл Дрыневскі, мастацкі кіраўнік тэатра пародый, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Радзівілаў, загадчыца аддзела часопіса «Вясёлка» Настасся Радзікевіч.

На зямлі іх ужо чакаў запрэжаны конь і рамізнік Буржуй (так у Малых Аўцюках завуць Івана Багдановіча). Дарэчы, менавіта ў гэты дзень ён са сваёй Буржуіхай і Буржуянятамі — у сям'і трое дзяцей і шасцёра ўнукаў — святкавалі 37-ю гадавіну... «вяселля» (сказаў Іван Фёдаравіч)... «катаргі» (уздыхнула яго Вольга Іванаўна).

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Святлана Іванаўна ШАЎЦОВА, дырэктар Нежынскага СДК Любанскага раёна, і госць фестывалю, удзельнік праекта «Свет мёду і здароўя», чэмпіён Камеруна па цяжкай атлетыцы Карл ФАКАМ.

ISSN 1990 - 763X

РАЗЛІК НА СВАБОДНЫ ДОСТУП

Назіральнікі ад АБСЕ спадзяюцца, што змогуць наведваць любыя выбарчыя ўчасткі без папярэдняга апавяшчэння і бесперашкодна трапляць у месцы для падліку галасоў і падвядзення вынікаў.

Місія Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ прыступіла да назірання за парламенцкімі выбарамі ў Беларусі. Узначальвае яе Пасол Герт Хінрых Арэнс. 13 з 15 міжнародных экспертаў ужо прыбылі ў краіну — гэта спецыялісты з Аўстрыі, ЗША, Злучанага Каралеўства, Балгарыі, Літвы, Македоніі, Польшчы, Славакіі і іншых дзяржаў. А з 19 жніўня ў розныя рэгіёны будуць накіраваныя доўгачасовыя назіральнікі. Такім чынам, разам з міжнароднымі экспертамі ў самы бліскі час у Беларусі будзе працаваць 56 прадстаўнікоў місіі АБСЕ з 22 краін-удзельніц. Непасрэдна напярэдадні 28 верасня на Беларусь прыедуць яшчэ 300 кароткачасовых назіральнікаў.

— Назіральнікі будуць уважліва сачыць за перадвыбарнай дзейнасцю, працай выбарчых камісій і адпаведных органаў па правядзенні выбараў, выкананнем выбарчага заканадаўства, умовамі, у якіх будуць працаваць прадстаўнікі прэсы, і вырашэннем спрэчак, звязаных з выбарамі, — ахарактарызаваў задачы назіральнай місіі ад АБСЕ яе кіраўнік.

Парламенцкія выбары праверяць на адпаведнасць прынцыпам дэмакратычных выбарчых працэсаў, а таксама нацыянальнаму заканадаўству.

Герт Хінрых Арэнс досыць пазітыўна выказаўся пра ўсе арганізацыйныя моманты, якія папярэднічалі прыбыццю місіі ў Беларусь:

— У нас ёсць магчымасць своечасовага размяшчэння місіі, таму што мы своечасова атрымалі запрашэнне ўрада Рэспублікі Беларусь. Нам было прадастаўлена права самім вызначаць колькасць назіральнікаў для паўнавартаснай ацэнкі правядзення выбараў. Дагэтуль усе нашы просьбы да ўрада Беларусі былі задаволеныя. Мы атрымлівалі ўсе неабходныя дазвальныя і акрэдытацыйныя дакументы, а таксама поўную інфармацыю па выбарчым працэсе на ўсіх узроўнях.

Кіраўнік місіі выказаў спадзяванне, што работа працягнецца ў такім жа ключы:

— У нас будзе магчымасць сустрэцца з усімі кандыдатамі ў дэпутаты — прадстаўнікамі палітычных партый, грамадзянскай супольнасці, — з кім мы пажадаем. Пакуль у нас няма падстаў лічыць, што нам не дадуць гэта зрабіць. Мы разлічваем таксама, што нам будзе прадастаўленая магчымасць свабодна перамяшчацца па краіне і наведваць любыя ўчасткі без папярэдняга апавяшчэння. Нас запэўнілі ў гэтым. Мы спадзяёмся, што зможам атрымаць доступ да ўсіх без выключэння выбарчых участкаў, пунктаў для галасавання, месцаў падліку галасоў і падвядзення вынікаў. У мінулым у нас былі праблемы з гэтым, спадзяёмся, што на гэты раз іх не будзе.

Для забеспячэння празрыстасці выбараў кіраўнік назіральнай місіі прапанаваў міністру замежных спраў Беларусі Сяргею Мартынаву і старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай правадзіць сустрэчы штотыдзень. Абое выказалі гатоўнасць да гэтага. Місіі ад АБСЕ і СНД, паводле слоў спадара Арэнса, падтрымліваюць сяброўскія адносіны. Каментуючы той факт, што Беларусь заявіла аб сваім далучэнні да Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў у дзяржавах — удзельніцах СНД, кіраўнік назіральнай місіі падкрэсліў:

— Для нас прыярытэтнымі з'яўляюцца прынцыпы АБСЕ. Аднак мы заўсёды казалі, што набор правілаў, якія адносяцца да справядлівых і адкрытых выбараў, можа аблюстроўвацца ў любых іншых дакументах. Што датычыць Канвенцыі, гэта важны дакумент, і мы будзем падтрымліваць нашы кантакты з місіяй па назіранні за выбарамі ад СНД. Гэтыя сустрэчы прывядуць да абмену меркаваннямі, зразумела. Аднак сваю ацэнку мы будзем базіраваць на тых параметрах, якія былі ўзгодненыя ўсімі краінамі — удзельніцамі АБСЕ.

Да самога дня выбараў назіральная місія падрыхтуе дзве справаздачы, плануецца таксама папярэдняя заява адразу пасля выбараў і выніковая справаздача, якая будзе апублікаваная прыкладна праз восем тыдняў пасля правядзення выбараў. Пакуль жа спадар Арэнс выказаў спадзяванне, што выбары ў Беларусі пройдуць свабодна і дэмакратычна — у адпаведнасці з заявамі ўладаў. Яны ў сваю чаргу падыходзяць да працэсу ацэнкі адкрыта і справядліва.

Ала МАЧАЛАВА.

Кожны дзесяты — ляўша

13 жніўня ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень ляўшы

Яго прыдумалі ў Брытаніі па ініцыятыве брытанскага клуба ляўшэй ў 1992 годзе, і ён адразу стаў папулярным у Заходняй Еўропе. Сучасны свет створаны для людзей, якія ўсё робяць правай рукой. Пісьмовыя і кухонныя прылады, камп'ютарныя мышы і шмат іншага прыстасаванае для праворукіх. У Савецкім Саюзе леварукасць лічылі хваробай, дзяцей гвалтам перавучвалі. На шчасце, зараз школьнікаў ужо не прымушаюць пісаць правай, хаця і ў нашы час сустракаюцца бацькі, выхавальнікі і настаўнікі, якія імкнуцца перавучыць «няправільнае дзіця».

Чаму чалавецтва падзяляецца на праўшэй і ляўшэй, навука дагэтуль дакладна не ведае. Адны вучоныя кажуць аб спадчынным фактары, іншыя — аб паталогіі развіцця. Паводле статыстыкі, сёння ў свеце 600 мільёнаў чалавек аддаюць перавагу левай руцэ. Гэта практычна кожны дзесяты жыхар планеты.

У гэты дзень ляўшы ўсяго свету імкнуцца прыцягнуць увагу вытворцаў тавараў да неабходнасці ўлічваць і іх камфорт. Аднак галоўная заклапочанасць Клуба ляўшэй Брытаніі — тое, што ў многіх школах краіны дзяцей па-ранейшаму імкнуцца перавучыць да пісьма правай рукой, што выклікае псіхалагічныя стрэсы і зніжае паспяховасць.

У нас да ляўшэй раней адносіліся падазрона. Ім нават забаранялі даваць паказанні ў судзе. Лічылася, што сам дзябал быў ляўшой. Псіхолагі кажуць, што гэтыя людзі валодаюць моцным характарам і магутным творчым патэнцыялам. Спіс знакамітых людзей, якія ўсё рабілі левай рукой, уражвае: Марк Твен, Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Бетховен, Сяргей Рахманінаў, Пол Макартні і Рынга Стар, Мэрылін Манро, Роберт дэ Ніра. Леварукімі былі Юлій Цэзар і Аляксандр Македонскі, Напалеон і Карл Вялікі, Уінстан Чэрчыль і Жанна Д'Арк, а таксама тры апошнія прэзідэнты ЗША — Рональд Рэйган, Джорж Буш-старэйшы і Біл Клінтан. Некаторыя вучоныя лічаць, што і прэм'-ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін з'яўляецца схаваным ляўшой.

Беларуская дзяржаўная філармонія рыхтуе для меламанаў незвычайны падарунак. 4 верасня тут упершыню выступіць фольк-джаз-мадэрн калектыў «M-SIDE TRIO». Гэты ўнікальны гурт нарадзіўся два гады таму. У яго ўваходзяць Міхаіл Лявончык (венгерскія і беларускія цымбалы), Аляксандр Лявончык (фартэпіяна) і Мануэль да Коль (ударныя).

Як расказаў карэспандэнту агенцтва мастацкі кіраўнік трыа Міхаіл Лявончык, у першым аддзяленні канцэрта калектыў выканае славянскія народныя песні ў джазавай апрацоўцы, а таксама ўласныя кампазіцыі. У другім аддзяленні прагучаць песні народаў свету — таксама ў джазавай інтэрпрэтацыі.

Міхаіл і Аляксандр Лявончыкі скончылі Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі і цяпер вучацца ў кансерваторыі імя Рыхарда Штраўса ў Мюнхене. Калектыў «M-SIDE TRIO» неаднаразова выступаў у Германіі, але на сцэне Белдзяржфілармоніі з'явіцца ўпершыню. Унікальнасць яго не толькі ў спалучэнні народных песень з джазавымі матывамі.

«Мінск—Навіны».

Спецыяльны карэспандэнт перадае з Пекіна

КІТАЙЦЫ НЕ ТОЛЬКІ НА КАНІ, АЛЕ І НА БРОНЕТРАНСПАРЦЁРЫ

Учарашні дзень на алімпіядзе для шматлікіх журналістаў, якія накіраваліся зранку ў медыя прэс-цэнтр (MPC), пачаўся з вялікай нечаканасці: прама каля высачэзнага будынка, што больш чым на два тыдні стаў для рэпарцёраў з усяго свету родным домам, стаяў сапраўдны бронетранспарцёр. Расфарбоўка — колер пустыні з нацыянальнай кітайскай сімволікай. Дзіўна, але каля машыны нікога з ваенных не было, таму баявая тэхніка імгненна стала аб'ектам павышанай ўвагі, пачалася сапраўдная відэа- і фотасесіі.

Журналісты паспелі пракінуцца словамі, што арганізатары алімпіяды на ўсялякі выпадак паказалі: бяспека «папарацы» на самым высокім узроўні. Можна не сумнявацца, што так яно і ёсць. Хоць Пекін — аграмадны мегаполіс з 16 мільёнамі чалавек, дзе ёсць і небяспечныя раёны для прагулкі ў адзіночку ці ў цёмны час сутак. На кітайскім тэлебачанні цэлых 40 каналаў адведзена пад трансляцыі, у тым ліку і прамыя з алімпійскіх арэн. Ды і на вуліцах, абвешаных сцягамі з сімволікай, усе кітайцы ходзяць ці стаяць толькі з усмешкамі на твары. Прычым не скажаш, што яны дзяжурныя. Учора, напрыклад, арганізатары алімпіяды ў межах галоўнай спартыўнай арэны — стадыёна «Пташынае гняздо» — арганізавалі фестываль талісманаў алімпійскіх гульняў. Усяго іх пяць, і калі ўсе склаці на кітайскім алфавіце, то атрымаецца «Запрашаем». І ўсё гэтае шоў праходзіла на фоне неафіцыйнага алімпійскага слогана «Адзін свет — адна каманда».

Адной камандай былі і застаюцца беларусы, нягледзячы на тое, што кожны дзень выступаюць на розных спартыўных арэнах. У алімпійскай вёсцы ў галоўным офісе дэлегацыі — эпіцэнтр каманднага духу. Свабодныя ад «палётаў» атлеты абсалютна розных дысцыплін актыўна хварэюць «па тэлевізары» за сваіх землякоў. У штабе каманды вісіць віншавальная тэлеграма Настассі Новікавай ад губернатара Мінскай вобласці Леаніда Крупца. Тут жа размешчана пасланне «Беларусбанка» Наталлі Цылінскай. Дарэчы, бронзавы прызёр прыбыла ў Пекін толькі ўчора, на суткі раней, чым плануецца. На жаль, учарашні дзень, як і папярэдні, аказаўся безмедальным. Хоць пачынаўся ён вельмі аптымістычна. Нашы стралкі Канстанцін Лукашык і Юрый Далгаполаў у стральбе з пісталета на 50 м засталіся за крок ад фінальнай пулькі, заняўшы адпаведна 12-е і 11-е месцы. Але самымі вераломнымі былі чаканні ў зале фехтавання, дзе выступалі тры нашыя шаблісты — Дзмітрый Лапкес, Валерый Прыёмка і Аляксандр Буйкевіч. Старт для першых двух рыцараў закончыўся няўдала, а вось наваспечаны чэмпіён Еўропы сустрэўся ў 1/4 фіналу з алімпійскім чэмпіёнам румынам Міхалам Кавалію, які ў першым паядынку выйграў у Прыёмкі (15:9). Барацьба паміж двума чэмпіёнамі атрымалася надзвычай упартай і дасягнула свайго апагею пры ліку 13:13. Потым лёс і судзейскі корпус адвярнуліся ад беларуса... Кіраўнік беларускай федэрацыі фехтавання алімпійскі чэмпіён Аляксандр Раманькоў быў абураны судзейскім «бязмежжам», выказаўшыся, што беларуса проста «сплавілі» з пяўфіналу, як рэальнага прэтэндэнта на медаль. Не звяціў ён Кацярыне Мулюк, якая ў стральбе з лука напачатку ў 1/32 фіналу выйграла ў спартсменкі з Калумбіі (104—101), а на наступным этапе турніру ўжо адно вачко ўступіла кітаянцы Чэн Лінг (105—106). Пэўныя надзеі на станоўчы вынік складаліся на дзюдаіста Сяргея Шундзікава (81 кг). Аднак беларус уступіў паляку Роберту Краўчуку. Дарэчы, для палякаў гэтая перамога як бальзам на душу, бо нашы ўсходнія суседзі пакуль не маюць ніводнай узнагароды. Не прайшоў 1/8 фіналу і наш барэц грэка-рымскага стылю Юрый Дубінін: на яго шляху стаў карэец.

Ну і зусім крыўдным можна лічыць паражэнне баксёра Хаважы Хацыгава (54 кг) свайму апаненту з Малдовы. Лік сустрэчы па вачках 1:1, але арбітры палічылі, што больш актыўным быў сапернік беларуса.

У вячэрняй праграме ўчарашняга дня — парная гульня нашых тэнісістак Вольгі Гаварцовай і Дар'і Куставай супраць эстонскага тандэма. У адзіночным разрадзе выступала Вікторыя Азаранка і выйграла ў аўстралійкі Касей 2:0 (6:2, 6:2).

Надзвычай насычаным будзе і багатым на ўражанні павінен стаць сённяшні дзень. З раніцы нашы баскетбалісткі згуляюць з расіянкамі. У велагонцы з раздзельным стартам выступіць Васіль Кірыенка. У другой палове дня паспабуе пекінскага шчасця на цяжкаатлетычным памосце сярэбраны прызёр Афін Ганна Бацюшка. Зрэшты, яе калега па цэху Сяргей Махвяня, які пасля выступлення трапіў у шпіталь, атрымаў дыягназ — надрыў праводных мышцаў левага сцягна. З размовы з галоўным трэнерам Аляксандрам Ганчаровым удалося даведацца, што такая траўма — тыповая для цяжкай атлетыкі. Непакоіла яна Махвяню яшчэ ў Мінску. Праўда, пасакрэтнічаў Аляксандр Васільевіч, цяжкаатлета добра падлячылі і падстаў хвалявацца за яго здароўе не было. Але ж выйшла ўсё наадварот...

У астатнім, паводле слоў кіраўніка медыцынскай групы Яўгена Ласіцкага, усе жывыя-здаровыя. Праўда, пацярпелым мог быць Яўген Анатольевіч, якога каля беларускага пасольства ў Пекіне ледзь не пакусаў сабака. На шчасце, «бобік» аказаўся не нічыйным і яго хутка забрала гаспадыня — яна вырашыла прагуляць свайго чатырохногага сябра без павадка. Як вядома, у Пекіне «сабачая» тэма была вельмі актуальнай напярэдадні Алімпійскіх гульняў. У рэстаранах было забаронена падаваць мяса з сабак, а з кітайскай сталіцы выдалілі за 101-ы кіламетр усіх нічыйных жывёлін...

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Настасся НОВІКАВА, бронзавы прызёр XXIX Алімпійскіх гульняў у Пекіне:

«Адчуваю, што сваю галоўную штангу я яшчэ не падняла»

Бронзавы поспех беларускай штангісткі Настассі Новікавай на алімпійскіх Гульнях у Пекіне, без сумненняў, варты самай высокай узнагароды. І не толькі таму, што спартсменка з Жодзіна ўступіла серабро з-за сімвалічнай вагі ў 150 грамаў. У значнай ступені наваспечанай медалістцы было намнога цяжэй пракладваць шлях да зорак усёй беларускай камандзе, якая, будзем спадзявацца, у самы бліжэйшы час працягне медальны пачын.

— Насця, ты ўжо паспела асэнсаваць зробленае, адчуць важкасць алімпійскай узнагароды?

— Шчыра кажучы, не зусім. Я яшчэ пад уражаннямі ад спаборніцтваў...

— Перад апошняй спробай адчувала, што ідзеш на медаль?

— Калі я выходжу на памост, то ўсе мае думкі пра тое, як падняць штангу. Вядома, сітуацыю старалася трымаць пад кантролем.

— На п'едэстале ты плакала. Трэба мераваць, што гэта слёзы радасці і шчасця?

— Хутчэй за ўсё, крыўдна за тое, што серабро збегла, лічыце, з-пад носа.

— Пэўна, што свой адбітак наклала сітуацыя, калі суддзямі не была залічана першая спроба. Дарэчы, што здарылася?

— Нічога, проста не выжала штангу да канца, быццам бы рукі перасталі слухацца. Прыйшлося сабраць волю ў кулак і зрабіць тое, на чым настройвалі трэнеры.

— Нам падалося, што ты магла штурхнуць значна больш за 118 кг, чым забяспечыла б сабе як мінімум 2-е месца. Так?

— Я прапанавала трэнерам такі варыянт, але ж ён быў адхілены. Ні ў якім разе не хачу зараз «калі б ды што б». Трэнерам лепш ведаць, тым больш што і вынік ёсць, хоць і бронзавы. Але быў дасягнуты.

— Хто цябе павіншаваў самы першы?

— Мой першы настаўнік Віктар Шылай і мама Раіса Сяргееўна. Бацькі мае зараз жывуць у Жодзіне і вельмі перажывалі за мяне.

— Як збіраешся адзначыць свой поспех?

— Як звычайна — шампанскім, бо заўсёды аддаю перавагу гэтаму шыпучаму напітку. Праўда, у алімпійскай вёсцы яго няма, таму збіраемся з гэтай мэтай наведаць горад разам з Віталем Дзербянёвым.

— Ты адчуваеш у сабе сілы замацаваць бронзавы поспех серабром ці золатам на алімпіядзе ў Лондане?

— Жаданне такое ў мяне ёсць, магчымасці, буду спадзявацца, таксама будуць. Я адчуваю, што сваю галоўную штангу я яшчэ не падняла.

Абзац

■ У Беларусі з 12 жніўня адпускныя цэны на спірт этылавы харчовы павышаны на 6 працэнтаў, а рознічныя цэны на гарэлку — на 4 працэнты. Нарыклад, рознічная цана на гарэлку «Крышталь Класічная», «Кляновая», «Белая Русь сярэбраная» складзе Br6 тыс. 420 за бутэльку ёмістасцю 0,5 л без кошту посуду.

■ Гандлёвая надбаўка на імпартнае піва не павінна перавышаць 30 працэнтаў. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Міністэрства эканомікі Беларусі № 156. Дакумент уступіў у сілу 9 жніўня гэтага года. Раней абмежаванне ўзроўню гандлёвай надбаўкі дзейнічала ў адносінах да беларускага піва і складала таксама 30 працэнтаў.

■ Магчымасць увядзення экспартнай пошліны на калійныя ўгнаенні разглядаецца ў Беларусі. Аб гэтым паведаміў намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і кіраванні РУП ВА «Беларуськалій» Фёдар Бараноўскі. «Наша прадпрыемства з'яўляецца высокарэнтабельным, і мы гатовы падзяліцца з дзяржавай свайго звышпрыбыткамі», — адзначыў намеснік генеральнага дырэктара, дадаўшы, што адпаведная практыка існуе і ў іншых краінах.

■ Самы стары чалавек планеты, селянін Серана Арэнкас, жыве на поўначы Калумбіі. Паводле пацвержданых дакументаў, яму 127 гадоў. Калумбійскі доўгажыхар нарадзіўся 5 сакавіка 1881 года, і, такім чынам, ён на 15 гадоў старэйшы за японца Танохі Танабэ, які афіцыйна занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса як самы пажылы чалавек у свеце. Прычыны свайго даўгалецця Серана Арэнкас тлумачыць проста: «Трэба верыць у Бога і не думаць аб дрэнным». У доўгажыхара Калумбіі 24 дзіцяці, самы малодшы сын з'явіўся на свет, калі бацьку было 70 гадоў.

■ Былы прэзідэнт Украіны адзначыў свой 70-ы дзень нараджэння пад Ялтай, у пансіянаце «Айвазоўскі». Павіншаваць Леаніда Данілавіча з'ехаліся больш за 400 гасцей, якіх пасялілі ў гатэлі «Арэанда». Усю арганізацыю вечарынкі ўзяў на сябе зяць Кучмы — бізнэсмен Віктар Пінчук. Па чутках, застолле абышлося ў 10 мільёнаў долараў, прычым палова пайшла на ганарар Элтану Джону, які спяваў на свяце.

Поўны абзац

■ Незвычайная залатая рыбка Осі, якая плавае ўніз галавой, пераўтварыла паб свайго гаспадара ў мясцовую славутасць. Рыбка выпадкова перавярнулася на спіну 4 гады таму і з тых часоў толькі так і плавае, пры гэтым адчувае сябе ну проста як рыба ў вадзе.



Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

Номер лота	1	2	3
Наименование объекта	Право аренды земельного участка	Земельный участок	Земельный участок
Местонахождение объекта	ул. Брестская	ул. Багратиона, 31	ул. Виленская, 46
Площадь земельного участка, га	0,3217	0,0625	0,15
Кадастровый номер	425450100001006761	425450100001006753	425450100001006765
Начальная цена продажи (тыс. руб.)	12000,0	1000,0	3000,0
Сумма задатка, (тыс. руб.)	1200	100,0	300,0
Форма проводимого аукциона	Аукцион с условиями		
Условия продажи объекта	Строительство производственной базы	Строительство и обслуживание жилого дома в течение 3 лет с момента принятия решения райисполкома о передаче участка в частную собственность	
Срок аренды участка	51 год	Продажа в собственность	

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/счет 3602525000011, филиал № 422 АСБ «Беларусбанк», код банка 852, УНП 500009502, раздел 04002, очередь 13, получатель платежа – Слонимский райфо.

Гражданин — копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования (паспорт);

Индивидуальный предприниматель — копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность;

Юридическое лицо — представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

Юридическое лицо — нерезидент Республики Беларусь — представителю или уполномоченному должностному лицу иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

Представитель иностранного гражданина — легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещает победитель — покупатель объекта.

Аукционные торги состоятся при наличии не менее двух участников по выставленным лотам.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

Аукцион состоится 16 сентября 2008 года в 15.00 по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 40, каб. 619.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 40, каб. 621
в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Заявления принимаются**
по 12 сентября 2008 года до 17.30 включительно.
Телефоны для справок в Слониме: 8 01562 24611, 21534, 21641.
Адрес сайта: http://slonim.grodno-region.by

Слонимский районный исполнительный комитет

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже права аренды земельных участков

	Номер лота	1	2	3
1	Наименование объекта	Право аренды земельного участка	Право аренды земельного участка	Право аренды земельного участка
2	Местонахождение объекта	ул. Советская позиция по генплану № 11, квартал 14	ул. Мицкевича	д. Жировичи
3	Площадь земельного участка, га	0,0171	0,1992	0,5891
4	Кадастровый номер	425450100001006735	425450100001006733	425481703102000468
5	Начальная цена продажи (тыс. руб.)	2500	13000	2000
6	Сумма задатка (тыс. руб.)	250	1300	200

Задаток за участие в аукционе вносится на р/счет 3602525000011, филиал № 422 АСБ «Беларусбанк», код банка 852, УНП 500009502, раздел 04002, очередь 13, получатель платежа – Слонимский районный бюджет.

Порядок проведения аукциона оговорен Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 № 462.

Подробное сообщение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» за 18.06.2008 года № 132 (26245) и в газете «Слонімскі веснік» за 21.06.2008 г. № 70.

Аукцион состоится **22 августа 2008 года в 15.00** по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 40, каб. 619.

Заявления на участие в аукционе принимаются **по 21 августа до 17.30** по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 40, каб. 621. Адрес сайта: *http://slonim.grodno-region.by.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» проводит 8-й открытый аукцион по продаже объектов республиканской собственности 25 сентября 2008 г.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта, (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	Грузовой Урал-4320-01 ш. 022503 дв. 577225	г. Барановичи в/ч 65263	1984	99 888	6 000 000	600 000
2.	Грузовой Краз-255Б ш. 397643 дв. 2864	г. Бобруйск в/ч 20392	1980	97 290	10 000 000	1 000 000
3.	Грузовой Краз-255Б ш. 627798 дв. 8831720	г. Бобруйск в/ч 20392	1988	94 121	6 500 000	650 000

8-й аукцион состоится в 11.00 **25 сентября 2008 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в **17.00 23 сентября 2008 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 25 сентября 2008 года.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

РУП «Белспецконтракт» информирует о внесении изменений в ранее опубликованное извещение о проведении 8-го открытого аукциона 20 августа 2008 г. в газете «Звязда» № 132 от 18.07.2008 г., в котором лоты с № 1 по № 10 будут соответствовать лотам с № 4 по № 13 на 7-м открытом аукционе 20 августа 2008 г. без изменения наименования объектов и с условиями проведения 7-го открытого аукциона.

Справки по тел.: (017)тел./факс 224 88 05. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com

УНП 101099370

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УЗБРОЕНЫ КАНФЛІКТ НА ПАЎНОЧНЫМ КАЎКАЗЕ

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі непрызнаных рэспублік Абхазія і Паўднёвая Асеція практычна спыненыя. Аднак інфармацыйная вайна на глебе канфлікту — куды больш агрэсіўная і магутная — ахапіла дзесяткі краін, блокаў, альянсаў і міжнародных арганізацый. Інфармацыя падаецца рознымі СМІ ў залежнасці ад іх прыналежнасці. Каб пазбегнуць падазрэнняў у заангажаванасці, мы вырашылі даць інфармацыйны зрэз найбольш значных падзей у выглядзе хронікі паведамленняў па меры іх паступлення.

АМЕРЫКАНЦАЎ ЗДЗІВІЛА ХУТКАСЦЬ УВОДУ ВОЙСКАЎ РФ У ПАЎДНЁВУЮ АСЕЦІЮ

Амерыканскае ваеннае камандаванне здзіўлена зладжанасцю і імклівасцю перакідвання расійскіх войскаў у Паўднёвую Асецію днём 8 жніўня. Аб гэтым паведамляе AFP са спасылкай на прадстаўніка амерыканскага камандавання, які выказаўся на ўмовах ананімнасці. Як падкрэсліла крыніца агенцтва, нягледзячы на тое, што РФ раней скансентравала на Паўночным Каўказе войскі для правядзення вучэнняў, відавочнага нарошчвання сілаў непасрэдна побач з мяжой для ўварвання не адбывалася. Прадстаўнік амерыканскага ваеннага кіраўніцтва адзначыў, што аперацыя па перакідванні войскаў была праведзеная хутка, але пры гэтым «было не падобна, што яны нарошчваюць сілы на мяжы і чакаюць».

ЗША, паводле інфармацыі крыніцы AFP, не чакалі распачынання Расіяй поўнамаштабнай ваеннай аперацыі ў зоне канфлікту. Камандаванне ЗША таксама не разумее, чаму Грузія, пачаўшы аперацыю ў Паўднёвай Асеціі, не падрыхтавалася загадзя да магчымага расійскага адказу. Паводле слоў крыніцы AFP, РФ увяла ў Паўднёвую Асецію ад васьмі да дзесяці тысяч вайскоўцаў.

09:24 БАРАК АБАМА АСУДЗІЎ «РАСІЙСКУЮ АГРЭСІЮ»

Кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Дэмакратычнай партыі Барак Абама ў сваёй заяве асудзіў дзеянні расійскіх войскаў у Паўднёвай Асеціі, паведамляецца на сайце CNN.

«Усё роўна, як пачаўся гэты канфлікт, але Расія вывела яго за рамкі сітуацыі вакол Паўднёвай Асеціі і ўварвалася на тэрыторыю іншай дзяржавы», — заявіў сенатар ад штата Ілінойс. Кандыдат дадаў, што дзеянням Расіі няма апраўдання.

10:24 РАСІЙСКІ ВАЕННЫ САМАЛЁТ БАМБІЎ ГОРЫ

Па дадзеных Reuters, расійскі ваенны самалёт бамбіў грузінскі горад Горы ў аўторак. Напярэдадні звесткі аб тым, што расійскія войскі ўвайшлі ў горад, былі аспрэчаныя. Карэспандэнт агенцтва паведаміў з горада: расійскія ВПС разбамбілі артылерыйскія пазіцыі Грузіі ў гарах паблізу Горы, затым бомбы сталі падаць на вуліцы пустэльнага горада. У выніку пацярпелі некалькі мірных жыхароў.



11:05 ГРУЗІЯ НЕ МОЖА КААРДЫНАВАЦЬ ДЗЕЯННІ СВАІХ ВАЕННЫХ

Удары расійскіх войскаў па радарах і ваенных комплексах сувязі да такой ступені разбурылі сістэму грузінскага камандавання і кіравання, што ў Тбілісі, магчыма, ужо не маюць выразнай карціны таго, што адбываецца ў зоне канфлікту, паведамляе тэлекампанія CNN са спасылкай на неназванага афіцыйнага прадстаўніка Пентагона. Амерыканскія ваенныя прадстаўнікі раней паведамілі CNN, што, паводле іх ацэнкі, Расія ажыццявіла свае ключавыя ваенныя мэты ў Грузіі і грузінскі бок пазбавіўся большай часткі сістэм ППА і магчымасці ажыццяўляць каардынацыю ваенных аперацый.

11:36 У КАДОРСКАЙ ЦЯСНІНЕ ЎЗНЯТЫ СЦЯГ АБХАЗІІ

У адміністрацыйным цэнтры верхняй часткі Кадорскай цясніны сяле Ажара падняты абхазскі сцяг. Аб гэтым паведаміў «Інтэрфакс». Як перадае карэспандэнт агенцтва, раней у раёне Ажары былі чутны інтэнсіўныя перастрэлкі са стралковай зброі, баявыя верталёты абхазскай арміі наносілі ўдары па групоўцы грузінскіх войскаў, блакаванай у гэтым раёне. Ажара, якое служыла апорным пунктам для грузінскіх ваенных падраздзяленняў, падверглася ўдарам штурмавой авіяцыі Абхазіі, пасля чаго там высадзіўся дэсант. Групоўка грузінскіх войскаў была акружаная і разбітая.

11:52 ЗША ЗАБЛАКАВАЛІ ПРАВЯДЗЕННЕ ПАЗАЧАРГОВАГА ПАСЯДЖЭННЯ САВЕТА РАСІЯ—НАТА

Дэлегацыя ЗША заблакавала правядзенне пазачарговага пасяджэння рады Расея—НАТА, якое павінна было адбыцца ў аўторак у Брусэлі. «Гэта было зроблена пад выглядам адсутнасці кансэнсусу паміж дэлегацыямі НАТА быццам бы адносна правілаў працэдуры», — паведаміў «Інтэрфаксу» пастаянны прадстаўнік Расіі пры НАТА Дзмітрый Рагозін. Ён звярнуў увагу на тое, што пры гэтым паслы НАТА мелі намер сустрэцца ў Брусэлі з кіраўніком МЗС Грузіі. «Гэта сведчыць аб тым, што, мабыць, амерыканцам не хочацца ў прысутнасці сваіх калег па альянсе выслухоўваць складаныя пытанні расійска-грузінскага прадстаўніка аб уцягнутасці ЗША ў развіццё трагічных падзей вакол Паўднёвай Асеціі», — сказаў Рагозін.

12:14 ПРЭЗІДЭНТ РАСІІ ЗАЯВІЎ, ШТО «ПРЫНЯЎ РАШЭННЕ АБ ЗАВЯРШЭННІ АПЕРАЦЫІ ПА ПРЫМУСЕ ГРУЗІІ ДА МІРУ»

«Я прыняў рашэ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 жніўня 2008 г. № 30 (133)

НЕФАРМАТ

ГАРЭЛА СЕНА...

Не, размова пойдзе не пра надзвычайнае здарэнне ў якой-небудзь гаспадарцы або на прыватным падворку, а пра тое сена, якое вяскоўцы паляць па сваёй волі. Бо засталіся яны без кароў, а траву, якую хочаш не хочаш — мусіш выкошваць вакол хат, няма куды падзець. Вось і палаюць перыядычна вогнішчы, і з дымам ідзе ў нябыт добры корм. Такое вогнішча не толькі назіраць, але і разводзіць давялося аўтару гэтых радкоў падчас адпачынку ў роднай вёсцы.

Нічога дзіўнага. Калі раней на нашай вуліцы трымалі прыкладна дванаццаць кароў, то зараз засталіся дзве. А жыхары вуліцы — спрэс пенсіянеры — успамінаюць, як раней цяжка было здабываць кармы для жывёлы. Выкошвалі кожны лапік на ўзлесках, каля рэк, на няўдобіцах. Суседка бабуля Маня, якой давялося дапамагаць паліць сена, успамінала тыя часы. Некалі яе гаспадар-нябожчык нават паспрачаўся з суседам за лапік іржышча. Цяпер маладыя вяскоўцы нават не зразумелі б, з-за чаго мог адбыцца канфлікт. А гадоў трыццаць-сорак таму пасля скошвання камбайнам збажыны дзялілі на кавалкі пажніўныя рэшткі. І гэту салому з пустазеллем figure самай зямлі людзі касілі, сушылі — нарыхтоўвалі корм. Дык вось, нават да такога надзелу чалавек быў прагны, і сусед мог прыхапіць у суседа паўметра. Яшчэ існаваў спосаб папоўніць кармавую базу асабістай гаспадаркі — прывеціць, пачаставаць брыгадзіра, каб потым пры дзяльбе адмералі ну хоць паўкроку лішняга.

Успамінаецца, як гераіня аднаго з нядаўніх матэрыялаў, жыхарка вёскі Какорыца, гаварыла, што на ўсё жыццё засталося адчуванне цяжкасці здабытку сена. Бо вывозілі яго з балота па вадзе на лодках. А ў згаданай гаспадыні муж-інвалід. Усё самой трэба было цягнуць, вось і ўелася жанчыне ў косці тая перавозка. Для жыхароў балоцістых мясцінаў такая праца была звычайнай. Цяпер балота перасталі выкошваць, і яно задыхаецца ад хмызнякоў. Эколагі б'юць трывогу. І нічога тут не зробіш — кароў у вёсках становіцца менш.

Па-першае, у сельскай мясцовасці змяншаецца колькасць насельніцтва, а па-другое, мяняецца псіхалогія вяскоўца. Многія з маладых хочуць мець добраўпарадкаванае жыллё і жыць на гарадскі манер, не абцяжарваць сябе вялікімі клопатамі па ўласнай гаспадарцы. Не кажу пра тых, якія наогул працаваць не хочуць або жывуць ад зарплаты да зарплаты, большая часта якой прапіваецца. Гэта іншая праблема. Я пра другое.

Узровень жыцця ў параўнанні з тым, які быў два-тры дзесяцігоддзі назад, значна ўзрос, натуральна, што мяняюцца жыццёвыя прыярытэты і патрабаванні людзей. Мець карову азначае быць прывязаным да сваёй гаспадаркі круглы год. Такім гаспадарам не даводзіцца марыць аб адпачынку, скажам, на моры. А гэта сёння ўжо не ўсіх задавальняе. Як падзяліўся аднойчы назіраннямі фотакарэспандэнт Кобрынскай райгазеты Анатоль Шугай: «Зараз ёсць даяркі, нібы фотамадэлі. Раней, калі здымаў клубы трох-чатырохтысячніц, у раён прыязджалі сціпла апранутыя вясковага выгляду жанчынкі. Цяпер на нарады збіраюцца дзяўчаты, якіх і не адрозніш ад гарадскіх». Час мяняецца, у аграгарадках ствараюцца спарткомплексы, умовы для навучання і рознабаковага выхавання дзяцей. І гэта добра. Але апошнім часам дзяржава арыентуе вяскоўцаў не памяншаць, а павялічваць пагалоўе асабістага статка. Толькі ажыццявіць на практыцы такое складана. Сілай нікога ж не прымусіш карову трымаць. Днямі кіраўнік сельгаспрадпрыемства ў Камянецкім раёне расказваў, што вытворчыя паказчыкі і зарплата ў прыгараднай гаспадарцы растуць, кармані ААТ сваіх работнікаў забяспечвае, а колькасць кароў з кожным годам памяншаецца, у крайнім выпадку некаторыя сем'і заводзяць казу. А знаёмая старшыня сельскага Савета скардзілася, што ўвесь час трэба кантраляваць працу магазінаў, каб яны завозілі дастаткова малака і кефіру, а то, здараецца, не хапае, людзі нараканоць...

Святлана ЯСКЕВІЧ.

У МАГІЛЁЎ, НА «ВОДЫ»...

Народ спрадвеку з шанаваннем ставіўся да крыніц. Апошнім часам многія крынічкі адраджаюцца, добраўпарадкуюцца, іх асвячае царква, праводзяцца даследаванні эколагамі і навукоўцамі. І людзі з задавальненнем бяруць ваду з такіх крыніц. Бо чыстая вада — адна з найгалоўнейшых крыніц здароўя.

Але найчысцейшая прыродная вада з асвечаных вадаёмаў даступная галоўным чынам для тых з гараджан, хто мае асабісты транспарт і магчымасць рэгулярна выязджаць за горад. А пенсіянеры, сталыя людзі, прыхаджане Свята-Мікалаеўскай царквы ў Брэсце даўно выказвалі пажаданні, каб чыстую вадзіцу можна было піць у самім горадзе. І вось у дзень прарока Іллі адбылася цырымонія асвячэння вады, якая цяпер паступае ў спецыяльныя калонкі і бюветы акурат насупраць храма па вуліцы Міцкевіча.

Узвядзенне аб'екта пад купалам у стылі паўднёвых гарадоў XIX стагоддзя, куды ездзіў нябедны люд «на воды», правяло прадпрыемства «Водаканал». Яго дырэктар Міхаіл Сац расказаў, што вада праходзіць глыбокую ачыстку азонам. У адрозненне ад хлору, гэта рэчыва абеззаражвае ваду і імгненна выпараецца. Вада з новай крыніцы прайшла праверкі і атрымала самыя высокія ацэнкі спецыялістаў па якасці.

Таму і гараджане актыўна бяруць чыстую ваду. З бюветаў можна напіцца ў спёку, а з калонкі набраць вады ў бутэльку ці іншую ёмістасць. У скверы па вуліцы Міцкевіча, дзе з'явілася новае збудаванне, заўсёды адпачывае шмат народу, тут любяць гуляць з каляскамі мамы. Пенсіянерка Ніна Паўлаўна напаўняла з калонкі 5-літровую бутэльку. Сказала, што жыве побач і цяпер не толькі для чаю, але і для гатавання бярэ ваду толькі адсюль.

Абышлося, вядома, у капеечку гораду новае збудаванне, але добрая справа для людзей зроблена.

Яна СВЕТАВА.

РАЗМЕРКАВАЛІ ГРОШЫ І НАЗВАЛІ ВУЛІЦЫ

Пазачарговая сесія Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў удакладніла бюджэт абласнога цэнтра на сёлета. А ўсё таму, што ў бюджэт паступіла на 32 мільярды рублёў болей за запланаванае. Зусім не лішнія даходы размеркаваны для розных галін.

Больш за палову сумы вырашана накіраваць у жыллёва-камунальную сферу і будаўніцтва. Сродкі спатрэбяцца на добраўпарадкаванне, рамонт гарадскіх вуліц, капітальны рамонт жылога фонду і асноўных будаўнічых аб'ектаў горада — рэканструкцыю завода ўтылізацыі бытавых адходаў і стадыёна «Спартак», будаўніцтва падземнага перахода ў цэнтры Магілёва.

Дадатковыя грошы атрымаюць гарадскія транспартныя арганізацыі на набыццё новых машын і адукацыйныя ўстановы на падрыхтоўку да новага навучальнага года.

Дэпутаты гарсавета ўзгаднілі **продаж на аўкцыёне** шэрагу аб'ектаў камунальнай уласнасці Магілёва. Сярод іх — будынкі былога ваеннага гарадка. Некаторыя пранаваныя на продаж аб'екты маюць гісторыка-культурную каштоўнасць, таму будучыя ўладальнікі падпішуць ахоўныя абавязацельствы. Усе будынкі, якія будуць прададзены, трэба ўвесці ў эксплуатацыю на працягу 3 гадоў.

Больш сціслыя тэрміны па рэканструкцыі — 2008—2009 гады — будуць пастаўлены перад уладальнікамі будынка ў цэнтры Магілёва, які вядомы гараджанам як Дом быту. Гэты ўзор савецкай забудовы, паводле планаў архітэктараў, павінен стаць часткай новага сучаснага адміністрацыйна-гандлёвага цэнтра.

Планы гарадскіх уладаў выклікалі хваляванне сярод дзесяткаў прадпрымальнікаў, якія цяпер арандуюць у Доме быту 2,5 тысячы квадратных метраў плошчы. Паводле рашэння гарадскога Савета, прадпрымальнікі атрымаюць права альбо арэнды гандлёвых плошчаў пасля рэканструкцыі на 3 гады па дзяржаўных расцэнках, альбо долевага ўдзелу ў інвестыцыях з узнікненнем часткі ў праве ўласнасці, эквівалентнай арэндзе цяперашняй плошчы.

Сесія зацвердзіла **назвы навастворaных вуліц і завулкаў**. Цяпер у Магілёве з'явіліся чатыры, паводле нумароў, завулкі імя знакамітага мастака Вітольда Бялыніцкага-Бірулі і ў гэтым жа раёне — вуліца імя іншага вядомага магілёўскага мастака Паўла Масленнікава. Яшчэ адна новая вуліца атрымала гістарычную назву — Віленская.

Дэпутаты гарадскога Савета зацвердзілі новае палажэнне аб арганізацыі штогадовага **спаборніцтва сярод органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання**. Цяпер у ім могуць браць удзел саветы мікрараён, а таксама вулічныя і дамавыя камітэты. Пераможцы атрымаюць прэміі ў 20, 15 і 10 базавых велічынь адпаведна.

Ілона ІВАНОВА.

БЯСПЕКА

ЖНІВО СА СТРАТАМІ... ЛЮДЗЕЙ

Не сакрэт, што адной з найбольш традыцыйна «рызыкоўных» галін заўсёды лічылася сельская гаспадарка. З пачатку года толькі на Міншчыне пры непасрэдным выкананні сваіх працоўных абавязкаў ужо загінулі 5 і атрымалі цяжкія траўмы 26 вяскоўцаў. Прычым зараз у АПК — час ці не самы небяспечны. У краіне ідзе жніво.

Які агляд ідзе ў лад?

Як кажуць, з апошняга. У адной з гаспадарак зламаўся трактар. Яго вырашалі завесці — з дапамогай другога трактара, які, заўважым, таксама знаходзіўся не ў лепшым тэхнічным стане. Механізатары зрабілі счэпку, але раптам... другая машына скранулася з месца і «заціснула» аднаго з трактарыстаў. Вынік — смяротная траўма.

— На першы погляд, адбыўся звычайны няшчасны выпадак, — кажа начальнік Мінскага абласнога дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Іван Карчэўскі. — Але нездарма заўважана: няма нічога больш заканамернага, чым выпадковае. Трагедыі не адбылося б, калі б абодва трактары былі спраўнымі.

Тэхнічныя агляды — умова абавязковая. Да таго ж, напярэдадні жніва праводзяцца дадатковыя праверкі спраўнасці трактароў, камбайнаў, аўтамабіляў. Надалей кіраўнікі гаспадарак рапартуюць — усё ў парадку... Аднак факт застаецца фактам: прычынай амаль кожнага сёмага няшчаснага выпадку ў АПК становіцца менавіта тэхніка.

Простыя рэчы

Не менш вострай праблемай былі і застаюцца дарожна-транспартныя здарэнні. Да пачатку актыўнай працы на жніве ў кожнай гаспадарцы абавязаны вызначыць маршруты руху сельгастэхнікі, абсталяваць яе святлоадбівальнымі элементамі, праверыць спраўнасць габарытных агнёў, фараў, шклоачышчальнікаў. Правілы нібыта простыя. Аднак памятаюць аб іх далёка не ўсе, а адсюль — аварыі.

— Трэба нагадаць яшчэ адно патрабаванне — у полі, дзе працуюць людзі, неабходна вызначыць спецыяльнае месца для адпачынку, прычым яно павінна быць бачна здалёк, пажадана, каб знаходзілася пад навесам, — працягвае Іван Карчэўскі. — Бяда толькі, што часта ў гаспадарках не звяртаюць увагі на падобныя «дробязі». Што да наступстваў, то яны могуць быць сумныя, напрыклад, раптоўныя наезды тэхнікі на людзей, якія прылеглі адпачыць у полі ці на ўзбочыне.

Апроч таго, забаронена перавозіць у кабінах камбайнаў спадарожнікаў і, безумоўна, выходзіць у рэйс... «пад допінгам». У гаспадарках павінны праводзіцца як дарэйсавыя, так і паслярэйсавыя медыцынскія агляды. А ў выпадку ўжывання моцных напояў чалавека без якіх-небудзь спасылак на «акалічнасці» неабходна адхіляць ад працы.

— Сустракаюцца прыклады, калі кіраўнік не дапускае да працы, а пасля камбайнер садзіцца ў машыну і едзе дадому, — заўважае Іван Карчэўскі. — Адсачыць сітуацыю тут цяжка, падчас жніва ні ў кога лішняй хвіліны няма. Вось чаму таму ж кіраўніку можна параіць: адхіліў ад працы — адразу ж забяры дакументы і ключы ад транспартнага сродку.

Рубель як лепшы стымул

Нягледзячы на ўсе захады, тэма п'янства была і застаецца актуальнай. Нельга сцвярджаць, што ў сельгаспрадпрыемствах алкаголь ужывалі ўсе ахвяры няшчасных здарэнняў. Аднак такіх выпадкаў — большасць.

— Апроч пакаранняў, трэба выкарыстоўваць і іншыя меры, — лічыць Іван Карчэўскі. — Скажам, можа быць вельмі эфектыўным такое правіла: выпіў або прыйшоў на працу ранкам «нясвежым» — ты пазбаўлены прэміі. А падчас жніва гэта адчувальна б'е па кішэні.

Варта нагадаць, што зараз у сельскай мясцовасці ўведзеныя абмежаванні на рэалізацыю спіртнога. Аднак, мяркуе Іван Карчэўскі, выкананне гэтай нормы трэба кантраляваць, і ў тым ліку — сіламі сельскіх Саветаў. Тыя ж Саветы могуць дапамагчы і яшчэ ў адным — у пошуку нелегальных «кропак» продажу самагону.

Рызыка «адкрытых» механізмаў

На жаль, месцам інцыдэнтаў можа стаць не толькі поле. Не менш небяспечнай зонай застаецца збожжаток. Не паставілі агароджанне на завальнай яме — у яе, асабліва ў цёмны час сутак, можа зваліцца чалавек. Не падумалі пра ахоўныя сродкі на дэталях, што круцяцца, — атрымалі траўму работнікі, якія знаходзяцца побач з адкрытымі механізмамі. Да слова, ужо падчас жніва сёлета адсутнасць агароджанняў былі прычынай двух няшчасных здарэнняў. Балазе, што людзі не сталі інвалідамі.

— Ёсць яшчэ адно жорсткае патрабаванне, — распавядае Іван Карчэўскі. — Няпоўнагадовым дазваляецца знаходзіцца толькі на адкрытых пляцоўках тока — скажам, можна падмятаць або зграбаць збожжа. Аднак асобам, якім не споўнілася 18 гадоў, катэгарычна забараняецца працаваць каля механізмаў.

Узроставыя правілы

Аб няпоўнагадовых гаворка асобная. Іван Карчэўскі падкрэслівае: на камбайнах павінны працаваць асобы, якія маюць пасведчанне катэгорыі «Д». У крайнім выпадку, памочніку камбайнера неабходна мець пасведчанне трактарыста-машыніста. Гэта ўмова першая. А ўмова другая — неабходна, каб памочніку камбайнера споўнілася 17 гадоў.

— Вядома, што жніво — добрая магчымасць зарабіць, таму традыцыі сямейных экіпажаў існавалі здаўна, — адзначае Іван Карчэўскі. — Аднак трэба разумець і іншае: сучасная тэхніка стала больш складанай. А верагоднасць няшчаснага выпадку на тым жа энерганасычаным камбайне нашмат большая.

Нялішне таксама нагадаць, што няпоўнагадовыя павінны працаваць у скарочаным рэжыме: не больш за 4 гадзіны 36 хвілін у дзень ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў і не больш за 7 гадзін — ва ўзросце 16—18 гадоў. І яшчэ. Няпоўнагадовых нельга прыцягваць да звышурочных, да працы па выхадных і святах, а таксама ў начны час — з 22 да 6 гадзін.

Атрымаў — карыстайся

Адно з тыповых парушэнняў падчас праверак дзяржінспектараў працы — адсутнасць сродкаў індывідуальнай абароны. Скажам, работнікаў, якія працуюць на збожжатказах з павышаным узроўнем пылу, неабходна забяспечваць рэспіратарамі. А камбайнераў — спецыяльным баваўняным касцюмам і спецыяльнымі ботамі. У адваротным выпадку працоўнае заканадаўства дазваляе нават адмовіцца ад выканання даручэнняў кіраўніцтва — тады наймальнік будзе абавязаны часова перавесці работніка на іншае месца з захаваннем ранейшай сярэдняй зарплаты.

— Забеспячэнне сродкамі індывідуальнай аховы — вялікая праблема, — канстатуе Іван Карчэўскі. — Аднак ёсць праблемы і іншага кшталту. Тыповы прыклад. Камбайнеру выдалі спецыяльны абутак. Аднак у кабіне стала спякотна, ён здымае спецабутак і апранае пляжныя «в'етнамкі», а ў выніку — падае з лесвіцы камбайна і атрымлівае траўму.

Да вас праверка...

Сельская гаспадарка — галіна сезонная, на працягу года адзін работнік можа перыядычна займацца некалькімі відамі дзейнасці. Таму вяскоўца трэба ўвесь час інструктаваць, нагадваць аб рызыцы на тым або іншым месцы. Каб «навучыць на памылках іншых», дзяржінспекцыя працы рыхтуе своеасаблівыя падборкі тыповых прыкладаў няшчасных выпадак. Шкада толькі, заўважае Іван Карчэўскі, што гэтыя «шпаргалкі» рэдка даходзяць непасрэдна да механізатараў ці паляводаў. Часцей за ўсё паперы не «ідуць» далей са стала кіраўніка сельгаспрадпрыемства або спецыяліста па ахове працы.

Між тым, вырашана: у жніўні павінны прайсці праверкі ўмоў працы і тэхнікі бяспекі ў АПК. На Міншчыне ў той або іншай ступені яны закрануць усе сельгаспрадпрыемствы. Прычым «экзамен» наладзяць адначасова некалькі службаў — у склад мабільных груп увойдуць дзяржінспектары працы, прадстаўнікі райвыканкама, мясцовага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, санстанцыі, энерганагляду, пажарнага нагляду і ДАІ.

— Мы спадзяёмся, што такім чынам колькасць няшчасных выпадкаў зменшыцца, ды і падыходы тут сталі больш строгімі, — заўважае Іван Карчэўскі. — Раней заканадаўства дазваляла ў выпадку выяўлення парушэння выносіць папярэджанні. Зараз жа на кіраўніка або службовых асобаў накладаюцца штрафы. А іх мінімальны памер сур'ёзны — 20 базавых велічынь.

Сяргей ГРЫБ.

ДЫРЭКТЫВА № 2: АДКРЫТЫ ФОРУМ

ЗАГРУЗІЛІ... СПРАВАЗДАЧАМІ

З моманту падпісання Дырэктывы № 2 мінула амаль два гады... Каб вызначыцца з сітуацыяй вакол дакументазвароту, а таксама з мэтазгоднасцю тых ці іншых справаздач, мы звярнуліся да кіраўнікоў першаснага звяна ўлады: ці адчуваюць яны становчыя зрухі ў пытанні дэбюракратызацыі дзяржапарату? Якія накірункі ўнутранай дзейнасці сельвыканкама забіраюць найбольш часу?

Міхаіл ШУЛЬГІН, старшыня Гервяцкага сельскага Савета дэпутатаў Астравецкага раёна:

— Дакументазварот павялічваецца з кожным годам, гэта факт. Вельмі шмат папер паступае з усіх структур, усіх арганізацый, якія толькі існуюць, — пракуратуры, міліцыі, санстанцыі, электрасетак і г.д. Кожная арганізацыя, якая мае нейкую назву, звяртаецца ў сельвыканкам са сваімі запытамі, нават з тымі, якія нас практычна не датычацца. Напрыклад, электрасеткі перыядычна просяць знайсці ім спадчыннікаў пустых дамоў. Мы, зразумела, валодаем нейкай інфармацыяй, але ж не настолькі! Астравецкі раён — прыгранічны, шмат людзей пераехала жыць за мяжу, некаторыя дамы і па 20 гадоў стаяць пустыя...

Добра, што старшыня райвыканкама нас падтрымлівае — без яго рэзалюцыі на некаторыя запыты мы можам не адказваць: ці мала хто і аб чым захоча даведацца! Або які-небудзь клерк не пажадае асабіста напружвацца, а напіша паперку і «спусціць» нам...

Або возьмем тую ж рэгістрацыю, якой замянілі прапіску. Здаецца, спрасцілі гэту сістэму. Але ў сапраўднасці пакет неабходных для афармлення дакументаў не зменшыўся, пісаніны меней не стала. Нават яшчэ адна паперка дадалася. Шчыра кажучы, мы ўжо, калі чуем пра чарговае «спрашчэнне», дык думаем: хоць бы перагрузка не пачалася.

Зборам падаткаў сёння займаюцца і сакратар, і бухгалтар... Землеўпарадчык прыязджае толькі па меры неабходнасці. Абмяркаць і фіксаваць участкі часта даводзіцца мне самому — а ў нас на тэрыторыі 45 населеных пунктаў.

Вельмі хацелася б упарадкавання ўсіх гэтых пытанняў, папярова-справаздачнай дзейнасці. Сельскі Савет і выканкам — гэта мясцовая ўлада. Але мы ўсё больш ператвараемся ў выканаўцаў — вырашаем пытанні, якія фактычна датычацца спецыялізаваных службаў і структур. Маўляў, у іх магутнасці слабыя. А ў нас, атрымліваецца, моцныя...

Іван ГАНЖЫН, старшыня Ленінскага сельскага Савета дэпутатаў Чачэрскага раёна:

— Скажу шчыра: пасля ўвядзення новага Адміністрацыйнага кодэксу менавіта на старшыню сельскага Савета легла шмат паўнамоцтваў па вядзенні адміністрацыйных спраў. Дзякуй, безумоўна, за давер. Але... Самі разумееце, колькі часу гэта забірае. Спачатку складаюцца пратаколы апытання, агляду, папера на вінаватую ў адміністрацыйным парушэнні асобу... Потым іх трэба разглядаць, рэгістраваць у сістэме праграмнага камп'ютарнага забеспячэння «Агат». І ў электронным выглядзе прадастаўляць інфармацыю па прынятых рашэннях у мясцовае ўпраўленне ўнутраных спраў... Падругое, на каго мне складаць адміністрацыйныя пратаколы? У нас ёсць населеныя пункты, дзе з 19 жыхароў 16 — пенсіянеры. Як я магу прад'яўляць прэтэнзіі за санітарны стан падворка людзям сталага веку, якія па 30—40 гадоў адпрацавалі ў гаспадарцы, а яна сёння не можа ім дапамагчы?

Яшчэ адно пытанне — па дакументазвароце, фіксаванні статыстычных дадзеных. У нас цяпер ёсць камп'ютарная праграма «Пагаспадарчы ўлік». І ў той жа час мы робім двайную работу — вядзём яшчэ і кнігу пагаспадарчага ўліку. Быццам бы з мэтай падстрахоўкі — раптам з камп'ютарнымі дадзенымі нешта здарыцца? Але ж іх можна скапіраваць ці перапісаць на дыск. І ніякага дубляванння ў пагаспадарчай кнізе непатрэбна (пагаспадарчая кніга, дарыўце, таксама можа згарэць).

Праблемы ў сельскага Савета заўсёды былі і будуць. Але мне здаецца, што раней, да прыняцця ўсемагчымых нарматываў, яны вырашаліся прасцей. Часам думаеш: вось гэта пытанне можна было б закрыць даўно, выйшаўшы на кіраўніка той ці іншай арганізацыі... Цяпер жа ўсё ўскладнілася. Адно ведамства спіхвае свае абавязкі на другое, другое — на трэцяе, і ўсе разам — на сельскі Савет...

Ганна АНІШЧУК, старшыня Лукаўскага сельскага Савета дэпутатаў Маларыцкага раёна:

— Да нас ідуць інструкцыі з усіх устаноў, аддзелаў райвыканкама. Аддзел будаўніцтва і архітэктуры даручае вызначыцца з пустымі дамамі і іх прыдатнасцю для далейшага выкарыстання. Санстанцыя просіць падлічыць колькасць кароў, якія не прайшлі аналіз на лейкоз, або арганізаваць інфармаванне грамадзян з нагоды вакцынацыі жывёлы. ДАІ дае распараджэнне ліквідаваць галіны дрэў, якія закрываюць дарожныя знакі (!). Або — абсталяваць усе вазы святлоадбівальнікамі...

Звычайна я ў такіх выпадках іду на кампраміс, інакш кажучы, выконваю распараджэнні... Днямі прыйшла чарговая папера. Мінсельгасхарч накіраваў яе ў аблвыканкам, аблвыканкам — у райвыканкам, а райвыканкам — нам: аб паўторным абследаванні сельгасаб'ектаў з працяглым тэрмінам эксплуатацыі. У прыватнасці, сельвыканкаму неабходна стварыць камісію, каб абследаваць сельгаспабудовы, што знаходзяцца на балансе сельгаспрадпрыемстваў (фермы і да т.п.). Ну якую, скажыце, я магу стварыць камісію, калі ў сельсавеце няма адпаведных спецыялістаў? Няма чалавека, які мог бы вызначыць эксплуатацыйны стан аб'ектаў, парушэнні патрабаванняў па іх эксплуатацыі і гэтак далей. На мой погляд, сельгаспрадпрыемства можа толькі прадаставіць спісы аб'ектаў, а камісію неабходна стварыць на ўзроўні раёна з дапамогай раённых службаў і спецыялістаў.

Колькі размоў вядзецца вакол скарачэння гэтых папер, а іх усё больш і больш... Цудоўна, што ў апошні час сельскія Саветы абсталявалі камп'ютарамі з адпаведным праграмным забеспячэннем — гэта значна аблегчыла нам работу, і людзей мы абслугоўваем хутчэй. З наяўнасцю аргтэхнікі пытанняў няма, але... ёсць вялікая праблема з яе абслугоўваннем. Выходзім са становішча рознымі шляхамі, шукаем спецыялістаў з дапамогай райвыканкама, запрашаем людзей збоку, звяртаемся ў камп'ютарныя клубы і да індывідуальных прадпрымальнікаў... Але ж ёсць моманты, калі павінна захоўвацца канфідэнцыяльнасць закладзенай у наш камп'ютар інфармацыі — тых жа пашпартных дадзеных. Як у падобнай сітуацыі можна гэта гарантаваць?..

Людміла ПРЫЛУЦКАЯ, старшыня Паршынскага сельскага Савета дэпутатаў Горацкага раёна:

— Я лічу, што і старшыня сельскага Савета, і сакратар празмерна загружаны справаздачнасцю. Кожны месяц 25 чысла мы абавязаны даць справаздачу аддзелу МНС — па колькасці абследаваных на проціпажарную бяспеку домаўладанняў з пералікам прозвішчаў жыхароў, з якімі былі праведзены прафілактычныя гутаркі... Асабіста я ўпэўнена, што ўсім гэтым павінен займацца не сельскі Савет, а занальны інспектар МНС. Абследаванне проціпажарнага стану домаўладанняў і папераджальныя гутаркі — задача спецыяліста, а не таго ж бібліятэкара ці загадчыка клуба. Спецыяліст павінен выдаць прадпісанне, а гаспадар дома — у адпаведнасці з прадпісаннем — адрамантаваць печку ці праводку... А вось калі чалавек не зможа зрабіць гэта самастойна (скажам, з-за ўзросту), тады яму і дапаможа сельвыканкам.

Пракуратура дасылае нам запыт: даць спісы беспрацоўных жыхароў, адзначыць, чым яны займаюцца. Але ж гэта — непасрэдны абавязак і аператыўная работа ўчастковага інспектара. Чаму выконваць яе вымушаны мы?

Самыя «гарачыя» дні надыходзяць у сувязі са зборам падаткаў — дзесьці з чэрвеня па каст рычнік. На сельсавеце падаткі — на зямлю і на нерухомасць — складаюць 21 млн рублёў. Уяўляеце, колькі падаткаплацельшчыкаў нам трэба абысці, калі кожны з іх уплачвае прыкладна па 6—12 тысяч рублёў? Колькі выпісаць квітанцый? У рэшце рэшт, гэта пытанне звязана з грашыма, за якія павінен несці адказнасць асобны чалавек. У горадзе гэта — падатковы інспектар, а ў сельсавеце? Усе?..

Ёсць, безумоўна, і станоўчыя зрухі ў рабоце — з'явілася электронная пошта, дзякуючы якой маем магчымасць атрымліваць з раёна ўсю аператыўную інфармацыю: прававыя дакументы, інструкцыі, распараджэнні... Але ў нас у сельскім Савеце толькі адзін камп'ютар — у сакратара, а неабходна хаця б два. Напрыклад, яшчэ і спецыялісту... Сёння спецыяліст спачатку рэгструе ці выпісвае людзей, а сакратару потым трэба паўторна заносіць гэтыя дадзеныя ў свой камп'ютар...

Наталля КАРПЕНКА.

«Колькі доўжыцца ваш працоўны дзень?» — пытаюся нядаўна ў аднаго старшыні сельскага Савета. «24 гадзіны, — адказвае ён на поўным сур'ёзе. — У апошнія гады папяровая работа пачала займаць столькі часу, што афіцыйнага працоўнага дня катастрафічна не хапае».

Адказ, шчыра кажучы, насцярожыў. Дырэктыва Прэзідэнта № 2 «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату» ўбачыла свет у снежні 2006 года. У гэтым дакументе, між іншым, непасрэдна закраналіся пытанні аптымізацыі ўнутранай дзейнасці дзяржаўных органаў, упарадкавання ўзаемадзеяння паміж імі, а таксама скарачэння перапіскі і справаздачнасці. Была звернута асаблівая ўвага на тое, што нярэдка супрацоўнікі дзяржаўных органаў улады значны аб'ём свайго працоўнага часу вымушаны затрачваць на падрыхтоўку і складанне ўсемагчымых справаздач і даведак, якія, да таго ж, часам дублююць адна адну. Усё гэта ў канчатковым выпадку негатыўна ўплывае на выкананне прадстаўнікамі ўладных структур сваіх асноўных функцый — работы з людзьмі.

ІЛЬГОТНАЯ КАРОЎКА

Ці можна ўзяць ільготныя крэдыты на развіццё асабістай гаспадаркі?

Нашая пастаянная чытачка нядаўна патэлефанавала ў рэдакцыю. І падзялілася сваёй жыццёвай праблемай. Жыве Людміла Васільеўна ў прыгарадзе Бабруйска. Ужо знаходзіцца на пенсіі, аднак трымае кароўку і малако здае дзяржаве.

І вось што яе засмучае: «От я б сабе яшчэ адну кароўку завяла. А мо б і не адну. І даільны апарат бы набыла. Ды хіба з пенсіі грошай хопіць? Я б крэдыт у банку ўзяла, ды даюць яго пад 17 працэнтаў! А гэта вельмі шмат, дык во скажыце, ці нельга б людзям у сельскай мясцовасці якія льготныя крэдыты даваць пад такія патрэбы, ну хаця б працэнтаў пад 5?.. Пакуль яшчэ ёсць у людзей жаданне працаваць у вёсцы...».

Пагутарылі мы з Людмілай Васільеўнай, паклаў я слухаўку і задумаўся, што і сапраўды дзіўна атрымліваецца: з усіх трыбун кажуць, што вёска вымірае, маладыя не хочуць заставацца там, імкнуцца ў горад, а тут раптам крэдыт на развіццё ўласнай гаспадаркі трэба браць на такіх жа ўмовах, як, скажам, на набыццё тэлевізара. Без тэлевізара вясковец пражыве, а вось без кароўкі...

Як мне ўдалося высветліць, карова будзе каштаваць недзе ад мільёна і да мільёна з паловай у залежнасці ад сваёй вагі і «прафесійных» якасцяў. Такая сума і з такімі мэтамі падпадае пад крэдыт на спажывецкія патрэбы. Атрымаць яго можна практычна ў любым банку нашай краіны, але на розных умовах: з паручыцелямі і без, з абмежаваннем узросту да 65 гадоў і без, з рознымі тэрмінамі прынята рашэнне аб выдачы крэдыту і гэтак далей. Аднак працэнтная стаўка паўсюль прыкладна адналькавая — у межах 15-18%.

Для сельскага насельніцтва зніжкі прадугледжаны толькі ў адным з зарэгістраваных у краіне банкаў — у ААТ «ААБ Беларусканк». У ім крэдыт на спажывецкія патрэбы ў памеры да 200 базавых велічынь на тэрмін да 1 года жыхары населеных пунктаў з насельніцтвам да 20 тыс. чалавек могуць атрымаць пад 12% (гарадскія — пад 13%), на тэрмін да 3 гадоў — пад 13% (гарадскія — пад 15%), а на тэрмін да 5 гадоў — пад 17% (для гарадскіх такі крэдыт наогул не прадугледжаны).

Уладзімір Раманчук, дырэктар дэпартамента крэдытавання насельніцтва ААТ «ААБ Беларусбанк», кажа, што пад меншы працэнт крэдыт выдаць немагчыма, бо, напрыклад, кожны хоча пакласці ў банк грошы пад высокі працэнт, а ўзяць крэдыт — пад малы. А банку ж таксама трэба за нешта жыць.

Таму выйсце адно — зніжкі для сельскага насельніцтва банку павінна кампенсаваць дзяржава. Але пакуль на гэта ў сферы спажывецкіх крэдытаў няма прававых асноў у адрозненне, напрыклад, ад крэдытавання будаўніцтва жылля. Таму нават тыя зніжкі для вяскоўцаў на 1—2 працэнты на крэдыты, што дае «Беларусбанк», — гэта ўласная ініцыятыва банка.

І каб даведацца, ці зможа ў бліжэйшы час Людміла Васільеўна атрымаць ільготны крэдыт для набыцця кароўкі, я завітаў у Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Там у аддзеле ўкаранення новых формаў гаспадарання мне расказалі, што ўжо падрыхтаваны праект пастановы Савета Міністраў, у якім прадугледжана адкрыццё спецыяльнага крэдытнай лініі для насельніцтва на набыццё жывёлы, элітнага насення, сельскагаспадарчай тэхнікі малой магутнасці і г.д. Пакуль гэты дакумент знаходзіцца ў міністэрстве і, калі будзе падпісаны міністрам, пойдзе ў Саўмін і на ўзгадненне па іншых інстанцыях. Наколькі льготнымі будуць умовы крэдытавання, колькі часу пройдзе да прыняцця гэтай пастановы, а таксама якім у рэшце рэшт атрымаецца гэта дакумент на выхадзе, спецыялісты Міністэрсва сельскай гаспадаркі і харчавання не ведаюць.

...Карова сама да Людмілы Васільеўны не прыйдзе. Яе прыйдзецца купляць і, хутчэй за ўсё, у крэдыт. А вось колькі Людміла Васільеўна заплаціць працэнтаў — залежыць ад дапамогі дзяржавы, ад таго, як вышэйназваны праект пастановы Саўміна будзе зацверджаны. Дарэчы, хутка выбары ў Нацыянальны сход, і можа так стацца, што сельскае насельніцтва, а ў тым ліку і Людміла Васільеўна, атрымае падарунак да выбараў — магчымасць узяць ільготныя крэдыты на развіццё асабістай гаспадаркі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

СТРАУС ДЗІКУ ТАВАРЫШ

Страусінае мяса падавалі да стала яшчэ ў Старажытным Егіпце і пры двары рымскіх правіцеляў. Напрыклад, імператар Геліябал аднойчы вельмі здзівіў сваіх гасцей стравай прыгатаванай з мазгоў шасцісот (!) страусаў. Але ў далейшым менавіта гастранамічныя асаблівасці адышлі на другі план. Упершыню страусаў пачалі разводзіць яшчэ ў пазамінулым стагоддзі, галоўным чынам з-за моды на іх дзіўныя пёры. Яны выкарыстоўваліся для ўпрыгожвання дамскіх капялюшыкаў, жаночага адзення, афармлення тэатральных касцюмаў, а таксама ваеннай амуніцыі (варта ўзгадаць, да прыкладу, галаўныя ўборы мушкецёраў) і г.д. Аб'ёмы паставак уражваюць нават і па цяперашнім часе — захаваліся звесткі аб тым, што Паўднёвая Афрыка ў перадваенным 1913 годзе экспартавала да 45 тысяч тон страусіных пёраў.



Цікаўныя страусы адразу падбягаюць знаёмідца.

Праз пэўны час мода на такія аксесуары прайшла, таму і вырошчванне вялізных птушак паступова згортвалася. Адраджаць гэты занятак пачала адносна нядаўна, калі ва ўсім свеце настаў сапраўдны «страусіны бум». І ўсё з-за здаровага ладу жыцця, моду на які прадыктавала жахлівая дынаміка росту захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы. У многіх краінах гэта надзвычай вострая праблема. Аднак пры чым тут страусы? Мяса гэтых птушак надта карыснае — адрозніваецца невялікім утрыманнем халестэрыну, нізкай каларыйнасцю, багатым наборам мікраэлементаў і высокім утрыманнем бялкоў пры нізкай тлустасці.

Уладзімір ГУРКІН прапаноўвае параўнаць курынае і страўсінае яйкі.

З дрылем — па яечню

Уладзімір Гуркін да фермерства далучыўся нядаўна — першыя 5,5 гектара зямель сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Слуцкая ніва» ўзяў летась. Непадалёк ад Слуцка, побач з вёскай Лясішча, размешчаны вытворчыя памяшканні, якія раней выкарыстоўваліся пад каняферму, цялятнік, але з цягам часу заняпалі. Аднаўляць гэтую базу ў найбліжэйшай перспектыве гаспадарка, напэўна, не планавала, а вось прыватніку напаўразбураныя будынкі аказаліся вельмі дарэчы. У Гуркіна нарэшце з'явілася рэальная магчымасць ажыццявіць даўнюю задумку — стварыць цэлы «холдынг», які б аб'ядноўваў і вытворчасць, і арганізацыю адпачынку турыстаў. Ідэя вядомая, зараз яна ўвасабляецца не толькі прыватнікамі, а і агрtoпрамысловымі прадпрыемствамі. Але ва Уладзіміра Міхайлавіча ёсць несумненная «фішка» — ён узяўся вырошчваць страусаў. І не проста трымаць некалькіх птушак «для экзотыкі», а наладзіць самую сапраўдную вытворчасць. У снежні мінулага года з Брэстчыны прыватнік прывёз на Случчыну сорак чорных афрыканскіх страусаў.

— Першы тузін сем'яў (звычайна ў адной «класічнай» сям'і дзве самкі і самец), — заўважае Гуркін. — Гэта пачатак, а ў перспектыве мяркую трымаць да тысячы птушак. Толькі ў такім разе можна будзе казаць пра сапраўдную таварную вытворчасць.

Для страусаў на ферме пад Лясішчам зрабілі спецыяльныя загарадзі — па 120 метраў даўжынёй і шырынёй каля 5. Такая канструкцыя неабходная для таго, каб бяспечна трымаць «афрыканцаў». Страусы хоць і самыя вялікія птушкі ў свеце, аднак надта ўжо пужлівыя. Любы рэзкі нехарактэрны гук (да прыкладу, ад пралёту самалёта) можа іх напалохаць. Тады птушкі «стартуюць» і на вялікай хуткасці прабягаюць некалькі дзесяткаў метраў. Вядома, адразу не могуць спыніцца — трэба мець на ўвазе і «тармазны шлях». Так што калі б абгароджаныя ўчасткі былі карацейшыя, то страусы маглі б пабіцца аб агароджу.

Гэтыя птушкі цікаўныя і кампанейскія — толькі падыходзім да выгану, то адразу да плота бягуць з дзесятак вялізных «курэй». Доўгая шыя, моцныя ногі і вялікія лагодныя вочы з пушыстымі вейкамі. Першымі ля агароджы заўсёды апынаюцца «мужчыны», бо трэба вывучыць сітуацыю з пункту гледжання бяспекі для свайго сямейства. Паколькі я не адзін, а разам з Уладзімірам Міхайлавічам, то страусы супакойваюцца і пачынаюць з зайздрасцю пазіраць на дыктафон. Трымаю наводдаль, каб не выхапілі: вялікія птушкі як сарокі — цягне іх на розныя бліскучыя рэчы. Толькі схоплюць нешта — адразу праглынаюць. Гуркін расказваў, як аднойчы стаялі ля агароджы і размаўлялі з загадчыкам падсобнай гаспадаркі (ферму абслугоўваюць 13 чалавек — усё гэта новыя працоўныя месцы), а адзін са страусаў выцягнуў пальчатку і імгненна яе «з'еў».

Увогуле харчаванне «афрыканцаў» практычна як у звычайных курэй, толькі «порцыі», зразумела, на парадак большыя — штодня кожная птушка з'ядае больш за чатыры кіло корму. Страусам даюць зерне, камбікорм, траву (найлепш выкарыстоўваць люцэрну і канюшыну), а таксама спецыфічныя дабаўкі. За сезон ад адной самкі можна атрымаць 40—80 яек. Абуладкаванне гнязда займаецца самец, які, дарэчы, з'яўляецца асноўнай «квактухай». Цікава, што ў яго звычайна ёсць «любімая самка» — гэтая страусіха першай адкладвае яйкі, дапамагае выседжваць патомства. Аднак у сучасных умовах гаспадары лічаць за лепшае маладняк выводзіць у інкубатарах. Спачатку яйкі прасвечваюць, каб адабраць аплодненыя. Астатнія можна ўжываць у ежу. З аднаго страусінага яйка (прыкладна два дзесяткі курыных) атрымліваецца яечня на вялікую кампанію. Праўда, шкарлупіна даволі цвёрдая (можа вытрымаць вагу дарослага чалавека), таму для таго, каб яе раскалоць, трэба браць малаток альбо свідраваць дзірку дрылем.

Бублік, Афоня, Борка ды іншыя

На ферме пад Лясішчам некалькі месяцаў таму з'явіліся на свет першыя страусяняткі. Уладзімір Міхайлавіч паказаў мне інкубатар, да якога прыбудавана накрытая поліэтыленавай плёнкай пляцоўка. Сюды малыя выходзяць на прагулку. У інкубатары яйка ляжаць 42 дні, пасля чаго пачынаюць вылупляцца малыя. Яны важаць каля кілограма, росту маюць 20—25 сантыметраў. Усе звыклыя параметры (амаль трохметровы рост і паўтара цэнтнера вагі) птушкі набіраюць за год! Першыя месяцы жыцця — самыя адказныя і складаныя, за кожным страусяняткам даводзіцца хадзіць як за дзіцем.

Мяса з фермы Гуркін мяркуе атрымаць толькі налета. Далікатэсны прадукт плануе пастаўляць у Маскву, магчыма, калі знойдуцца айчынныя спажыўцы, то без праблем можна забяспечваць і ўнутраны рынак. Сусветны кошт страусяціны — у межах 20 долараў за кілаграм. Як заўважае Уладзімір Міхайлавіч, пакуль патрэба ў мясе задавольваецца толькі на 14 працэнтаў. У далейшым, калі аб'ёмы вытворчасці павялічацца (у тым ліку і на лясішчанскай ферме), то і цана, адпаведна, зменшыцца. Страусагадоўля — даволі перспектыўны і выгадны бізнэс. За год ад адной птушкі можна атрымаць мяса больш, чым ад быка. Аднак і рызыкі тут больш.

— Без рызыкі ў бізнэсе не абыдзешся, — кажа Гуркін. — Прыватнікам стаў у пачатку 1990-х гадоў, калі звольніўся з войска і ўзяў у арэнду першую краму. Сёння ў мяне іх дзесяць: сем харчовых, дзве па продажы будаўнічых матэрыялаў і адна — канцтавараў. У асноўным гэта былі закінутыя будынкі альбо крамы, якія не прыносілі прыбытку.

Цяпер гандлёвы дом Гуркіна, які мае назву «Тройка-маркет», працуе ўстойліва і прыносіць стабільны прыбытак. Прыватніку захацелася рухацца далей, таму і распачаў сельскагаспадарчы праект. Вопыту ў гэтым пакуль малавата, аднак, як ён сам лічыць, усё нажыўное. «Вучуся быць вяскоўцам, — кажа Уладзімір Міхайлавіч. — Пакуль у гэта толькі ўкладваю сродкі, аддачы ніякай». Акрамя 5,5 гектара плошчаў, на якіх размешчаны вытворчыя будынкі, «малады фермер» атрымаў 180 га лугавых угоддзяў. Праўда, канчаткова тэрыторыя адыдзе да яго толькі пасля заканчэння ўборачных работ, якія зараз праводзіць мясцовы СВК. Тут Гуркін плануе пасеяць люцэрну, канюшыну, кукурузу, авёс, іншыя збожжавыя культуры. Усё гэта будзе выкарыстоўвацца на корм жывёле. Дарэчы, маюцца на ўвазе не толькі страусы — на вялікім падворку вырошчваюцца, напрыклад, свінні. Гаспадар мяркуе, што «пятачкі» круглы год будуць знаходзіцца не ў памяшканні, а прама на полі. Таксама вырошчваюць індыкоў, індакачак, курэй. Ёсць і сапраўдная экзотыка — кшталту залатога і сярэбранага фазанаў, савятаў, шоўкавага пеўніка, а таксама самага сапраўднага арлана. Непадалёку на выпасе да гасцей падыходзіць вінторогі горны казёл Борка, а ў загарадзі гойсае амаль зусім «хатні» дзік Афоня (праўда, падысці да яго я не адважыўся, а вось у работнікаў жывёліна бярэ ежу з рук. — **М.Л.**). У меншым вальеры — в'етнамскае парася Бублік, якога раней трымалі ў гарадской кватэры. Так што на гуркінаўскай сядзібе можна пабачыць сапраўдны «каўчэг».

Тут ужо абуладкаваны некалькі альтанак, прычым кожная — у адметным стылі. Ёсць і сажалка, куды запусцяць рыбу. Адкрылі невялікую крамку, дзе акрамя кавы, гарбаты і халоднькага піўка з рознымі закускамі прапануюць страусінае пер'е, яйкі, шкарлупіну, іншыя памятныя сувеніры. У далейшым на сядзібе плануюць адкрыць кавярню (дзе ў меню абавязкова будуць далікатэсныя стравы са страусяціны і яек), а таксама пабудаваць гасцявы домік, лазню, дзіцячую пляцоўку.

— Напэўна, многім будзе цікава паглядзець на экзатычных жывёл, добра адпачыць, смачна пад'есці і атрымаць станоўчыя эмоцыі, — упэўнены Уладзімір Гуркін. — Ужо цяпер праводзім на ферме арыгінальныя экскурсіі, а ў далейшым, спадзяюся, гасцей стане значна больш. Прыязджайце на Случчыну...

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Слуцкі раён.

Фота аўтара.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ПРАВАХ ДЗІЦЯЦІ»

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 10 чэрвеня 2008 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 20 чэрвеня 2008 года

Артыкул 1. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 лістапада 1993 года «Аб правах дзіцяці» ў рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 25 кастрычніка 2000 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 33, ст. 430; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 103, 2/215; 2004 г., № 107, 2/1047; 2007 г., № 147, 2/1336) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У часты другой прэамбулы слова «экстрэмальных» замяніць словам «надзвычайных».

2. У артыкуле 1:

у частцы першай словы «якія датычацца правоў і інтарэсаў» замяніць словамі «якія рэгламентуюць парадак і ўмовы рэалізацыі правоў і законных інтарэсаў»;

частку трэцюю дапоўніць словамі «і яго дзеяздольнасці»;

дапоўніць артыкул часткай чацвёртай наступнага зместу:

«Абмежаванне правоў і свабод дзіцяці дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, аховы маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асобаў.».

3. У артыкуле 2 слова «юрыдычных» замяніць словам «арганізацый».

4. У артыкуле 3:

назву і частку першую артыкула выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 3. Дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі, якія забяспечваюць ахову правоў і законных інтарэсаў дзіцяці. Каардынацыя дзейнасці дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона

Ахова правоў і законных інтарэсаў дзіцяці забяспечваецца камісіямі па справах няпоўнагадовых, органамі апекі і папячыцельства, пракуратурай і судом, а таксама іншымі арганізацыямі, якія ўпаўнаважаны на тое заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якія ў сваёй дзейнасці кіруюцца прыярытэтам аховы правоў і законных інтарэсаў дзяцей.»;

частку другую пасля слоў «правоў і» дапоўніць словам «законных».

5. У частцы трэцяй артыкула 4 словы «асобаў, якія ўчынілі злачынствы ва ўзросце да васемнаццаці гадоў,» замяніць словам «дзяцей».

6. У частцы другой артыкула 5 словы «у дародавы і пасляродавы перыяды» замяніць словамі «падчас цяжарнасці, родаў і ў адналетні перыяд пасля родаў».

7. У артыкуле 7 словы «актамі заканадаўства» замяніць словамі «заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі».

8. У артыкуле 9:

у частцы другой:

пасля слоў «зневажальнага абыходжання,» дапоўніць частку словам «уніжэння,»;

словы «бацькоў або асобаў, якія іх замяняюць,» замяніць словамі «бацькоў (апекуноў, папячыцеляў)»;

дапоўніць частку словамі «, а таксама ад прыцягнення дзіцяці да работ, якія могуць нанесці шкоду яго фізічнаму, разумоваму або маральнаму развіццю»;

частку трэцюю пасля слоў «якія ўяўляюць пагрозу яго» дапоўніць словам «жыццю,».

9. У артыкуле 10:

у частцы другой словы «або асобаў, якія іх замяняюць», «навучальных устаноў» і «законныя правы» замяніць адпаведна словамі «(апекуноў, папячыцеляў)», «устаноў адукацыі» і «правы і законныя інтарэсы»;

у частцы трэцяй словы «або асобаў, якія іх замяняюць» замяніць словамі «(апекуноў, папячыцеляў)».

10. Частку трэцюю артыкула 11 выключыць.

11. Артыкул 12 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 12. Права на льготы па праездзе

Дзеці маюць права на льготы па праездзе ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.».

12. У артыкуле 13:

назву артыкула пасля слоў «правоў і» дапоўніць словам «законных»;

у частцы першай словы «або асобаў, якія іх замяняюць» замяніць словам «(папячыцеляў)»;

частку другую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Калегіі адвакатаў аказваюць бясплатную юрыдычную дапамогу дзецям у іх інтарэсах, іх бацькам (апекунам, папячыцелям) у інтарэсах дзяцей пры дачы кансультацый, складанні прававых дакументаў аб узбуджэнні спраў у судах, а таксама ў судах першай інстанцыі пры вядзенні спраў, звязаных з працоўнымі праваадносінамі, аб спагнанні аліментаў, аб пакрыцці ўрону, нанесенага калецтвам або іншым пашкоджаннем здароўя, звязанымі з працай.»;

частку трэцюю пасля слоў «з заявамі ў» дапоўніць словамі «камісіі па справах няпоўнагадовых,», пасля слоў «правоў і» дапоўніць словам «законных».

13. Артыкул 14 пасля слоў «правы і» дапоўніць словам «законныя».

14. Артыкул 17 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 17. Адказнасць сям'і за дзіця

Бацькі (апекуны, папячыцелі) павінны стварыць неабходныя ўмовы для паўнацэннага развіцця, выхавання, адукацыі, умацавання здароўя дзіцяці і падрыхтоўкі яго да самастойнага жыцця ў сям'і і грамадстве.

Пры знаходжанні дзяцей на дзяржаўным забеспячэнні бацькі абавязаны пакрываць у поўным аб'ёме расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне іх дзяцей, у выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Парушэнне правоў і законных інтарэсаў дзіцяці бацькамі (апекунамі, папячыцелямі) цягне адказнасць, якая прадугледжана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

У выпадках, якія ўстаноўлены заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, бацькі (апекуны, папячыцелі) нясуць адказнасць за парушэнне дзецьмі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.».

15. Артыкул 21 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 21. Сацыяльная абарона сям'і дзяржавай

У мэтах паўнацэннага ўтрымання і выхавання дзіцяці ў сям'і дзяржава аказвае сацыяльную дапамогу ў выглядзе дзяржаўных дапамог, гарантуе права на карыстанне паслугамі ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі, і прадастаўляе льготы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.».

16. У частцы першай артыкула 22 словы «дзяржаўных і грамадскіх арганізацый» і «часопісаў і кніг» замяніць адпаведна словамі «дзяржаўных арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў» і «часопісаў, кніг і іншых друкаваных выданняў».

17. Артыкулы 23 і 24 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 23. Права на адукацыю

Кожнае дзіця мае права на атрыманне адукацыі.

Дзецям гарантуецца права на атрыманне бясплатнай агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і на канкурснай аснове бясплатнай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў дзяржаўных установах адукацыі.

Дзяржава заахвочвае развіццё таленту і павышэнне ўзроўню адукацыі.

Артыкул 24. Права на працу

Кожнае дзіця мае права на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэб.

Па дасягненні шаснаццаці гадоў дзеці маюць права на самастойную працоўную дзейнасць. З пісьмовага дазволу аднаго з бацькоў (папячыцеля) працоўны дагавор можа быць заключаны з дзіцем, якое дасягнула чатырнаццаці гадоў, на ўмовах і ў парадку, устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Забараняецца прымяненне працы дзіцяці на цяжкіх работах і работах са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі працы, падземных і горных работах, спіс якіх зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам.».

18. Частку першую артыкула 25 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Кожнае дзіця мае права на адпачынак і выбар пазашкольных заняткаў у адпаведнасці са сваімі інтарэсамі і здольнасцямі. Дзяржава стварае шырокую сетку ўстаноў пазашкольнага выхавання і навучання, спецыялізаваных навучальна-спартыўных устаноў, фізкультурна-спартыўных збудаванняў, іншых месцаў адпачынку і ўмацавання здароўя дзяцей, устанаўлівае для дзяцей ільготны парадак карыстання паслугамі ў сферы культуры і фізкультурна-аздараўляльнымі паслугамі.».

19. Артыкул 26 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 26. Права на свабоду аб'яднанняў

Дзяржава стварае неабходныя ўмовы для свабоднага і эфектыўнага ўдзелу моладзі ў палітычным, сацыяльным, эканамічным і культурным развіцці.

Дзеці маюць права аб'ядноўвацца ў дзіцячыя і маладзёжныя грамадскія аб'яднанні пры ўмове, што дзейнасць гэтых аб'яднанняў не мае мэтай гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу альбо вядзення прапаганды вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці.

Дзіцячыя і маладзёжным грамадскім аб'яднанням аказваецца дзяржаўная падтрымка ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.».

20. У артыкуле 27:

у частцы другой словы «навучальна-выхавальчых установах» замяніць словамі «установах адукацыі»;

у частцы трэцяй слова «заканадаўствам» замяніць словамі «заканадаўчымі актамі».

21. У назве главы 4 слова «экстрэмальных» замяніць словам «надзвычайных».

22. Артыкул 29 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 29. Ахова правоў дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў

Дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, маюць права на асаблівы клопат дзяржавы. У парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, ім прадастаўляюцца дзяржаўнае забеспячэнне і іншыя гарантыі па сацыяльнай абароне.

Органы апекі і папячыцельства, іншыя арганізацыі, якія ўпаўнаважаны заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ажыццяўляць ахову правоў і законных інтарэсаў дзяцей, павінны прымаць усе меры па ўладкаванні дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, на выхаванне ў сям'ю. Пры гэтым дзеці з улікам іх інтарэсаў падлягаюць пераважнаму ўладкаванню ў сем'і сваякоў дзяцей альбо ў сем'і грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

У парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, усынаўленне (удачарэнне) дзяцей-сірот і дзяцей, якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь і засталіся без апекі бацькоў, устанаўленне апекі (папячыцельства) над дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь і засталіся без апекі бацькоў, дапускаюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі іншаземнай дзяржавы, іншаземнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства. У гэтым выпадку ўладкаванне дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у сем'і грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі іншаземнай дзяржавы, можа быць праведзена толькі пасля таго, як будзе ўстаноўлена немагчымасць перадачы дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, на выхаванне ў сем'і грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і немагчымасць іх усынаўлення (удачарэння), устанаўлення апекі (папячыцельства) грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі іншаземнай дзяржавы, у якой дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, маюць грамадзянства (падданства), або ўстанаўлення апекі (папячыцельства) грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі іншаземнай дзяржавы, у якой дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, маюць грамадзянства (падданства), немагчымасці ўладкавання іх на выхаванне ў сям'ю падлягаюць уладкаванню ў дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, дзяржаўныя спецыялізаваныя ўстановы для няпоўнагадовых, якім патрэбна сацыяльная дапамога і рэабілітацыя, дзяржаўныя ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, дзіцячыя вёскі (гарадкі), апякунскіх сем'ях, прыёмных сем'ях, стварающа ўсе неабходныя ўмовы, набліжаныя да сямейных, забяспечваецца захаванне іх роднай мовы, культуры, нацыянальных звычаяў і традыцый.».

23. Артыкул 30 выключыць.

24. У артыкуле 31 словы «і іх бацькамі навучальнай установы, атрыманне базавай і прафесійнай адукацыі» замяніць словамі «і іх бацькамі (апекунамі, папячыцелямі) установы адукацыі, забеспячэнне ўмоў для атрымання адукацыі на ўсіх узроўнях асноўнай адукацыі, а таксама дадатковай адукацыі».

25. Артыкул 32 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 32. Забеспячэнне бяспекі дзяцей у выпадку ўзнікнення надзвычайных сітуацый

У выпадку ўзнікнення надзвычайных сітуацый дзяржава аказвае дзецям бязвыплатную дапамогу, неабходную медыцынскую дапамогу, прымае меры па ахове жыцця, здароўя і маёмасці дзяцей, у тым ліку меры па іх уз'яднанні з сям'ёй, эвакуацыі з краіны (месца) іх знаходжання.».

26. У артыкуле 33:

у частцы першай слова «дзеянням,» замяніць словамі «дзеяннях або іншае іх выкарыстанне ў»;

частку другую выключыць.

27. Артыкул 34 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 34. Правы дзяцей-бежанцаў

Дзеці, якія прыбылі ў Рэспубліку Беларусь, маюць права звярнуцца з хадайніцтвам аб прадастаўленні статусу бежанца або дадатковай аховы ў Рэспубліцы Беларусь альбо прыстаншча ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы па месцы знаходжання дзіцяці ўстанаўліваюць над ім апеку або папячыцельства, забеспячваюць іншыя формы яго ўладкавання на выхаванне.».

28. У артыкуле 35:

слова «няпоўнагадовых» замяніць словам «дзяцей»;

словы «, затрыманні, арышце» выключыць.

29. У артыкуле 36:

у назве артыкула слова «выхаваўчых» замяніць словамі «навучальна-выхаваўчых і лячэбна-выхаваўчых»;

у частцы другой слова «базавай» замяніць словамі «агульнай базавай, агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай»;

у частцы трэцяй слова «няпоўнагадовых» замяніць словам «дзяцей».

30. Артыкул 38 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 38. Міжнародныя дагаворы

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія прадугледжаны гэтым Законам, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.».

31. У артыкуле 40 слова «заканадаўствам» замяніць словамі «заканадаўчымі актамі».

Артыкул 2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін прыняць неабходныя меры па прывядзенні заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам.

Артыкул 3. Гэты Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА

8 ліпеня 2008 года, г. Мінск.
№ 365–З

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А.,
старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні;

АНІКЕЕВА Л. А.,
старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

САСОНКА М. П.,
член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

СЯЛІЦКІ В. С.,
старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А.,
старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І.,
старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:

Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

Натура

ЖНІВЕНЬ — ЧАС АКУНЁЎ

Вячаслаў Фамін — вядомы ў Паставах, ды і не толькі ў Паставах, рыбак-аматар. Ды і які ён аматар — прафесіянал лоўлі рыбы вудай. Перавагу аддае зімовай лоўлі, але і летам ловіць з гумавай лодкі таксама на зімовую вуду. Выкарыстоўвае расцяжку. Расцяжка — шнур на некалькі дзесяткаў метраў. На абодвух яго канцах мацуецца груз. І рыбак, трымаючыся за гэты шнур, спакойна перамяшчаецца па ім, шукае рыбу. Вячаслаў ловіць рыбу ўжо гадоў пяцьдзесят. І вядзе падрабязныя дзённікі, дзе пазначае тэмпературу паветра, ападкі, іншыя звесткі аб надвор'і, якія можа апісаць. У яго картах Нарачанскіх, іншых азёр нашай акругі намаляваныя стрэлкі, пазначана адлегласць, напрыклад, 1000 крокаў ад берага на пэўны арыенцір. Тут месца вельмі рыдатнае для акуня, альбо ляшча, альбо плоткі...

Вячаслаў быў сярод пераможцаў Віцебскіх абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў рыбаловаў-аматараў. А вось яго расповед пра лоўлю рыбы на Мядзельскім возеры. Хаця, правільней казаць — на Мядзеле.

«У жніўні буйны акунь збіраецца на Мядзеле каля падводных узвышшаў, пакрытых зялёным імхом.. Цягну расцяжку праз увесь гэты падводны бугор, таму шнур павінен быць даволі даўгі — метраў 70. Потым, перамяшчаючыся па шнуры, шукаю, дзе сабраўся акунь. Звычайна буйны акунь стаіць на схіле, перапад глыбіні ад 5 да 9 метраў. На Мядзеле ёсць некалькі падводных узвышшаў, дзе ён трымаецца. Нявопытнаму рыбаку адшукаць іх не так і проста. Але спытайце ў калегаў па гэтым захапляльным занятку — нехта і падкажа. Толькі лепш вывучаць возера самому.

Звычайна лаўлю на малую вуду, як зімой. Даўжыня яе з хлысцікам 30—40 сантыметраў. Леска павінна быць шэра-зялёнага колеру, трывалай. Дыяметр яе — 0,25—0,12 мм. Мармышка — сярэдняя, абавязкова свінцовая з добрым кручком. Калі кручок дрэнны — акунь будзе яго разгінаць, а то і ламаць. На кручку павінна быць добрая зазубрына — менш будзе сходаў рыбін. Звычайна кручок № 5, 6. Ківок робіцца з лескі 0,5 складзенай удвая, на леску надзяваецца кембрык, маленькімі кавалачкамі рознага колеру. Ківок мацуецца да хлысціка з дапамогай нітэльнай гумкі.

Прынада — чарвячок альбо шыцік-ручэйнік.

Аднойчы ў пачатку жніўня я паехаў лавіць на Мядзел. Месца, дзе трымаюся буйны акунь, пазначыў у час папярэдняй рыбалкі буйком з пенапласту. Я яго не кідаю на самым месцы лоўлі, а метраў за трыццаць убок. Калі падплываў туды, убачыў, як недалёка ад буйка буйны акунь ганяе малька. Вада ў тым месцы літаральна бурліла. Высоквалі малькі, чулася характэрнае чваканне буйных акунёў.

Я ціхенька падгроб да таго месца і кінуў расцяжку так, каб яна праходзіла якраз праз рыбнае месца. Замацаваўся там, дзе яшчэ па вадзе разыходзіліся кругі. Вырашыў лавіць на леску 0,12 (японскую, светла-зялёнага колеру). Мармышка вялікая (нарачанская), свінцовая. Вудачка з катушкай.

Начапіўшы на кручок некалькі шыцікаў, апусціў мармышку на дно. Глыбіня аказалася 6 метраў. Пачаў падымаць, гуляць мармышкай. На вышыні каля 0,5 метра ківок рэзка сагнуўся. Падсёк і адчуў, што мармышка зачапілася за нешта цяжкое. Скрануць акуня з месца было немагчыма, ён стаяў нерухома. А потым марудна, праз некалькі секунд, паскорана пайшоў на глыбіню. Ірвануў, я ледзь паспеў адпусціць катушку. Разматаўшы метраў 10 лескі, акунь спыніўся. Дарэчы, галоўнае пры лоўлі буйнога акуня — стрымаць яго першы рывок, вось тут без катушкі не абысціся. Акунь, трапіўшы на кручок, ідзе на глыбіню толькі па прамой, не кругляе. Гэта плотка і лешч ідуць кругамі, можна іх выцягнуць і на тонкую леску.

А тады, пакрысе падцягнуў акуня да лодкі, рукой пад жывот — і ён ужо тут. Заважыў 1200 грамаў.

І тут пачалася рыбалка! Акуні браліся адзін за адным. То на шыціка, то на чарвяка. Менш за 300 грамаў вагі ў іх не было. Акуні падняліся пад самую лодку, у цень. Мармышка праходзіла метры 3, і леска спынялася. Я кінуў рэшткі чарвякоў і шыцікаў каля лодкі. І яны забраліся вакол. Кідаю некалькі чарвякоў за борт, яны, звіваючыся, пачалі апускацца. І з-пад лодкі выплываюць 3 акуні, хапаюць чарвякоў. Зноў хаваюцца пад лодку.

Тады я ўзяў у руку чарвяка і апусціў за борт. Акуні выплылі з-пад лодкі і падплылі да рукі. Ім відавочна хацелася вырваць чарвяка, але былі асцярожныя. Потым адзін адважыўся: моцна тарганаўшы галавой, вырваў у мяне чарвяка. Так я нейкі час карміў акунёў з рук.

Набліжаўся поўдзень. Такім спякотным надвор'ем можна лавіць толькі да 12 гадзін.

Вырашыў злавіць апошняга акуня і завяршаць рыбалку. Апусціў мармышку на дно, пастукаў. Выбіраю — леска паднялася ўверх. Падсёк і пачаў выцягваць акуня грамаў на 300. Працягнуў метры са два і адчуў, што акунь рэзка спыніўся і пайшоў на глыбіню. Стаў адпускаць катушку. Нешта буйное разматала аж 20 метраў лескі. Паспрабаваў падцягваць да сябе, але леска 0,12 толькі расцягвалася, рыбіну з месца я скрануць не мог. Паторгаў уверх — нешта зрушылася з месца і пайшло па дне ў другі бок. Нарэшце спынілася на дне пад лодкай і не рухалася з месца. Хацеў адразу абрываць леску і не мучыцца. А потым вырашыў: што будзе, тое будзе. Пацягаемся, можа, сама абарве. Стаў торгаць хлысцікам уверх, ён гнуўся дугой, а рыба не рухалася. Я паглядзеў на гадзіннік — 11. Недалёка ад мяне на драўлянай лодцы лавіў мясцовы рыбак. Ён з цікавасцю глядзеў, як я цягаю нешта буйное.

Нарэшце рыбіна марудна захадзіла пад лодкай. Пачаў падцягваць уверх, леска нацягнулася да рэшты, але і рыбіна паднялася з глыбіні 6 да 4 метраў і хадзіла кругамі пад лодкай. Потым рэзка крутнулася некалькі разоў, і леска дала слабіну. Падумаў, што яна сарвалася. Але ў гэты момант яна так імкліва пайшла ў глыбіню, што ледзь не вырвала вуду ў мяне з рук. У гэты момант ля лодкі ўсплыў пракусаны зубамі акунь...

Потым я зразумеў, што, калі я цягнуў акуня, яго схапіў буйны шчупак. Акуня адпусціў, выплюнуў, а мармышка зачапілася і не давала яму сысці.

Барацьба працягвалася ўжо хвілін 20. Я падымаў — рыбіна апускалася, але выцягнуць шчупака на паверхню, каб ён глынуў паветра, не ўдавалася. У мяне ўжо абмярцвелі рукі, давала аб сабе знаць спёка. Мужчына, які лавіў побач, падплыў да мяне, закінуў свой занятак, наглядаў, як я дужаюся з рыбінай. Шчупак не здаваўся, ды ў глыбіню ўжо не ішоў — хадзіў вакол лодкі амаль пад паверхняй. Нарэшце шчупак усплыў, перавярнуўся на жывот і ляжаў, толькі крыху варушыў плаўнікамі. Я стаў пакрысе падцягваць яго да лодкі, каб падхапіць знізу рукою. Але шчупак, адпачнуўшы, зноў ірвануў углыб, толькі гэты рывок быў ужо не такім моцным. Праз некалькі хвілін ён здаўся. З'явіўся ля самой лодкі і больш ужо не торгаўся. Я падхапіў рыбіну рукой і перакінуў у лодку.

Шчупак быў каля метра даўжынёй і вагой 7 кілаграмаў. Цягаў я яго роўна гадзіну, затое ўстанавіў свой рэкорд: злавіў шчупака вагой 7 кг на леску 0,12.

Мясцовы рыбак усё-такі дачакаўся, пакуль я выцягну гэтага шчупака, падплыў ушчыльную. І калі я паказаў, на якую леску выцягнуў яго, — не паверыў. Што ж, неверагодна, але факт.

Зматаўшы вуду, я паволі, стамлёны, паплыў да берага».

Алесь КАСЦЕНЬ.

г. Паставы.

КРАЙ раскрытых душ і дзвярэй

МОТАЛЬ-НАКОРМІЦЬ ЗАХОДНЮЮ ЕЎРОПУ І ЎСЮ БЕЛАРУСЬ

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 12 жніўня.)

Яшчэ напярэдадні, 9 жніўня, цэнтральная плошча былога мястэчка і адной з самых буйных вёсак на Беларусі стала нагадваць этнаграфічна-мастацкую экспазіцыю. Побач з пакрытымі чаротам павільёнамі ўзніклі сялянскія падворкі, басейн з востравам і лодкай, масткі, жартоўныя манекены, скульптуры, кампазіцыі з гародніны і кветак. Ну а ўжо раніцай у нядзелю практычна ўсе матыляне і жыхары навакольных вёсак, не задзейнічаныя на жніве, уладкаваўшы гаспадарку, пакінулі свае хаты і рушылі да галоўнага месца фэсту. Тут было чаму надзівіцца.

Паліцы хлебапякарні СВК «Агра-Моталь» ламаліся ад вырабаў невыказнай прыгажосці. Шмат'-ярусныя караваі, аздобленыя саладкімі карункамі з цеста, немагліва тонкай работы.

— Усю гэту прыгажосць зрабіла наша рукадзельніца Надзея Палто, — з гонарам паведамляе загадчыца магазіна пякарні Кацярына Паліенка.

А насупраць, ля рускай печы, над якой вялюцца вязанкі розных каўбас, завіхаюцца маладыя дзяўчаты ў вышытых кашулях — гэта супрацоўніцы вытворчага кааператыва «Моталь» раскладаюць свае духмяныя прысмакі для продажу.

Як зачараваныя, людзі спыняюцца ля павільёна фермерскай гаспадаркі «Мінюка». Тут прадумана ўсё да драбніц. Усё працае на тое, каб атрымаць эстэтычную асалоду, прадэманстраваць любоў да сваёй працы і высокі клас гаспадароў. Не проста рубленая хатка з палічкамі, збанкамі, падстрэшнікамі, завешанымі каўбасамі, сардэлькамі, кумпякамі, але і студня з жураўлём, скульптуры гусей, качак, чучала дзіка, жывыя трусы... І як доказ дынастычнай прыналежнасці да мяснога цэха — дыплом 1933 г. дзеда Стафана, які даваў яму права займацца мясной прамысловасцю і насіць тытул «mistrza Wedliniarskiego».

Моталь — вёска асаблівая. Тут жыве 4260 чалавек і працуе 1708 гаспадарак. Чатыры каўбасныя цэхі: тры прыватныя і адзін дзяржаўны, рыбны цэх і сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў — гэта «кіты», якія даюць і працоўныя месцы, і плацяць асноўную колькасць падаткаў у бюджэт. Але нямала і дробных прадпрыемстваў, майстроў-адзіночак і арцеляў. Мотальскі фэст увачавідкі паказаў, наколькі творчыя, адданыя людзі тут жывуць, наколькі яны багатыя ідэямі і натхнёныя.

— Вы бачылі, як яны зрабілі выставу насення бульбы? — спыняе мяне на мотальскай плошчы кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі БДУ Тадэвуш Наваградскі, эксперт кулінарнага конкурсу. — Ідзіце абавязкова паглядзіце, я такога ніколі не бачыў!

На высокай шмат'яруснай тарпе кошыкі з элітнымі гатункамі бульбы, інфармацыя пра кожны гатунак і мясцовыя прымаўкі. Прымаўкі, дарэчы, былі развешаны ўсюды: на сцэне, ля зёлак, на газонах, прылаўках. Насенне бульбы — прадмет гонару СВК «Агра-Моталь», які славіцца таксама вядомым у Беларусі сартам бульбы «Моталь». Ён і ляжаў на выставе, і ляжаў у кошыках, і ляжаў у кішэнях, і ляжаў у кішэнях, і ляжаў у кішэнях

Доктар адкажа

На гэтым тыдні дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

14 жніўня — галоўны ўрач 29-й мінскай гарадской паліклінікі Раіса Рыгораўна ЗВАНЕЦ.

15 жніўня — галоўны ўрач амбулаторыі агульнай урачэбнай практыкі № 2 Леанід Анатольевіч БАГДАНАЎ.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

19 жніўня:

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы ***Аляксандр Іванавіч КАРАНЕВІЧ.***

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Яраслаў Леанідавіч ПЕРАЛЫГІН.

26 жніўня:

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога процітуберкулёзнага дыспансэра Вольга Леанідаўна ГАРАНЮК.

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ігар Віктаравіч ЛАЗАРЧЫК.

ПАВЫШАЙЦЕ НІЗКІ ЦІСК...
ПАДЫМАЮЧЫ ЖЫЦЦЁВЫ ТОНУС

«У мяне няма сіл... Прайду 10 хвілін — і мне хочацца прысесці, круціцца галава... Калі доўга стаю, перад вачамі ўсё плыве... Мяне непакоіць галаўны боль, слабасць... Удзень пастаянна пазяхаю, санлівасць нейкая, а ноччу не магу заснуць... Што са мной?..»

Прычынай такога стану можа быць паніжаны артэрыяльны ціск (урачы называюць яго яшчэ артэрыяльнай гіпатэнзіяй).

Гіпатэнзія — зніжэнне артэрыяльнага ціску да мяжы, адчувальнай для чалавека. Велічыня такога зніжэння індывідуальная, але звычайна гэта ніжэй за 100/60 мм ртутнага слупка для мужчын і ніжэй за 95/60 мм — для жанчын. Пры гэтым паніжаецца тонус вянозных сасудаў, замаруджваецца цыркуляцыя крыві і як вынік — падае агульны тонус арганізма.

Гіпатонікаў можна падзяліць на дзве групы. У адных людзей паніжаны артэрыяльны ціск — варыянт індывідуальнай нормы, так званая фізіялагічная гіпатанія: з'яўляецца як вынік высокай трэніраванасці (у спартсменаў, балерын), служыць механізмам адаптацыі (у жыхароў высакагор'я, тропікаў). У такіх выпадках на фоне паніжанага ціску чалавек адчувае сябе цудоўна, у яго нармальная працаздольнасць, няма ніякіх скаргаў. У другой групе — людзі, у якіх артэрыяльная гіпатэнзія дыягнастуецца як самастойнае захворванне або як праява іншай немачы (напрыклад, вегетатыўнай сасудзістай дысфункцыі, сардэчнай недастатковасці, эндакрынных парушэнняў, цяжкага атручэння — усяго не пералічыць). Нярэдка схільнасць да гіпатаніі перадаецца ў спадчыну.

Для ўстанаўлення прычыны ўстойлівага паніжанага ціску лепш за ўсё прайсці агляд у тэрапеўта. Калі ж вы выпадкова выявілі ў сябе нізкі ціск і ён не прыносіць вам вялікіх турбот, то адразу павышаць яго, ужываючы «забойныя» па сіле медыкаментозныя прэпараты, не варта. Паспрабуйце спачатку перасіліць гіпатанію, прытрымліваючыся наступных нескладаных рэкамендацый.

Перш-наперш нармалізуйце рэжым працы і адпачынку: часцей гуляйце на свежым паветры, спіце не менш як 8 гадзін у суткі. Дарэчы, днём — калі ёсць магчымасць — таксама пажадана адпачыць з гадзінку.

Пачынайце дзень з гімнастыкі, якая стымулюе кровазварот. Лежачы ў пасцелі, круціце педалі ўяўнага веласіпеда, рабіце кругавыя рухі ступнямі, па чарзе падымайце і апускайце прамыя ногі і г.д. Увогуле, для гіпатоніка лепшае лякарства — гэта рух, а не ляжанне на канапе.

Каб пазбегнуць пацямнення ў вачах, галавакружэння, якія ўзнікаюць пры пераходзе з гарызантальнага становішча цела ў вертыкальнае (напрыклад, пры ўставанні з ложка), вучыцеся правільна ўставаць. Прачнуўшыся, не ўскоквайце адразу: крыху паляжыце, потым сядзьце, а затым ужо спусціце ногі і, абапіраючыся на крэсла, уставайце.

Надзвычай карысныя для падняцця агульнага тонусу водныя працэдуры — басейн, халаднаватыя душ, кантрасныя ванны. Можна патрэніраваць сасуды і ў лазні, толькі не злоўжывайце ёю.

Харчуйцеся лёгка, не пераядайце, не прапускайце прыёмы ежы (асабліва снеданне). Харчаванне павінна быць разнастайным, з дастатковым паступленнем у арганізм бялкоў, вітамінаў С і B_1 (арэхі, бабовыя, злакі, соя, агародніна, мяса, ржаны хлеб). Раніцай піце стымулявальныя напоі: моцны чай (лепш зялёны), каву, какаву, грэйпфрутавы або маркоўны сок. Добрымі танізавальнымі ўласцівасцямі валодаюць яблыкі (асабліва кіслыя гатункі), агрэст, абляпіха, журавіны, брусніцы, чорныя парэчкі, капуста, сельдэрэй, салата, настоі шыпшыны і рамонку. Біястымулятарамі з'яўляюцца мёд і матачнае малако: раніцай і вечарам прымайце (можна з чаем замест цукру) па 30—50 г мёду з дабаўленнем 1/4 чайнай лыжкі матачнага малака.

Дазваляйце сабе часцей расслабляцца. Духмяныя ванны, масаж не толькі знімуць стомленасць, але і нададуць энергіі і сіл.

Пастарайцеся пазбягаць сітуацый, з-за якіх можна страціць прытомнасць: не стойце ў чэргах, не злоўжывайце паездкамі на грамадскім транспарце, не стамляйцеся і не хвалюйцеся па дробязях.

Калі вы ўсё ж адчулі, што млееце, скажыце пра гэта любому чалавеку, які апынецца побач з вамі. Сядзьце, апусціўшы галаву як мага ніжэй паміж каленяў, а калі ёсць магчымасць — ляжце. Вярнуць прытомнасць дапамагае нашатырны спірт. Дабратворна дзейнічаюць у такіх выпадках і пары эфірнага алею. Бутэлечку з сумессю размарыну і камфары або мятным алеем паднясіце да носа — некалькі ўдыхаў звычайна дастаткова для аднаўлення прытомнасці. Калі крыху ачуняеце, пажадана выпіць шклянку моцнага салодкага чаю з лімонам.

І апошняе. Вазьміце за правіла сістэматычна змерваць ціск. Гэта дазволіць пазбегнуць непрыемных сюрпрызаў, а галоўнае — высветліць, што ўсё ж вам дапамагае: кантрасны душ, настойка жэньшэню або прагулка ў парку.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Добра сябе зарэкамендавалі пры лячэнні гіпатаніі травы і траўняныя зборы. Аднак перш чым пачынаць іх прыём, пракансультуйцеся з урачом.

- Плады шыпшыны (40 г), трава медуніцы (30 г), лісце крапівы (30 г), плады чорных парэчак (20 г), плады барбарысу (20 г). 2 ст. лыжкі сумесі заліць 400 мл кіпеню, настойваць 4 гадзіны, працадзіць, піць па 100 мл 3 разы на дзень да яды.
- Змяшаць траву зверабою, сунічнік, плады ядлоўцу, траву крывавіўніку, кветкі цыкорыі, плады шыпшыны. 3 ст. лыжкі сумесі заліць 3 шк. гатаванай вады і настойваць у тэрмасе. Прымаць па шклянцы 3 разы на дзень за 20 хвілін да яды.
- 1 ст. лыжку пладоў глогу заварыць шклянкай кіпеню, настойваць 2 гадзіны, працадзіць, прымаць па 2 ст. лыжкі 3—4 разы на дзень да яды.
- 20 г сухіх кветак і лісця чартапалоху заліваюць шклянкай вады, кіпяцяць на малым агні 10 хвілін, настойваюць 30 хвілін, працэджваюць і п'юць па 1 ст. лыжцы 3—4 разы на дзень.
- Плады тутавага дрэва (шаўкавіцы), у свежым выглядзе летам або мядовы (цукровы) сіроп з ягад зімой, — вельмі карысныя для аслабленага арганізму.
- У некаторых выпадках урач можа прызначыць спецыяльныя прэпараты з раслін-адаптагенаў, якія аказваюць агульнаўмацавальнае і танізавальнае ўздзеянне: настойкі аралія, жэньшэню, заманіхі, кітайскага лімонніку, экстракты леўзеі, радыёлы рожавай (залатога кораня), элеўтэракоку (дзікага перцу).
- Пастаянныя галаўныя болі, звязаныя з нізкім ціскам, можна паспрабаваць зменшыць настоем з піжмы, каляндры, пальыну, ваўчкоў і трыпутніку.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нашэнне пратэрмінаваных кантактных лінзаў можа прывесці да траўмавання рагавіцы вока

Нашэнне пратэрмінаваных кантактных лінзаў можа прывесці да траўмавання рагавіцы і пападання мікробаў на слізістую абалонку вока, расказаў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесар, доктар медыцынскіх навук, загадчык аддзела афтальмалагічнай дапамогі медыцынскага цэнтра МТЗ Мікалай Пазняк.

Паводле яго слоў, пры доўгім нашэнні краі лінзы дэфармуюцца і траўмуюць рагавіцу, павышаецца рызыка ўзнікнення кератытаў — запаленчых захворванняў рагавой абалонкі вока. Кератыты з'яўляюцца сур'ёзным захворваннем і могуць прыводзіць да ўстойлівага зніжэння зроку ў выніку ўтварэння памутнення рагавіцы, спаек у вобласці зрэнкі. У кожнага чалавека індывідуальная адчувальнасць да доўгага нашэння лінзаў, і таму кератыты ўзнікаюць не ў кожнага забыўлівага ўладальніка кантактных лінзаў. «І ўсё ж ва ўсіх лінзаў ёсць свой тэрмін эксплуатацыі — выкарыстанне лінзаў паўтора замест дапушчальных трох месяцаў можа мець сур'ёзныя наступствы для здароўя», — адзначыў Мікалай Пазняк.

Адказваючы на пытанні аб наступствах нашэння адной лінзы ў выпадку страты яе пары з камплекту, прафесар патлумачыў, што такое выкарыстанне лінзаў можа прывесці да парушэння бінакулярнага зроку — здольнасці адначасова дакладна бачыць выяву прадмета абодвума вачыма. Чалавек глядзіць на прадмет і бачыць яго і правым, і левым вокам. Затым атрыманыя абодвума вачыма выявы злучаюцца ў зрокавым аналізатары (кары галаўнога мозга) у адзін вобраз. «Пры нашэнні адной лінзы адно вока працуе горш за другое, мозг пачынае прымаць толькі больш моцны сігнал ад вока, якое лепш бачыць, і васткрыня зроку пагаршаецца», — сказаў Мікалай Пазняк.

Непажадана таксама спаць, не здымаючы лінзаў. Пры нашэнні лінзы кантакт рагавіцы з навакольным асяроддзем і без таго парушаецца. Каб кісларод праз лінзы праходзіў лёгка, іх робяць мяккімі, з утрыманнем да 80 працэнтаў вады. Тэарэтычна і практычна нядоўгі сон у кантактных лінзах не прынясе чалавеку адчувальнай шкоды, калі, вядома, уладальнік дрэннага зроку не практыкуе начны сон у лінзах пастаянна. Аднак грэбаванне важнымі правіламі карыстання лінзамі пры спалучэнні неспрыяльных фактараў з часам можа прывесці да сур'ёзных праблем са зрокам, падкрэсліў Мікалай Пазняк.

Вольга ШЭЛЯГОВІЧ, БЕЛТА.

Серпентарый

Гадзюка нападае толькі тады, калі яе заспелі знянацку

Цяжка ўтрымацца ў летні час ад спакусы назбіраць грыбоў, ягад, лекавых раслін. Дары лесу так і вабяць да сябе і гарадскі, і вясковы люд. Але гаспадарыць у лесе не толькі чалавек. Спрадвечныя насельнікі зялёнага дома таксама правамерна лічаць яго сваім. І не заўсёды сустрэча з імі на лясных сцяжынках можа скончыцца прыемным знаёмствам, асабліва калі не ведаць, як правільна паводзіць сябе з прадстаўнікамі лясной фаўны.

Рэдка хто не адчуе агіды і страху, пачуўшы ў хмызняку шыпенне ці ўбачыўшы імкліва мільганулую ў траву стракатую стужку. А між тым, маючы пэўныя ўяўленні аб асаблівасцях жыцця змяінага свету, можна без боязі працягваць свой ягаднагрыбны занятак.

За адказам на гэта пытанне мы звярнуліся да **навуковага супрацоўніка Інстытута заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Руслана НАВІЦКАГА.** І вось што ён паведаміў нам аб загадкавым царстве паўзуноў.

— У Беларусі сустракаецца тры віды змей: вуж звычайны, мядзянка звычайная і гадзюка звычайная. Першыя два для чалавека бяспечныя. А вось гадзюка — ядавітая. Яе спецыяльны апарат, які дазваляе кусаць, — гэта два зубы, размешчаныя ў ротавай поласці на паднябенні зверху. Прычым гэтыя зубы высоўваюцца і тады, калі гадзюка робіць выпад, каб напасці, яны могуць размяшчацца літаральна паралельна са змяіным целам. Аднак выстрэльваць яд яна не можа і скакаць не ўмее, бо ў яе вельмі слабая мускулатура, таму і выпады робіць усяго на адну трэць даўжыні свайго цела.

Спецыялісты вылучаюць тры формы гадзюкі: шэрую, чырванаватую (рубра) і абсалютна чорную (нігра). Шэрую і рубра можна распазнаць па зігзагападобнай паласе на целе. А вось нігра такога ўпрыгожання не мае. І таму вельмі проста пераблытаць чорную гадзюку і цёмнага вужа. Адзінае іх адрозненне — гэта жоўтыя вушкі на галаве ў вужа. Аднак герпетолагі не раілі б шукаць тыя вушкі, каб пахваліцца сваёй смеласцю, — можна ашукацца. Варыянт адзін — не лавіць.

Увогуле ў лесе чалавек павінен захоўваць пэўныя меры перасцярогі. Трэба ведаць, што гадзюка ніколі першая не нападае, яна нападае толькі тады, калі яе заспелі знянацку. Звычайна, пачуўшы чалавека, яна імкнецца схавацца. Зрок у яе слабы, і яна арыентуецца па смаку, пах не ўспрымае таксама. На паднябенні ў рэптыліі размешчаны дзве спецыяльныя ямачкі, куды прыкладаецца язык, якім яна бярэ пробу паветра, каб адчуць яго смак. Гадзюка вельмі добра адчувае вібрацыю зямлі. Калі вы падчас лясной вандроўкі вырашылі прысесці на купіну, лепей пастукайце вакол яе палкай, стварыце шум менавіта ўдарамі, папярэдзьце такім чынам змяю, каб тая знікла адсюль. Крык жа нічым не дапаможа — гадзюка практычна глухая.

Гэты паўзун распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Любімыя яго месцы — паўзабалочаныя, вільготныя ўчасткі пераходнага віду паміж лесам і балотам, лесам і лугам. Калі чалавек сустракаў у лесе па хадзе свайго руху некалькі змей, то ёсць верагоднасць таго, што ён знаходзіцца на тэрыторыі гадзючага паселішча. У такім разе лепей змяніць тып лесу: калі быў на балоце, выйсці, напрыклад, да сасняку. Варта прытрымлівацца і такіх правілаў. Не хадзіць па лесе басанож, не збіраць грыбы-ягады ў адкрытым абутку. Пры цікім паляванні патрэбны гумавыя боты, якія змяя ніколі не пракусіць. Калі сустрэлі гадзюку, абыдзіце яе бокам. І ні ў якім разе не біце яе палкай толькі таму, што яна вас напалохала. Між іншым, згодна з пастановай урада «Аб вядзенні паляўнічай гаспадаркі» за забойства звычайнай змяі, жабы належыць штраф у памеры аднаго мінімальнага заробку, за забойства чырванакніжнай мядзянкі — двух.

А калі змяя ўсё ж укусіла? Лепей за ўсё ў бліжэйшую гадзіну дабрацца да медыцынскага пункта, дзе будзе аказана спецыяльная дапамога. І хаця яд гадзюкі не смяротны для чалавека, засцерагчыся трэба адразу.

Калі вы ўпэўненыя, што ў вас няма ранак у роце, можна паспрабаваць адсмактаць яд. На месцы ўкусу ўтвараецца пухліна, таму лепей за ўсё ў гэты момант прыкласці лёд, іншы халодны прадмет, каб зменшыць пухліну. Не варта разразаць ранку, бо гэта будзе дадатковая траўма. І, хутчэй за ўсё, занясецца нейкая інфекцыя. На фоне ўкусу можа пайсці запаленне, утварыцца нагнаенне з усімі яго наступствамі.

Не пераціскайце канечнасць жгутом, бо павялічыцца канцэнтрацыя яду на месцы ўкусу. Нельга прымаць спіртное, якое ўзмоцніць хуткасць усмоктвання яду.

І галоўнае — не трэба нервавацца. Варта быць гатовым да таго, што недзе праз гадзіну стане распухаць і моцна балець месца ўкусу, пачне кружыцца галава, пацягне на ваніты, чалавек будзе знаходзіцца на мяжы страты прытомнасці. Аднак на працягу паўтары гадзіны гэтыя сімптомы знікнуць. На фоне такіх адчуванняў многае будзе залежаць ад самога чалавека. Трэба ўзяць сябе ў рукі (нічога смяротнага не адбудзецца), прысесці, папіць халоднай вады і абавязкова дабрацца да месца, дзе могуць аказаць медыцынскую дапамогу.

Вольга ШАЎКО.

ШТО ЯДЗІМ І КОЛЬКІ ТРАЦІМ?

Насельніцтва нашай краіны ўжывае на ўзроўні рэкамендаваных нормаў ці нават больш за іх бульбу, алей і цукар, блізка да нормы — хлеб, рыбу і рыбапрадукты, яйкі, недастаткова — малака і малочных прадуктаў, гародніны, пладоў і ягад. Пры гэтым краіна здольная цалкам забяспечыць патрэбы сваіх грамадзян у малацэ і малочных прадуктах, мясе і мясных прадуктах.

Паводле слоў дырэктара Інстытута сістэмных даследаванняў у агрампрамысловым комплексе НАН Беларусі Валерыя БЕЛЬСКАГА, скарачэнне ўжывання таго ж малака на душу насельніцтва можа тлумачыцца ў тым ліку цэнасным фактарам. З другога боку, і асабістыя падворкі, у якіх раней выраблялася палова аб'ёму сельскагаспадарчай прадукцыі, цяпер не адыгрываюць ранейшай ролі. Такая доля захоўваецца ўлік у адносінах да гародніны і ў першую чаргу бульбы. Па мяса і малако насельніцтва сёння ходзіць у магазін. Дарэчы, доля расходаў насельніцтва на прадукты харчавання зараз не перавышае 40 працэнтаў, але да развітых краін нам яшчэ далёка: там гэты працэнт — на ўзроўні 15—20. Праўда, апошні паказчык, сцвярджае Валерый Бельскі, можа і змяніцца. Усё ж такі за апошнія тры гады кошт харчавання вырас на 80 працэнтаў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗАГАРАЦЬ АЛЬБО КАТАЦЦА НА КАНЬКАХ?

Магілёўскі лядовы Палац спорту адкрыў сезон масавага катання.

Паводле традыцыі, адкрыццё сезона прыпадае на сярэдзіну лета, калі пачынае трэніроўкі хакейная каманда «Хімвалакно-Магілёў». Таксама ў гэты ж час адкрываюцца трэніровачныя зборы для юных хакеістаў: у лядовым палацы займаюцца хакеем 250 хлопчыкаў.

Цяпер могуць удосталь накатацца ўсе аматары канькоў. Штодня кіраўніцтва палаца аддае некалькі гадзін для масавага катання. Гадзіна задавальнення разам з пракатам канькоў каштуе 7 тысяч рублёў. І цёплае адзенне не спатрэбіцца: тэмпература паветра на крытым лядовым полі — 14 градусаў цяпла. Праўда, адзначаюць у лядовым палацы, дзеці і дарослыя пакуль аддаюць перавагу летнім забавам. Катацца на каньках прыходзіць дзесятак-другі чалавек. Натуральна, што большасць людзей у вольны час цяпер загарае, купаецца і ладзіць пікнікі ў лесе.

Паўнавартасны сезон масавага катання на каньках распачнецца ўжо ў сярэдзіне верасня: праўда, за тым часам аматары могуць трапіць на каток ужо толькі ў выхадныя дні, а колькасць людзей на ім будзе дасягаць 100—150 чалавек.

Ілона ІВАНОВА.

З КОЖНЫМ ГОДАМ У МІНСКУ НАРАДЖАЕЦЦА ЎСЁ БОЛЬШ БЛІЗНЯТАЎ

У першым паўгоддзі 2008-га ў сталіцы нарадзіліся 93 пары блізнятаў і адна тройня. Усяго за гэты перыяд у сталіцы з'явіліся на свет 8 913 немаўлят. Колькасць выпадкаў шматплоднай цяжарнасці расце з года ў год. Калі ў 2000-м у сталіцы з'явіліся на свет 112 двойняў і адна тройня, то ў мінулым — 206 і 4 адпаведна. Такую інфармацыю прадаставілі ў Мінскім гарадскім упраўленні статыстыкі.

Усяго ж пачынаючы з новага тысячагоддзя ў горадзе нарадзіліся 1 318 двойняў, 22 тройні і 1 чацвярня. Да слова, нараджэнне адразу чацвярых блізнятаў — рэдкая з'ява, прычым не толькі для нашай краіны. Па формуле амерыканскага вучонага Хелена адна чацвярня прыпадае на 729 тысяч родаў.

Кожны 47-ы мінчанін, які з'явіўся на свет у студзені—чэрвені гэтага года, аказаўся блізнюком. У мінулым годзе кожнае 46-е немаўлятка было з двайнятаў або трайнятаў, а ў 2006-м — амаль кожнае 45-е. Для параўнання, у тым жа 2000 годзе — толькі кожнае 67-е...

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

Інфарм-укол

Хада як лекі

Самы просты і натуральны від рухальнай актыўнасці — хада. Менавіта яна можа дапамагчы кожнаму з нас аднавіць кантакт з уласным целам.

З'яўляюцца ўсё новыя і новыя звесткі аб тым, які эфект мае рытмічны крок. Гарвардскі ўніверсітэт (ЗША) рэгулярна друкуе вынікі даследаванняў, якія пацвярджаюць, што хада пазбаўляе ад болю падчас менструацый, аблягчае працяканне цяжарнасці, здымае боль у ніжнім аддзеле спіны, з'яўляецца цудоўнай прафілактыкай дыябету, хваробы Альцгеймера і мігрэняў.

Хада пешшу — натуральная гімнастыка для міякарда і сардэчных сасудаў. За кошт пачашчэння сэрцабіцця сардэчная мышца скарачаецца часцей, у выніку да яе прылівае больш крыві. Але, у адрозненне ад бегу, хада не аказвае такой нагрузкі на суставы. Спецыялісты адзначаюць, што пры рэўматычных захворваннях абавязкова патрэбна правільна падабраная фізічная нагрузка: рух паляпшае крывацёк у галіне суставаў і перашкаджае дэгенератыўным змяненням у тканках. Хада з'яўляецца натуральнай прафілактыкай варыкознага пашырэння венаў. Скарачэнні мышцаў галёнкі падчас руху праціскаюць вянозную кроў уверх, за кошт чаго ўзмацняецца вянозны зварот крыві да сэрца.

Яшчэ адзін станоўчы эфект хады звязаны з яе ўплывам на нервовую сістэму: адступае дэпрэсія, паляпшаецца сон. Хада павышае выпрацоўку эндарфінаў. Амерыканскія даследчыкі прыйшлі да высновы, што паўгадзіны хуткай хады тры-пяць разоў на тыдні здольныя замяніць прыём антыдэпрэсантаў. Аздараўленчы эфект хады звязаны яшчэ і з тым, што на ступні знаходзіцца вялікая колькасць нервовых канчаткаў, звязаных з усімі сістэмамі арганізма.

Правільныя крокі

Каб умацаваць спіну і пазбавіцца ад наступстваў доўгага знаходжання ў адной позе, падчас хады варта звярнуць увагу на некалькі важных момантаў.

Галава і плечы. Каб пазбегнуць сутуласці, крыху прыўзніміце падбародак, зафіксуйце позірк на ўзроўні лініі гарызонту, — аўтаматычна распрамляецца спіна. Плечы расслабленыя і скіраваныя назад і ўніз.

Мышцы жывата. Каб падтрымліваць правільнае становішча корпуса, злёгку падцягніце жывот у накірунку ўнутр і ўверх.

Сцёгны. Самая распаўсюджаная памылка — імкнуцца крочыць як мага шырэй. Крокі павінны быць натуральнымі, не надта доўгімі і не надта кароткімі.

Рукі. Сагнутыя ў локцях рукі павінны размяшчацца блізка да рэбраў, рухацца ўперад-назад у адным рытме з крокам.

Ступні. Пры кожным кроку мякка апускайце на зямлю спачатку пятку і сярэдзіну ступні, а потым «перакочвайце» вагу цела да пальцаў, каб адштурхнуцца для наступнага кроку.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

КУПАЦЦА МОЖНА.

АЛЕ НЕ ПАЎСЮДНА...

У бліжэйшыя некалькі дзён сіноптыкі абяцаюць нам сапраўдную летнюю спякоту. Можна не сумнявацца, што многія беларусы правядуць гэты час на беразе рэк, азёраў і вадасховішчаў. Між іншым, колькасць вадаёмаў, купанне ў якіх забаронена спецыялістамі санэпідслужбы, перавышае на сёння ўжо пяць дзесяткаў.

Самая вялікая колькасць небяспечных для купання вадаёмаў размешчана на тэрыторыі Брэсцкай (18 зон адпачынку) і Мінскай абласцей (17 месцаў адпачынку). Аднак непасрэдна ў Брэсце ўсе пляжы для гараджан адкрытыя. У Гродне санітарныя ўрачы катэгарычна не раяць гараджанам купацца ў возеры Юбілейнае, у Віцебску — у раёне пляжа 30-годдзя ВЛКСМ на Заходняй Дзвіне, на пляжы тэхнікума сувязі на рацэ Лучоса, а таксама на рацэ Віцьба ў раёне плошчы Перамогі, у Гомелі — у зоне адпачынку, што ў Кастрычніцкім раёне, у Баранавічах — на вадаёме «Свяцілава», у Слуцку — у зоне адпачынку гарадскога пляжа.

У беларускай сталіцы забаронена купацца ў вадасховішчах «Дразды» (пляжы №№ 2, 5, 6, 7, 8), «Цна», Заслаўскім (пляжы №№ 2, 3, 4 і 5) і Камсамольскім возеры.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ВАРЫКОЗ: РЫЗЫКА І ПРАФІЛАКТЫКА

Па статыстыцы кожны пяты чалавек мае гэтую паталогію. Акрамя таго, у аднаго працэнта людзей варыкозная хвароба пераходзіць у хранічную стадыю з ускладненымі формамі, якія могуць быць рэальнай пагрозай для здароўя і жыцця чалавека. У прыватнасці, гэта ўтварэнне тромбаў у сасудах (тромбафлебіты) і трафічных язваў.

Аб варыкознай хваробе, метадах яе лячэння і прафілактыцы расказаў выконваючы абавязкі загадчыка першага хірургічнага аддзялення РНПЦ «Кардыялогія», урач-хірург Сяргей КАЗЛОЎ.

— Скажыце, калі ласка, Сяргей Ігаравіч, якія сімптомы могуць сведчыць аб тым, што ў чалавека развіваецца варыкозная хвароба?

— Адразу адзначу, што гэтая паталогія часцей сустракаецца ў жанчын і з'яўляецца наступствам гарманальнага дысбалансу ў арганізме, які прыводзіць да застою крыві ў нагах. Звычайна жанчыны звяртаюцца да спецыялістаў тады, калі над паверхняй скуры пачынаюць вымалёўвацца расшыраныя вены. Пацыентак на гэтай стадыі хваробы перш за ўсё хвалюе касметычны дэфект, а ў астатнім яны адчуваюць сябе часцей за ўсё нармальна і іх можа нічога больш не турбаваць. Аднак хутка з'яўляюцца такія сімптомы, як павышаная стомленасць ног, цяжкасць у нагах, асабліва ў канцы працоўнага дня, ацёчнасць галёнак і ступняў. Вось тыя праявы хранічнай вянознай недастатковасці, якія сустракаюцца на ранніх стадыях. З цягам часу, калі чалавек не лечыцца, нічога не робіць для таго, каб прадухіліць далейшае цячэнне захворвання, дадаюцца новыя сімптомы. Паступова пастаянны павышаны ціск крыві на тканкі выклікае і змяненні скураных покрываў вакол варыкозных венаў. Скура тут змяняе сваю афарбоўку, цямнее, становіцца шчыльнай, і ў гэтых месцах часта ўтвараюцца трафічныя язвы, якія лечацца вельмі цяжка і доўга. Яшчэ адно сур'ёзнае ўскладненне — тромбафлебіт. Пры апошнім у варыкозных вузлах пад уздзеяннем розных фактараў утвараюцца тромбы. Прычынай таму можа быць банальная траўма, на якую чалавек мог і не звярнуць увагі. Але ж сценка вены ўжо змененая, яна пашыраная, там ёсць замаруджванне току крыві, і любая траўматызацыя садзейнічае ўтварэнню тромбаў. Самае небяспечнае ўскладненне пры гэтым — тромбаэмбалія лёгачнай артэрыі, што можа закончыцца лятальным канцом.

— Якія фактары рызыкі існуюць для развіцця варыкознай хваробы?

— Практычна заўсёды ёсць спадчынная схільнасць да гэтай паталогіі. Рызыка павышаецца, калі нехта з родных меў варыкознае пашырэнне венаў. Часцей хварэюць жанчыны.

Мае значэнне і прафесійная прыналежнасць. Варыкоз пагражае людзям, чые спецыяльнасці звязаны з доўгім стаянням на нагах: настаўнікам, прадаўцам, урачам хірургічных спецыяльнасцяў і г.д. Але і праца седзячы таксама не дадае здароўя, бо асноўны памочнік венаў — гэта мышцы вакол іх. Калі мы рухаемся, ходзім, мышцы скарачаюцца, сціскаюцца, пашыраюцца і адпаведна дапамагаюць кровазвароту.

Фарміраванню варыкознага пашырэння можа садзейнічаць нашэнне цеснага адзення, што зараз вельмі модна ў моладзі. Пры гэтым абцяжарваецца кроваадцёк і ўзнікае залішні ціск на ніжнія ўчасткі вянознай сістэмы.

Высокія абцасы — таксама не сябра для венаў. Яно можа і прыгожа, калі жанчына ідзе на шпільках, але гэта не вельмі садзейнічае здароўю. У такі момант мінімальна нагружаюцца ікраножныя мышцы. У звычайным жа абутку пры хадзе ступня ўзнімаецца і апускаецца, г.зн. нага атрымлівае патрэбную нагрузку.

— Якія сучасныя метады лячэння варыкознай хваробы?

— Можна вылучыць некалькі такіх метадаў. Усе яны накіраваныя на ўхіленне залішняга ціску на тканкі з-за застою крыві ў вянознай сістэме ног.

Самы распаўсюджаны метад і ў большасці выпадкаў найбольш эфектыўны — гэта аператыўнае лячэнне. Пры ім варыкозныя вены выдаляюцца хірургічным шляхам. Робіцца гэта праз невялікія разрэзы. Пасля такой аперацыі чалавек можа ўставаць праз некалькі гадзін і потым знаходзіцца на амбулаторным лячэнні. У стацыянары пацыент можа правесці літаральна дзень-два. Усё залежыць ад таго, наколькі першапачаткова была выражана стадыя хваробы.

Другі метад — гэта склератэрапія. У прасвет вены шляхам ін'екцыі ўводзіцца прэпарат, які выклікае асэптычнае запаленне сценкі вены, у выніку адбываецца яе зліпанне і яна губляе свой прасвет. Але склератэрапія паказана не ўсім, акрамя таго яна можа прымяняцца ў спалучэнні з аперацыйным лячэннем.

Адным з кампанентаў лячэння можа быць эластычная кампрэсія, інакш кажучы — нашэнне медыцынскага эластычнага трыкатажу, які прадаецца ў аптэках. Гэта сучасны трыкатаж, які прыемна і эстэтычна выглядае. Пры нашэнні эластычнага трыкатажу ціск крыві змяняецца ад шчыкалаткі да верху. Ён дазіраваны: у вобласці шчыкалаткі — адзін, па падкаленнай ямкі — другі, вышэй ад калена — трэці. Такім чынам дасягаецца як бы выціскальны эфект: пры хадзе ў чалавека вены кампенсаваныя звонку, што не дае магчымасці сценцы вены расцягвацца.

На сёння нашэнне медыцынскага эластычнага трыкатажу лічыцца ў свеце адным з этапаў пажыццёвай тэрапіі хранічнай вянознай недастатковасці. Пасля аперацыі гэта мера з'яўляецца прафілактычнай. Да аперацыі, калі ў чалавека ёсць схільнасць да хваробы, мера носіць і лячэбны, і прафілактычны характар.

— Якія прафілактычныя мерапрыемствы могуць знізіць рызыку варыкознай хваробы?

— Калі вы працуеце седзячы або стоячы, неабходна рабіць невялікія перапынкі кожныя 40 хвілін. Падчас іх выконвайце практыкаванні, якія нагружалі б ікраножныя мышцы. Можна пагойдвацца з пяткі на насок, узнімацца на насочкі.

А калі працуеце седзячы, стаўце пад ногі невысокую лавачку. Гэта зменіць нагрузку на вены ног.

Адзенне не павінна пераціскаць у поясе, каб не парушаўся вянозны адцёк.

З розумам адносьцеся да падбору абутку, адмоўцеся ад штодзённага нашэння высокіх абцасаў. Абутак на высокіх абцасах абмяжоўвае скарачэнне ікраножных мышцаў і перашкаджае спружыніць суставам. У такой сітуацыі кроў у венах застойваецца.

На напаўненне венаў крывёй істотна ўплывае перапад тэмператур. Пры рэзкім павышэнні тэмпературы вены перапаўняюцца крывёй, і нагрузка на вянозныя клапаны ўзрастае, таму не варта прымаць гарачыя ванны, загараць і г.д. Кантрасныя працэдуры ўвогуле карысныя для сасудаў, але пры варыкозным пашырэнні да іх таксама трэба адносіцца з асцярожнасцю: перапад тэмператур не павінен быць вельмі рэзкім. Павялічваць кантраст можна толькі паступова.

Вельмі карысныя штодзённыя прагулкі хуткім крокам на працягу гадзіны, а таксама язда на веласіпедзе і плаванне. Пры прагулцы пехатой пазбягайце па магчымасці дарог з цвёрдым пакрыццём. Лепей за ўсё хадзіць па мелкаводдзі ўздоўж берага возера ці мора. Вельмі карысна абліваць халоднай вадой. Калі па начах вас турбуюць непрыемныя адчуванні ў нагах (аняменне, сутаргі, цяжкасць), зрабіце перад сном кантрасныя абліванні ног (2 хвіліны). Гэта можна рабіць звычайным душам.

Калі сядзіце, не закідвайце нагу на нагу, каб не пераціскаць сасуды ног і не замаруджваць кровацёк.

Падчас адпачынку ногі лепей за ўсё пакласці на стол ці іншае ўзвышэнне так, каб яны знаходзіліся вышэй за ўзровень сэрца. Можна таксама падняць ножкі ложка, каб падчас сну ногі займалі больш высокае становішча.

І яшчэ. Калі ў вас ёсць варыкознае пашырэнне венаў ці яно было ў вашым родзе, не зацягвайце з аперацыяй. Калі яна прызначана, то чым раней будзе зроблена, тым у меншым аб'ёме спатрэбіцца хірургічнае ўмяшанне.

Гутарыла Вольга ШАЎКО.

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Алена ДЗЕВОЙНА

РУБРЫКУ ВЯДЗЕ

УЛАСНАСЦЬ З АБМЕЖАВАННЯМІ

Адкажыце, калі ласка, на такое пытанне. Калі пераходзіць ва ўласнасць кватэра, якая пабудавана за кошт ільготнага крэдыту банка? У мяне такая сітуацыя. Мне 45 гадоў, я адзінокая. Пачынаю будаваць кватэру за кошт ільготнага крэдыту, які выплачу прыкладна ў 65 гадоў. Ці магу я да гэтага тэрміну завяшчаць пабудаваную кватэру, ці яна застаецца ўласнасцю банка?

Катоўская Е.Ф., г.Рагачоў

Долевае будаўніцтва кватэр з прыцягненнем грашовых сродкаў грамадзян ажыццяўляецца на падставе дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва. Правілы заключэння, выканання і скасавання дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15.06.2006 г. № 396 са зменамі і дапаўненнямі.

Згодна з пунктам 2 Правілаў, у адпаведнасці з вышэйназваным дагаворам забудоўшчык прымае на сябе абавязацельства забяспечыць будаўніцтва жылога і (або) нежылога памяшкання ў шматкватэрным жылым доме і па заканчэнні будаўніцтва і прыёмкі ў эксплуатацыю перадаць аб'ект долевага будаўніцтва ва ўласнасць дольшчыку, а дольшчык абавязваецца ўплаціць вызначаную дагаворам цану аб'екта долевага будаўніцтва і прыняць гэты аб'ект у парадку, устаноўленым дагаворам. Дагаворам прадугледжваецца, што дольшчык, у выпадку будаўніцтва кватэры з выкарыстаннем субсідый або прыцягненнем ільготнага крэдыту і іншых формаў дзяржаўнай падтрымкі, абавязаны прадаставіць забудоўшчыку дакументы, якія гэта пацвярджаюць (рашэнне мясцовага выканаўчага і распарадчага органа (арганізацыі) аб наяўнасці субсідыі, выдзяленні льготнага крэдыту).

Пунктам 12 Правілаў, а таксама дагаворам, які заключаецца з дольшчыкам, прадугледжваецца парадак і тэрміны перадачы аб'екта будаўніцтва ва ўласнасць дольшчыку. Згодна з Правіламі, на працягу двух месяцаў з дня ўводу шматкватэрнага жылога дома і іншых аб'ектаў нерухомасці ў эксплуатацыю пасля дзяржаўнай рэгістрацыі стварэння гэтых дома і аб'ектаў нерухомасці і пры ўмове поўнай уплаты дольшчыкам цаны дагавора забудоўшчык абавязаны перадаць дольшчыку дакументы, неабходныя для афармлення права ўласнасці на аб'ект долевага будаўніцтва. Пасля дзяржаўнай рэгістрацыі такога права забудоўшчык павінен перадаць дольшчыку аб'ект долевага будаўніцтва, камплект ключоў ад жылых (нежылых) памяшканняў гэтага аб'екта, дакументы на ўстаноўленае абсталяванне.

Дольшчык павінен не пазней трох месяцаў з дня атрымання ад забудоўшчыка дакументаў, неабходных для афармлення права ўласнасці на аб'ект долевага будаўніцтва, ва ўстаноўленым парадку аформіць на сябе гэта права.

З моманту дзяржаўнай рэгістрацыі права ўласнасці дольшчыка на аб'ект долевага будаўніцтва і атрымання ім ключоў і дакументаў на ўстаноўленае абсталяванне абавязацельства забудоўшчыка па перадачы аб'екта ва ўласнасць дольшчыка лічыцца выкананым. Абавязацельства дольшчыка па дагаворы лічыцца выкананым з дня ўплаты ў поўным аб'ёме грашовых сродкаў у адпаведнасці з дагаворам.

Калі дольшчык разлічыўся за пабудаваную кватэру з дапамогай прадастаўленага яму льготнага крэдыту, кватэра таксама пераходзіць яму ва ўласнасць у вышэйадзначаным парадку, аднак яна будзе знаходзіцца ў залогу (іпатэкі) у банка і на распараджэнне ёю будуць накладзены абмежаванні, прадугледжаныя заканадаўствам.

Так, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.04.2000 № 185 са зменаннямі і дапаўненнямі па стане на 10.07.2008 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў» (падпункт 1.17) прадугледжана, што будуемыя (рэканструюемыя, набываемыя), а таксама пабудаваныя (рэканструяваныя, набытыя) жылыя памяшканні знаходзяцца ў залогу (іпатэцы) у адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк». Пры гэтым права залогу ўзнікае ў банка з моманту заключэння адпаведнага крэдытнага дагавора і спыняецца ў выпадках спынення крэдытнага дагавора, гібелі заложанага жылога памяшкання або звяртання на яго спагнання залогатрымальнікам у парадку, вызначаным заканадаўствам.

Падпунктам 1.19 гэтага Указа ўстаноўлена, што продаж жылых памяшканняў, іх частак (калі адбыўся раздзел жылога памяшкання), а таксама доляў у праве ўласнасці на гэтыя жылыя памяшканні, пабудаваныя (рэканструяваныя) або набытыя з прыцягненнем ільготнага крэдыту:

— да яго поўнага пагашэння не дапускаецца;

— на працягу трох гадоў з дня пагашэння гэтага крэдыту можа ажыццяўляцца адпаведнаму раённаму, гарадскому, раённаму ў горадзе выканаўчаму і распарадчаму органу ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Пры адмове гэтага органа ад куплі жылога памяшкання (яго частак, доляў у праве ўласнасці), пабудаванага з прыцягненнем ільготнага крэдыту, продаж, дарэнне альбо абмен указанага жылога памяшкання на працягу трох гадоў з дня пагашэння гэтага крэдыту ажыццяўляецца ў выключных выпадках (пераезд у іншую мясцовасць, скасаванне шлюбу, смерць уласніка жылля і да т.п.) з дазволу дадзенага выканаўчага і распарадчага органа. Да пагашэння льготнага крэдыту рашэнне гэтага органа аб дарэнні альбо аб абмене такога жылога памяшкання можа прымацца толькі са згоды адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк» у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

На права завяшчаць пабудаваную з прыцягненнем ільготнага крэдыту кватэру вышэйпералічаныя абмежаванні не распаўсюджваюцца. Але калі на момант адкрыцця спадчыны (смерці спадчынадаўца) крэдыт не будзе поўнасцю пагашаны, спадчыннiку неабходна будзе ўзгадняць з банкам умовы атрымання кватэры ў спадчыну.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

ДЛЯ ПАЛЯЎНІЧЫХ ЁСЦЬ ДВА ВАРЫЯНТЫ ЗАМЕНЫ ПАСВЕДЧАННЯ

«Падкажыце, калі ласка, калі трэба мяняць дзяржаўнае пасведчанне на права палявання? Шчыра кажучы, я ўжо і не памятаю, калі яго атрымліваў, ды і на паляванне шмат гадоў не выбіраўся. А тут з адкрыццём сезона палявання на вадаплаўную і балотную птушку сусед літаральна «завёў» мяне сваімі першымі поспехамі…»

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, тэрмін дзеяння дзяржаўнага пасведчання на права палявання — 10 гадоў з моманту выдачы. Для замены пасведчання па заканчэнні тэрміну яго дзеяння паляўнічаму неабходна звярнуцца ў мясцовы орган Міністэрства лясной гаспадаркі (дзяржаўныя лесагаспадарчыя прадпрыемствы — лясгасы, дзяржаўныя вытворчыя лесагаспадарчыя аб'яднанні — ДВЛГА, АРУП «Белдзяржпаляванне»). Туды неабходна прадаставіць шэраг дакументаў. Па-першае, заяву (афармляецца пры падачы дакументаў), па-другое, пашпарт, па-трэцяе, даведкі аб адсутнасці ўліку ў наркалага і псіхатэрапеўта (трэба памятаць, што тэрмін дзеяння даведак — тры месяцы). Далей трэба мець каляровыя фатаграфіі (3х4, без вугалка) — дзве штукі; квітанцыі аб аплаце (атрымальнік плацяжу — АРУП «Белдзяржпаляванне», р/р 3012000005262 у ААБ «Беларусбанк», код 795, УНП 101435427): за дзяржаўнае пасведчанне на права палявання — 35 тысяч рублёў (1 базавая велічыня), за картку ўліку парушэнняў і аплаты дзяржпошліны — 17,5 тысячы рублёў (0,5 базавай велічыні). Прадастаўляецца квітанцыя аб аплаце дзяржаўнай пошліны на права палявання — 35 тысяч рублёў (1 базавая велічыня). Яна патрэбна пры адсутнасці адзнакі ў картцы ўліку парушэнняў і аплаты дзяржпошліны або квітанцыі аб яе аплаце. Аплата дзяржпошліны на права палявання дзейнічае на працягу года з моманту аплаты.

Далей магчымы два варыянты замены дзяржаўнага пасведчання на права палявання. Першы, калі паляўнічы падае дакументы на замену і здае ранейшае пасведчанне з наступнай выдачай новага (тэрмін вырабу новых дакументаў — да 1 месяца). Другі варыянт, калі паляўнічы падае дакументы на замену, а старое пасведчанне застаецца ў яго на руках да заканчэння тэрміну яго дзеяння з наступнай заменай на новае.

Напрыканцы варта нагадаць на ўсялякі выпадак, што паляванне без дзяржаўнага пасведчання на права палявання, а таксама з дзяржаўным пасведчаннем, у якога скончыўся тэрмін дзеяння, забараняецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ну і «Ню»!

Што можа больш уразіць мужчыну, чым выява прыгожай жанчыны, тым болей, калі яна без адзення? У Віцебску адкрылася выстава з традыцыйнай для такога жанру мастацтва назвай «Ню». Цікава, што сярод дваццаці аўтараў ёсць і жанчыны.

Узрост мастакоў, якія дэманструюць свае творы, розны — ад 20 да 75 гадоў. Усяго прадстаўлены 30 работ мясцовых мастакоў, у тым ліку і праект «Бодзі-арт». Ёсць і сімвалічныя скульптуры. Чаго толькі няма — і ўсё прысвячаецца прыгажосці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АДМЫСЛОВЫ СЛОЎНІК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Кожная мова мае ў сваім складзе пэўную колькасць слоў, якія не могуць быць перададзеныя на іншай мове аднаслоўна, а толькі з выкарыстаннем апісальных канструкцый. Лічыцца, што менавіта такія лексічныя адзінкі (безэквівалентная лексіка) найбольш канцэнтравана перадаюць «дух» кожнай мовы і наўпрост выяўляюць нацыянальную карціну свету. Асабліва важна гэта ва ўмовах беларуска-рускага двухмоўя, калі носьбіты мовы павінны ўсвядомлена карыстацца пэўнымі словамі, а не бяздумна нагрувашчваць іх у пэўных камунікатыўных сітуацыях.

Даследчыкі адзначаюць і яшчэ адзін момант: словы, у семантыцы якіх канцэнтравана закадаваны сэнс цэлай фразы, выяўляюць дзеянне закона эканоміі моўных сродкаў. Сапраўды, як трэба ўспрымаць беларускія словы маладзік, знічка, прочкі, кавальства, зашмат, замалы, даўнавата, бліжэць і інш.? Растлумачыць іх, напрыклад, па-руску можна толькі апісальнымі выразамі, а яны, выкарыстаныя ў беларускай мове, будуць яскрава сведчыць пра няведанне аўтарам яе глыбінных пластоў і залішняе расходаванне моўных высілкаў (напрыклад, "прыйсці ў заняпад" замест заняпасці, "у мінулым годзе" замест летась).

Аўтар «Слоўніка беларускай бязэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні)» — вядомая даследчыца беларускай мовы, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук Ірына Шкраба — не адзін год рупліва збірала адметныя беларускія словы. Першы слоўнік падобнага кшталту «Самабытнае слова» быў выдадзены ў 1994 годзе і ўключаў толькі каля 900 слоў. Новае ж выданне, ахыццёўленае выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», змяшчае ўжо прыкладна 2000 лексічных адзінак, ужыванне якіх грунтоўна праілюстраванае прыкладамі з твораў мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Мяркуем, шаноўная даследчыца і надалей будзе шчыраваць над збіраннем падобнай лексікі, бо з упэўненасцю можна сказаць: такіх слоў — безліч.

Напрыканцы не ўтрымаемся ад спакусы паказаць хоць яшчэ некалькі гэтых залацінак беларускай мовы: абапал, бляха, вырай, глыбець, не дакупіцца, екатаць, жаўцяк, завіхацца, камяніца, леснічоўка, мур, найперш, папахадзіць, разьбярства… І, безумоўна, кнігарня, куды трэба як найхутчэй праставаць, каб не апынуцца без такога цікавага і патрэбнага даведніка.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ.

29 августа 2008 г. в 7 часов 30 минут

состоится внеочередное Общее собрание акционеров ЗАО «Возвышенность» по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, конференц-зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчуждение СООО «Итора» принадлежащих ему акций.

С документами Общества, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться в приемной Генерального директора ежедневно, с 9.00 до 17.00, кроме выходных и праздничных дней.

Форма проведения собрания: **очная.** Форма голосования по всем вопросам повестки дня: **прямая, открытая.** УНН 100088694.

ОАО «Минский приборостроительный завод»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже недвижимости, расположенной в г. Минске по пр. Независимости, 58: комплекса зданий корпусов №№ 19, 19а, 40, общей площадью 7 045,3 кв. м.

Начальная цена продажи — **21 058 920 000** рублей РБ с НДС.

Задаток в размере 2 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится 21 августа 2008 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Заявления и необходимые документы принимаются до 17.00 20 августа 2008 г. по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58, ком. 603.

Справки по тел. 8 017 293 94 40, факс 8 017 331 41 97.

Бобровичский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 5 (пяти) земельных участков для индивидуального жилищного строительства: **Лот — 1** — земельный участок в деревне Голубы, площадь участка 0,1822 га, кадастровый номер 622082603101000015, начальная цена 2733000 белорусских рублей (р. Першайка, р. Ислочь, лес); **Лот — 2** — земельный участок в деревне Голубы, площадь участка 0,2500 га, кадастровый номер 622082603101000016, начальная цена 3750000 белорусских рублей (р. Першайка, р. Ислочь, лес); **Лот — 3** — земельный участок в деревне Голубы, площадь участка 0,2355 га, кадастровый номер 622082603101000017, начальная цена 3532500 белорусских рублей (р. Першайка, р. Ислочь, лес); **Лот — 4** — земельный участок в деревне Яцково — Корчемные, площадь участка 0,1953 га, кадастровый номер 622082609601000014, начальная цена 2929500 белорусских рублей (р. Ислочь, рядом лес); **Лот — 5** — земельный участок № 1 в деревне Бобровичи, площадь участка 0,1474 га, кадастровый номер 622082601101000139, начальная цена 3685000 белорусских рублей (агрогородок). Все участки расположены в 70 км от г. Минска.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется в Главное управление МФРБ по Минской области РБ, **р/с 3600614040063** в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, **УНП 600037371**, назначение платежа **04901**, Бобровичский сельский исполнительный комитет. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 19 сентября 2008 года в 11.00 по адресу: д. Бобровичи, ул. Заречная, 2, зал заседаний.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 17 сентября 2008 г. до 17.00 по адресу: д. Бобровичи, ул. Заречная, 2, кабинет секретаря.

Контактные телефоны: (8 01772) 37635, 37636

Бенинский сельский исполнительный комитет Новогрудского района Гродненской области

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь. **Аукцион состоится 15 сентября 2008 г. в 10.00 по адресу: д. Бенин Новогрудского района Гродненской области, здание сельского Совета.** К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, подавшие заявления с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке задаток. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по вышеуказанному адресу по рабочим дням с 13 августа 2008 г. по 12 сентября 2008 года включительно с 8.30 до 17.30. На аукцион выставляется земельный участок: кадастровый номер 424382002101000030, расположен по адресу: Гродненская область, Новогрудский район, Бенинский сельский Совет, деревня Ляховичи-2. Площадь — 0,2075 га. Целевое назначение — для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов. Начальная цена — 39620 белорусских рублей. Размер задатка 3960 белорусских рублей. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой земельно-кадастровой документации и размещением извещения в средствах массовой информации. Задаток перечисляется в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота до подачи заявления на счет бюджета Бенинского сельского исполнительного комитета 3600521010001 в ОАО «Беларусбанк» г. Новогрудок код 698 УНП 500563252, код назначения платежа 04901. Получатель ГУМФ по Гродненской области. Осмотр земельного участка, выставляемого на аукцион, проводится по мере необходимости. Подробную информацию о земельном участке можно получить в сельисполкоме, **контактный телефон 8 01597 94723, 8 01597 94732.**

Для участия в аукционе необходимо представить: заявление об участии в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка; гражданином — копию документа, содержащую его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителям гражданина — нотариально удостоверенную доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Внесение победителем аукциона платы за земельный участок производится в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка.

Бяспека дзіцяці ў руках бацькоў

Па 15 жніўня сталічная Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць прафілактычную акцыю «Дзеці-пасажыры», бо ў апошні час павялічылася колькасць выпадкаў траўмавання і гібелі дзяцей у салоне транспартных сродкаў.

— Дзіцячы дарожна-транспартны траўматызм, як і дзіцячая наркаманія і бездагляднасць, — вялікая сацыяльная трагедыя, — пераканаць **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Савецкага РУУС горада Мінска, капітан міліцыі Вольга СУВОРАВА.** — Асноўная прычына нешчаслівых здарэнняў з дзецьмі-пасажырамі ў тым, што бацькі рызыкуюць перавозіць сына ці дачку без дзіцячага ўтрымлівальнага крэсла.

Няхай і ваша дзіця будзе ў бяспецы.

— Дастаткова ўзгадаць «свежы» выпадак, — **гаворыць Вольга Суворава.** — Маці, знаходзячыся на прэднім пасажырскім сядзенні, трымала на руках свайго чатырохгадовага сына. Пры рэзкім тармажэнні аўтамабіля хлопчык ударыўся аб пярэднюю панэль прыбораў і ў выніку атрымаў траўму. Усё магло скончыцца больш трагічна… Але **Правілы дарожнага руху забараняюць перавозіць дзяцей на каленях у пасажыра на прэднім сядзенні легкавога аўтамабіля.**

Яшчэ адну павучальную для бацькоў гісторыю расказаў **інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр ГУЗАЎ:**

— Маладая жанчына перавозіла трохмесячнага сына на заднім сядзенні аўтамабіля ў люльцы. Хлопчык заплакаў, маці адвярнулася назад, каб паглядзець, што здарылася з малым. У выніку страціла ўвагу, выехала на палосу сустрэчнага руху і сутыкнулася з другім аўтамабілем. Люлька звалілася з сядзення, і хлопчык атрымаў траўму ў цемянной вобласці чэрапа.

Надзея ДРЫЛА.

Увага!

Забараняецца перавозіць дзяцей да 12 гадоў на пярэднім сядзенні легкавога аўтамабіля пры адсутнасці спецыяльнага дзіцячага ўтрымлівальнага прыстасавання (сядзення), а таксама на заднім сядзенні матацыкла. Пры перавозцы дзяцей да 12 гадоў на заднім сядзенні легкавога аўтамабіля рэкамендуецца выкарыстоўваць спецыяльнае дзіцячае ўтрымлівальнае прыстасаванне (сядзенне).

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 24 (592)

аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

Лазня памерам 6,2 х 4,0.
Тэл.: 8 02137 391 49, 8 029 892 13 51.

Кватэра 2-пакаёвая ў Мінску па вул. Асіпенкі.
Тэл.: 8 017 233 33 40, маб. 325 67 07.

Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, маецца тэлефон, гараж у райцэнтры Гарадок, танна.
Тэл.: 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

Дом памерам 6 х 8, можна пад знос у в. Галынь Навагрудскага раёна.
Тэл.: 8 01597 71 479, 253 35 69.

Дом драўляны з г/п, гараж, склеп, 0,48 га зямлі, прыродны газ, тэлефон, 15 км ад Стоўбцаў, добрыя транспартныя зносіны.
Тэл. 8 029 98 06 177.

Зруб 6 х 4, крыты шыферам, усе будматэрыялы, вокны, дзверы.
Тэл. 8 029 590 61 86.

«Нісан-Прымера» 1993 г.в., чырвоны, хэтчбек, 1,6 б у добрым стане, 3000 у.е. Торг. Тэл. 8 029 752 01 49.

Бульбакапалка 2-радковая, навясная, лідская. Вуллі для пчол, электрапліта.
Тэл.: 8 01792 55 725, маб. 961 02 68.

Цэгла чырвоная, ёмістасць на дзве тоны.
Тэл. 8 01794 39 603.

Культыватар навясны КП-4 да МТЗ ці Т-40, плуг да Т-25.
Тэл. 8 029 291 48 49.

Прычэп, трактар Т-16, з/ч да ЮМЗ.
Тэл. 673 91 38.

Вокны драўляныя, двайныя, новыя з каробкай і фурнітурай памерам 1,2 х 1,2, 6 шт.
Тэл. 8 029 144 14 13.

Плуг і капалка да трактара Т-25.
Тэл. 8 029 316 05 36.

Плуг 3-корпусны, культыватар.
Тэл. 8 029 551 83 30.

Скутар «Мустанг», новы, 49,5 см куб., 1300 у.а.
Тэл. 605 80 20.

Халадзільнік «ЗІЛ-Масква», 1964 г.в., у рабочым стане, цана сімвалічная.
Тэл. 8 01562 3 28 69.

Добрыя козы, племянны козлік шасцімесячны.
Звяртацца: Смалявіцкі р-н, в. Жажэлка, вул. Зарэчная, 18.

КУПЛЮ

Энцыклапедычны слоўнік «Кіно» 1986 г.
Тэл. 8 029 117 31 97.

РОЗНАЕ

Мняню 3-пакаёвую кватэру (60 км ад Мінска) на кватэру ў г. Узда ці Мінску без даплаты.
Тэл. 8 029 870 71 57.

Мняню 4-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Слуцку на 2-пакаёвую ў Мінску.
Тэл.: 8 01795 25 156, маб. 947 34 34.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

Суд Цэнтральнага раёна г. Мінска просіць паведаміць усе вядомыя звесткі, у тым ліку аб месцы знаходжання, у адносінах да **Вабішчэвіча Васіля Аляксеевіча,** 7 снежня 1958 года нараджэння, зарэгістраванага па адрасе: г. Мінск, вул. Нававіленская, д. 3, кв. 25, апошняе месцазнаходжанне — г. Мінск, вул. Нававіленская, д. 3, кв. 25. Гэтыя звесткі неабходна паведаміць суду па адрасе: г. Мінск, вул. Кірава, 21—206 (тэл./факс: 226 01 81, 226 02 48) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Курганскага Эдуарда Іванавіча,** 10 кастрычніка 1930 года нараджэння, ураджэнца вёскі Завод, Жлобінскага раёна, Гомельскай вобласці, апошняе месца жыхарства: г. Жлобін, вул. Чапаева, д. 15, які ў 1969 годзе выбыў за межы Рэспублікі Беларусь і яго месцазнаходжанне невядома. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Курганскага Э.І., паведаміць іх суду Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Страховой полис обязательного страхования ответственности владельцев транспортных средств на территории стран-членов системы «Зеленая карта» серии BY/12 № 2037990 считать недействительным.

Калектыў супрацоўнікаў факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, былога выкладчыка журфака БЕЛЕНЬКАГА Ілі Іванавіча і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім.

Народная энцыклапедыя

ПАЧАТАК ВЯСЕЛЛЯ Ў ХАЦЕ НЯВЕСТЫ

Следам за Сонцам або супраць яго

Пераважная большасць рытуальных дзеянняў вясельнага абраду падпарадкоўвалася «залатому» правілу народнай культуры: любое перамяшчэнне жаніха і нявесты, а таксама асноўных вясельных чыноў (хросных бацькоў, дружыны маладых, свату) павінна было адпавядаць накірунку руху галоўнага касмічнага свяцілы — Сонца.

Калі жаніх і нявеста развіталіся з роднай хатай перад вянчаннем, то бацькі абводзілі іх вакол стала толькі па ходу гадзіннікавай стрэлкі (што ў сучасным прачытанні якраз і адпавядае нябеснаму руху свяцілы). У адпаведнасці з гэтым правілам, вясельны картэж рухаўся ад хаты да храма таксама ў тым жа накірунку. Зразумела, што вяртанне маладых дадому і першы пасад іх за сумесны святочны стол таксама падпарадкоўваўся той самай старадаўняй завядзёнцы. Таму яшчэ раз нагадаем, што як толькі маладыя перастуняць парог роднай хаты, бацька павяжа іх рукі крыж-накрыж ручніком і павядзе знітаваную ў адзінае цэлае пару за стол у накірунку злева направа. Што абодва нябесныя свяцілы, што пара заручаных маладых утваралі гарманічную цэласнасць і пракладвалі свой Млечны шлях па зямлі. Некалі мы гаварылі пра тое, што першая вясковая вуліца, як правіла, паўтарала Гусіны Шлях на небе, а надалей гэты светапаглядны прынцып ляжаў у аснове не толькі ўсёй міфапаэтычнай спадчыны беларускага народа, але і ў пераважнай большасці земляробчых і сельскагаспадарчых клопатаў.

Уважлівыя чытачы могуць запярэчыць: аўтары ўвесь час імкнуцца праводзіць паралелі паміж архаічнай язычніцкай традыцыяй і каштоўнасцямі праваслаўнай культуры і пераконваюць у тым, што ў славянскай душы яны сусіснуюць гарманічна, дапаўняючы адна другую. Аднак у дадзеным выпадку ўзнікае пэўная супярэчнасць або мы сутыкаемся з выключэннем з агульнапрынятых правілаў: сёння ў царкве падчас вянчання маладых абводзяць вакол аналоя супраць руху сонца, або справа налева. Каб зразумець гэту супярэчнасць, неабходна звярнуцца да недалёкай гісторыі Рускай праваслаўнай царквы. У 1666-1667 гг. была праведзена так званая Ніканаўская рэформа, якая ўнесла істотныя змены ў правілы і нормы жыцця Праваслаўнай царквы. Так, напрыклад, у дарэформенны перыяд існавала двухперсная крышчэнне, якое сімвалізавала двуякую прыроду Хрыста — чалавечую і Боскую. Патрыярх Нікан уводзіць крышчэнне трыма пярстамі, якое павінна было ўвасабляць святую Тройцу — Бога Айца, Бога Сына і Святога Духа. Тады ж было прынята рашэнне аб тым, што Пасхальны хрэсны ход і абвядзенне маладых вакол аналоя будуць заменены на «супрасалонь», г. зн. у накірунку, зарыентаваным супраць руху Сонца.

За вясельным сталом гамана

Для таго, каб прадоўжыць апісанне самага важнага этапу святочнай урачыстасці — вясельнага застолля, — неабходна яшчэ раз звярнуцца да фундаментальных светапоглядных асноў, прынцыпаў і рэгламентацый традыцыйнай культуры ўсходніх славян, якія датычаць агульнай сімволікі стала, асаблівасцяў яго пабудовы, правілаў паводзінаў удзельнікаў і прынцыпаў пасадкі за святочным сталом вясельных чыноў, сваякоў і іншых гасцей, а таксама наяўнасці на ім асноўных рытуальных страў.

У традыцыйнай культуры беларусаў, рускіх і ўкраінцаў сярод астатніх прадметаў побыту стол займаў асобнае месца. У непарыўнай сувязі з чырвоным кутом ён з'яўляўся своеасаблівым сакральна-магічным, рытуальна-абрадавым і маральна-этычным цэнтрам сямейна-родавай светабудовы, увасабленнем дабрабыту (багаты стол — сімвал заможнасці гаспадароў) і духоўнасці (за стол не садзіліся, не памаліўшыся і не перахрысціўшыся) сям'і, сімвалізаваў ее адзінства і перспектыву жыватворнага працягу на ўвесь чалавечы век. Выключна высокі сацыяльны і культурны статус стала сфарміраваў вакол яго бязмежную колькасць самых розных па характары прадпісанняў і строгіх рэгламентацый, якія павінны былі засведчыць павагу да яго і асабівасці паводзінаў за ім. Так, напрыклад, адным з галоўных правілаў святкавання Калядаў было абавязковае патрабаванне, якое тычылася ўсіх членаў сям'і: на працягу двух тыдняў за сталом павінны былі збірацца ўсе члены сям'і. Тады, у адпаведнасці з архаічнымі ўяўленнямі, сям'я пражыве ў поўным складзе ўвесь год.

Пераважны статус стала ў абрадавай прасторы хаты пераняла і пацвердзіла і хрысціянская культура. У структуры храма ёсць асаблівае рытуальнае месца, якое атрымала назву пра-стол, г. зн. самы галоўны стол у абрадавай прасторы гэтага прыходу. У шматлікіх тэкстах народных замоў прысутнічае ключавы матыў прастола як месца Боскай прысутнасці: «Первым разам, добрым часам. Прашу Госпада Бога і Духа Святога. Стаіць касцёл, а ў касцёле прыстол, а за прыстолам Ісус Хрыстос сядзіць, крыжычак дзяржыць. З таго краста выступала раса. Маць Прачыстая расіцу збірала, раба Божага Міхаіла ўцірала, сурокі ўнімала».

У традыцыйнай культуры ўсходніх славян стол даволі часта выступаў тым рытуальным атрыбутам, на якім (а часам і пад якім) праводзіліся шматлікія рытуальныя дзеянні. Тут жа ў вялікія святы з дапамогай шматлікіх варожбаў адбывалася спецыфічнае «падключэнне» да інфармацыйнага канала Вечнасці, у памяці якой захоўваюцца звесткі аб долі ўсіх тых, хто жыве на Зямлі. Таму ў адносінах да стала ў народнай культуры і былі выпрацаваны вельмі многія патрабаванні і маральна-этычныя нарматывы.

● Адно з «залатых правілаў народнай культуры» патрабавала, каб стол, дакладней — яго паверхня, на якой непасрэдна і адбывалася «суразмоўе» з Нябёсамі, заўсёды быў засланы чыстым абрусам. У адваротным выпадку «голы» стол немінуча пагражаў дому «галотай», няшчасцямі. Прычым вельмі строга сачылі за тым, якім бокам засланы абрус: адваротны, «левым» бокам абрус засцілалі толькі па памінках, якія сімвалізавалі выключанасць сям'і са святочна-абрадавага жыцця вёскі.

● Уважліва сачылі і за тым, каб на стале не знаходзіліся пабочныя і, як лічылася, не бясшкодныя прадметы. Перш за ўсё гэта абмежаванне тычылася нажа. Ён сімвалізаваў дзяльбу цэлага на часткі, а гэта пярэчыла асноўнай ідэі беларускіх застолляў — аб'яднаваць.

● На стол нельга было класці грошы: яны асацыяваліся не толькі з заможнасцю, дабрабытам, багаццем, але і з варожасцю, сваркамі, непаразуменнямі. Стол, за якім абедае сям'я, — гэта жыватворная пупавіна прадстаўнікоў аднаго роду, а грошы, якія пабывалі ў руках розных людзей і ўвабралі ў сябе не самыя лепшыя думкі-пачуцці, не клалі на стол, каб не наклікаць нечаканую бяду.

● Забаранялася пакідаць на стале ключы — можаш хутка пакінуць свой дом і апынуцца там, дзе чалавека замыкаюць «на ключ» — за кратамі; грэбень — каб не балела галава, шапку — можна страціць усё багацце і пайсці з «шапкай у руцэ па свеце».

● Самым лепшым знакам дабрабыту і дастатку ў сям'і быў хлеб, які пастаянна павінен быў прысутнічаць на стале. «Калі свайго хлеба край, то і пад кустом рай», — пераконвае нас беларуская прыказка. Бабуля аднаго з аўтараў пастаянна трымала на стале бохан хлеба, загорнуты ў саматканы льняны ручнік.

● Ад людзей сталага ўзросту ў розных куточках Беларусі нам даводзілася чуць наступную параду: «Калі вы хочаце, каб у вашай хаце заўсёды былі мір і ўзаемапаразуменне, каб вы ніколі не пасварыліся са сваімі гасцямі, на стол, які вы пачынаеце сервіраваць, перш за ўсё пакладзіце бохан непачатага хлеба і толькі затым стаўце прыгатаваныя стравы».

● З прыходам хрысціянства стол сталі параўноўваць з Божым прастолам, а гэта ў сваю ч

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + лабірынт (9 жніўня). Па гарызанталі: Бульба. Радок. Румба. Час. Дроб. Кюсю. Апад. Хром. Рата. Мост. Мандрыл. Апаш. Абак. Сліва. Імага. Шалі. Сілал. Крылоў. Краты. Хек. Салома. **Па вертыкалі:** Унікум. Асака. Ішым. Юхт. Авал. Спалох. Аэрадром. Іўе. Марш. Колас. Іск. Бард. Амір. Драч. Парабала. Араты. Агат. Клас. Дал. Калыханка. **У лабірынце:** 1. Алімпіяда. 2. Могул. 3. Бервяно. 4. Гандбол. 5. Ракіроўка. 6. Баскетбол. 7. Пекін. 8. Дэльтаплан. 9. Перакладзіна. 10. Бег. 11. Марафон. 12. Стадыён. 13. Секундамер. 14. Трэнер. 15. Гарадкі. 16. Пенальці.

Кубак Перамогі для АЛІМПІЙЦАЎ — 18 тысяч запалак і бутэлька шампанскага

Аляксандр Бендзікаў прысвячае свой новы рэкорд беларускім спартсменам, якія бяруць удзел у Пекінскай Алімпіядзе.

У Кнігу рэкордаў Гінэса запісаны ўжо чатыры рэкорды магіляўчаніна: ён будаваў неверагодныя канструкцыі з даміно, манет і накрывак ад піўных бутэлек.

Новы рэкорд — піраміда з запалак, якая трымаецца на корку бутэлькі шампанскага. Запалкі з 350 карабкоў укладзены ў сотню слаёў, а першы з іх складаецца толькі з дзвюх запалак.

Праўда, гэта ўжо другая піраміда. Першая раптоўна разбурылася, калі было пакладзена 14 тысяч запалак. Аляксандр — чалавек цярплівы, ён улічыў памылкі першай канструкцыі і пабудаваў другую, якая стаіць з 5 жніўня.

— Я назваў канструкцыю Кубкам Перамогі, каб нашы алімпійцы заваявалі яшчэ болей медалёў, — патлумачыў Бендзікаў.

Цяпер Аляксандр з цікавасцю глядзіць трансляцыі з Пекіна і традыцыйна падтрымлівае каманды Беларусі і Расіі. Гаворыць, што перажывае за ўсіх і жадае ўпартасці, цярплівасці і ўдачы, каб было як мага больш спартыўных перамог.

Сам Бендзікаў на свой новы рэкорд працаваў увесь свой законны водпуск. Гэтыя 36 дзён адпачынку ён некалькі гадзін асцярожна клаў запалкі. Аляксандр — машыніст кацельнага абсталявання на Магілёўскай ЦЭЦ-1. Выкладанне незвычайных канструкцый, што складаюцца з мноства частак, а трымаюцца, напрыклад, на рабрыне манеты альбо адной «костачцы» даміно, — гэта любімае хобі, якім магілёвец займаецца з 1994 года. Адзіны даход ад такога хобі — удзел у тэлевізійных праектах, дзе Бендзікаў здзіўляў публіку і выйграваў прызы.

— Крохкасць маіх канструкцый — як сутнасць нашага быцця, — філасофствуе рэкардсмен Кнігі рэкордаў Гінэса. — Як усё ў свеце трымаецца на малым, а троху страсяне — і разбурыцца. Каб пабудаваць — патрэбна вялікая цярплівасць, каб збераглы — ашчаднасць.

Падрабязней пра рэкорды Аляксандра Бендзікава можна даведацца на інтэрнэт-сайце: **www.ginesrec.narod.ru**

Ілона ІВАНОВА.

«ВАСЬМЁРКАВАЯ» ВЫСТАВА

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі праходзіць выстава твораў яго дырэктара Уладзіміра Пракапцова, прымеркаваная да 55-годдзя знанага майстра пэндзля, лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне». Аўтар палотнаў зрабіў усё, каб надаць мерапрыемству незвычайную адметнасць, у прыватнасці, абыграў для гэтага дату нараджэння — 8 жніўня. Вернісаж адбыўся 08.08.08 у 8 гадзін 8 хвілін, прэзентаваныя 8 карцін, створаных за апошнія 8 гадоў, а доўжыцца выстава будзе 8 дзён 8 гадзін і 8 хвілін. Таму ёсць магчымасць пазнаёміцца з мастацкімі палотнамі, па нескаланых матэматычных падліках, да суботы 16 жніўня, калі ў 16 гадзін 16 хвілін адбудзецца закрыццё выставы.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.45	20.43	14.58
Віцебск —	5.30	20.37	15.07
Магілёў —	5.35	20.33	14.58
Гомель —	5.36	20.25	14.49
Гродна —	6.00	20.57	14.57
Брэст —	6.06	20.53	14.47

Месяц

Першая квадра.

Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Васіля, Веніяміна, Еўдакіма, Івана, Мікалая, Сяргея, Юрыя.*

К. *Алены, Дзіяны, Іпаліта, Максіма, Яна.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+20...+22°C	КІЕЎ	+32...+34°C	РЫГА	+24...+26°C
ВІЛЬНЮС	+23...+25°C	МАСКВА	+22...+24°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+18...+20°C

Дзве даты

13 жніўня

Сёння — Міжнародны дзень ляўшы, які быў абвешчаны ў 1984 годзе па ініцыятыве Міжнароднай канфедэрацыі ляўшэй.

1913 год — 95 гадоў таму нарадзіўся выдатны беларускі кампазітар, народны артыст Беларусі, прафесар Анатоль Багатыроў. Адзін з заснавальнікаў беларускай нацыянальнай оперы. Сярод яго самых вядомых твораў — оперы «У пушчах Палесся», «Надзея Дурава», кантаты «Беларускім партызанам», «Беларусь», араторыя «Бітва за Беларусь» і інш.

1961 год — была ўзведзена Берлінская сцяна. Гэтае збудаванне даўжынёй 45,1 км адразу стала сімвалам «халоднай вайны».

Цытата дня:

Цытата дня: «Экзамен добрага выхавання ў мужчыны і жанчыны — іх паводзіны ў час сваркі».

Джордж Бернард Шоў (1856—1950), англійскі драматург.

На конкурс апавяданняў

Якія розныя твары вайны адкрываюцца нам і праз 63 гады пасля яе заканчэння. І праз час цені нябожчыкаў не перастаюць змагацца за аднаўленне чалавечнасці і справядлівасць. І нябожчыкі перамагаюць, караюць нягоднікаў, як сведчыць пра гэта Антон Піліпчык.

Віктар КАЗЬКО.

Антон ПІЛІПЧЫК

КАМПЕНСАЦЫЯ

Займаўся ранак. Баўгрык усхапіўся ў пасцелі ўстрывожаны, узмакрэлы…

…Брудная, валасатая, з кручкаватымі кіпцюрамі рука цягнулася да яго і вось-вось гатова была схапіць. Вядома ж, каб адабраць… еўра. Ён не даваўся. Урэшце адчуў за спінаю нешта халоднае, гулкае… І ў страху прачнуўся.

Усё яшчэ не верачы, што гэта быў сон, Баўгрык ліхаманкава абмацаў вакол сябе ложак — нідзе ніякай той пачварнай рукі!?.. А халодным і гулкім, раптам зразумеў, з'яўлялася шафа, да боку якой і туліўся ягоны бярлог і аб якую ён, відаць, у сне бэхаўся.

«А што калі я і сапраўды ратаваўся?» — абдала ўсяго гарачыня.

Вечарам, пакуль зусім не змарыў сон, Баўгрык тое і рабіў, што разглядваў, лічыў і пералічваў еўра — кампенсацыю за работу ў Нямеччыне ў час вайны.

«А, можа, пакуль я дрыхнуў, то нехта і ўцёрся ў маё жытло? Ды яшчэ, во, і задушыць хацеў… Трэба ж было мне пакінуць валюту на відавоку?» — у жаху Баўгрык ніяк не мог выблытаць з прасціны сваю здаровую нагу, каб уперціся ёю ў падлогу, а пасля апусціць з ложка і непаслухмяную пакалечаную ды хутчэй дацца да стала і ўпэўніцца, што ўсе еўра на месцы. Праўда, стосік каляровых паперак Баўгрыку быў выразна бачны і з ложка. У памяці ўсплылі родная вёска, твары Гэлькі і Сцёпкі. Па целе разліўся холад…

Гэлька Баўгрыку падабалася як ні адна дзяўчына на свеце. Выглядала аднакласніца, нібы прынцэса. Але ж яна ні ад кога не ўтойвала сваёй закаханасці, як сама казала, па самыя вушы, у Сцёпку. А той таксама быў у затлуменні ад яе.

Яны перад самым пачаткам вайны паканчалі па дзесяць класаў. З ліку аднагодкаў, ды і ўвогуле з усёй моладзі ў вёсцы, калі іх край акупавалі немцы, толькі адны і засталіся. Захопнікі, лічы, усіх дачыста — ад малалеткаў да сталых мужчын і жанчын — павывозілі ў Германію. А шмат каго і без дай прычыны панішчылі.

Немцы ў іх паселішчы ўчынялі аблавы аж чатыры разы. Гэлька падчас іх як скрозь зямлю правальвалася. А Сцёпка проста не знаходзіўся дома. «У лесе, жук. Да партызанаў бегае!» — здагадваўся Баўгрык. А самога яго, з пакалечанаю яшчэ ў маленстве праваю нагою, акупанты ў першую ж адпраўку ў Нямеччыну схопленых прызналі непрыгодным для Вялікай Германіі.

— Вэк, вэк! — крычаў нямецкі афіцэр, выштурхоўваючы дулам карабіна з шарэнгі.

Тыя, хто апынуўся ў фашысцкіх кляшчах, Баўгрыку, бясспрэчна, пазайздросцілі. Сам жа ён адчуў сябе рыбінай, выкінутай хвалямі на пясок, — бач, нават чужаземцы яго гідзяцца, не толькі Гэлька. У той момант, здалося, ён ненавідзіць увесь свет. Бо, каб яго ўзялі ў Нямеччыну, ён, пэўна ж, стаў бы там важным чалавекам. У вучобе яму ў класе не было роўных. Аднак толькі Гэлька такім яго ўпарта не прызнавала. Заўжды вострая на язычок, яна, неяк асабліва не шкадуючы, плюхнула масла ў агонь, калі Баўгрык усё роўна, як цень, дзень пры дні валачыўся за ёю:

— Няўжо ты, а яшчэ выдатнік вучобы зрэнаў, ды не разумееш, што Сцёпка мне быў, ёсць і будзе харошы, і болей, знай, аніхто! Асабіста з табою я ніколі не стану знацца. Не для цябе жыву!

А пасля таго, як немцы не ўзялі Баўгрыка ў Германію, Гэлька не прамінула яшчэ дадаць:

— Ты б на сябе, нягоднік, паглядзеў. Фрыцы вунь і тыя камісавалі…

Пякучым, неадольным гэта захраснула ў ягонай душы.

…«Я, злыдзень чортаў, перашкодзіў шчасцю Гэлькі і Сцёпкі, загубіў іх маладыя жыцці… Ды і сваё, што там казаць, таксама змарнаваў. І з-за чаго, каб хто запытаў? Усяго толькі з-за таго, што Гэлька не мяне кахала… Што нялюбы ёй быў… Плюнуць трэба было на такую, а я пёрся на ражон… А зараз во яшчэ і на гэтую чарвівую кампенсацыю паквапіўся… Захацелася, бачыш, дармовых грошай…» — Баўгрык абвёў позіркам стосік еўра і рашуча адсунуў ад сябе, раптам адчуў: сціснула ў грудзях, часцей застукала сэрца. У думках Баўгрык вяртаўся ў злашчасныя ваенныя гады: «Дурны ж я быў, як няведама што!.. Не стрываў Гэльчыных кпінаў, пачаў помсціць ёй, настукаў немцам, што яе каханак Сцёпка звязаны з партызанамі, што ноччу, бывае, наведваецца дамоў….»

Сцёпку праз дзён колькі фашысты высачылі і спрабавалі захапіць жывым. Ім у рукі юнак не даўся. Застрэлілі. Застрэлілі і Сцёпкаву маці. Для Гэлькі складанасці не было здагадацца, чыйго розуму гэта была справа, і свой боль, крыўду і нянавісць — усё разам яна пры першым жа выпадку абрушыла на Баўгрыка:

— Юда!.. Халуй фашысцкі!.. Не думай, што табе ўсё так мінецца. Быць не можа, нашы хутка вернуцца. Ты за Сцёпкаву смерць заплаціш… Ды і сама я яшчэ раней звяду цябе са свету… Гніда паскудная!

Ён выдаў немцам і Гэльку. А сам пачаў прасіць акупантаў, каб яго забралі на работу ў Германію. Выкленчыць адпраўку было няпроста. З яго напачатку ўдосталь паздзекаваліся. Паказвалі, як ён крывою сваёю нагою, калі ідзе, палёвае па зямлі.

Ды Баўгрык стаяў на сваім. Перад нямецкім афіцэрам нават пусціўся ў скокі. І той перад ягонай настырнасцю ўрэшце не ўстаяў, паспрыяў яму.

У Нямеччыне Баўгрыка прыстроілі на паўпадземны ваенны завод. Праціраў нечым, падобным на рыззё, гатовыя для адпраўкі на фронт процітанкавыя снарады, укладваў іх у скрынкі. Гаспадары за работу пахвальвалі:

— Гут! Гут! — паляпвалі па плячы. — Жыть будеш. І корошо.

Ён, канешне, і надта «корошо» жыў. Валяўся на галюткіх нарах, адлежваючы бакі, спіну. Наядаўся так, што пуза аж лопалася: падавалі акрайчык счарсцвелага чорнага-чорнага хлеба ды адна-дзве збольшага патоўчаныя бульбінкі плавалі ў неадцэджаным варыве. Часам здавалася, што не, не выстрымае, сканае — ці прама на рабоце, ці аднойчы проста не прачнецца. Ён маліў Бога, каб той паслаў яму імгненную смерць — ягоныя пакуты тады, маўляў, скончацца, а на той свет з ім пойдзе і віна за абарваныя жыцці Гэлькі, Сцёпкі і маці аднакласніка. Віна, якая тут, у хвалёнай Нямеччыне, пакутлівымі прыступамі апустошвала, руйнавала душу жорстка, няшчадна.

Над заводам тым часам усё часцей і часцей галасілі сірэны паветранай трывогі, недзе зусім блізка вухкалі авіяцыйныя бомбы.

Неўзабаве пасля дзёрзкага авіяналёту савецкіх самалётаў ад зброевага завода засталіся адны руіны. Пад імі шмат хто з астарбайтэраў, ды і немцаў, знайшоў свой вечны спачын. А каму пашанцавала ўсцерагчыся, разбегліся хто куды. Баўгрык таксама ўцалеў і падаўся ў вандроўкі па ахопленай з-за набліжэння савецкіх войскаў панікай і неразбярыхай Нямеччыне. Праз дзён колькі ён натрапіў на юнакоў і дзяўчат з беларускіх мясцін. З імі, настаў час, і вяртаўся ў цягніку дамоў. Перасякалі савецкую граніцу — ад чырвонаармейцаў дачуў, што давязуць усіх да Мінска, а там будуць даznавацца: пры якіх абставінах, чаму апынуўся ў Германіі? Баўгрык ураз скеміў, як для яго асабіста можа ўсё павярнуцца, і цвёрда вырашыў: «Дзе-небудзь на равароце з вагона непрыкметна выслізну і далей дамоў рушу пешшу, а заяўлюся ў вёску — ці пан ці прапаў, як той казаў». Так ён і зрабіў.

У даволі густа населенай да вайны роднай вёсцы Баўгрык застаў толькі пяток сівенькіх, сплаканых па вынішчаных фашыстамі родных і блізкіх, бабулек ды не лепшую і сваю маці, якая, безумоўна ж, бясконца абрадавалася вяртанню сына, але і не на жартачкі напалохалася.

— Рана ці позна, сынку, улады разбяруцца, што ты самахоць паехаў да немцаў. І як піць даць, заастрожаць. Век не выберашся з турмы… А яшчэ — і родныя Гэлькі і Сцёпкі табе галаву размозджаць, прападзеш за сабаку. І ў каго ты толькі ўдаўся! Бацька ж твой быў акуратным чалавекам. Як жа нам цяпер будзе жыць сярод людзей?.. Думаеш, пайшла б за цябе Гэлька? Сцёпка ёй па-ўсякаму лепш падыходзіў. Табе сваю роўню шукаць трэба было…

Баўгрык не папарыўся дома і адных сутак. Па дамаганні маці пад раніцу падаўся да матчынага брата пад Гродна, куды таго яшчэ на пачатку саракавога года паслалі на ўмацаванне кадраў на вызваленай з-пад улады польскіх паноў беларускай тэрыторыі. Выправаджаючы сына ў дарогу, сплаканая, учарнелая жанчына даводзіла:

— Там усяго перад самай вайною было ўсталявана савецкае права. І цябе, можа, бог дасць, ніхто і не зачэпіць. А мой брат, каб знаў, не абы-які чалавек! Давераны ў камуністаў. Калі што, можа, як-небудзь выгарадзіць, уратуе…

Дзядзька, мужчына пажылы і адзінокі — жонка, паведаміў ён Баўгрыку з парога, у вайну ад тыфу памерла, — калі пляменнік прызнаўся, чаму ў сваёй вёсцы заставацца яму немагчыма і нават небяспечна, спачатку ўзбунтаваўся:

— А навошта ж мне, дарагія сваячкі, ды такі ваш клопат?! Дзе ж твой розум быў? Чым ты думаў? Ты, хлопча, мусіць ні таго… — ты-цаў ён сабе ў скроні пальцам і нілася сэрца да Гэлькі. Боль і журба авалодвалі яго істотай у такія моманты. І чым бы Баўгрык ні апраўдваў сябе за ўчыненае некалі ў вайну ў адносінах да зненавідзеўшай яго дзяўчыны, яе і свайго аднакласніка Сцёпкі, нічога ў яго не выходзіла. Настаўнік геаграфіі ў замкнутасці, халасцяком так і дарабіў да пенсіі. А потым, паколькі яму ўсё ніяк не знаходзілася замена, яшчэ цэлых адзінаццаць гадоў вучыў дзяцей…

…І вось спачатку проста загаварылі, а потым і афіцыйна праз друк паведамілі, што былым ос-

Ён, канешне, і надта «корошо» жыў. Валяўся на галюткіх нарах, адлежваючы бакі, спіну. Наядаўся так, што пуза аж лопалася: падавалі акрайчык счарсцвелага чорнага-чорнага хлеба ды адна-дзве збольшага патоўчаныя бульбінкі плавалі ў неадцэджаным варыве. Часам здавалася, што не, не выстрымае, сканае — ці прама на рабоце, ці аднойчы проста не прачнецца. Ён маліў Бога, каб той паслаў яму імгненную смерць — ягоныя пакуты тады, маўляў, скончацца, а на той свет з ім пойдзе і віна за абарваныя жыцці Гэлькі, Сцёпкі і маці аднакласніка. Віна, якая тут, у хвалёнай Нямеччыне, пакутлівымі прыступамі апустошвала, руйнавала душу жорстка, няшчадна.

Над заводам тым часам усё часцей і часцей галасілі сірэны паветранай трывогі, недзе зусім блізка вухкалі авіяцыйныя бомбы.

Неўзабаве пасля дзёрзкага авіяналёту савецкіх самалётаў ад зброевага завода засталіся адны руіны. Пад імі шмат хто з астарбайтэраў, ды і немцаў, знайшоў свой вечны спачын. А каму пашанцавала ўсцерагчыся, разбегліся хто куды. Баўгрык таксама ўцалеў і падаўся ў вандроўкі па ахопленай з-за набліжэння савецкіх войскаў панікай і неразбярыхай Нямеччыне. Праз дзён колькі ён натрапіў на юнакоў і дзяўчат з беларускіх мясцін. З імі, настаў час, і вяртаўся ў цягніку дамоў. Перасякалі савецкую граніцу — ад чырвонаармейцаў дачуў, што давязуць усіх да Мінска, а там будуць даznавацца: пры якіх абставінах, чаму апынуўся ў Германіі? Баўгрык ураз скеміў, як для яго асабіста можа ўсё павярнуцца, і цвёрда вырашыў: «Дзе-небудзь на равароце з вагона непрыкметна выслізну і далей дамоў рушу пешшу, а заяўлюся ў вёску — ці пан ці прапаў, як той казаў». Так ён і зрабіў.

У даволі густа населенай да вайны роднай вёсцы Баўгрык застаў толькі пяток сівенькіх, сплаканых па вынішчаных фашыстамі родных і блізкіх, бабулек ды не лепшую і сваю маці, якая, безумоўна ж, бясконца абрадавалася вяртанню сына, але і не на жартачкі напалохалася.

— Рана ці позна, сынку, улады разбяруцца, што ты самахоць паехаў да немцаў. І як піць даць, заастрожаць. Век не выберашся з турмы… А яшчэ — і родныя Гэлькі і Сцёпкі табе галаву размозджаць, прападзеш за сабаку. І ў каго ты толькі ўдаўся! Бацька ж твой быў акуратным чалавекам. Як жа нам цяпер будзе жыць сярод людзей?.. Думаеш, пайшла б за цябе Гэлька? Сцёпка ёй па-ўсякаму лепш падыходзіў. Табе сваю роўню шукаць трэба было…

Баўгрык не папарыўся дома і адных сутак. Па дамаганні маці пад раніцу падаўся да матчынага брата пад Гродна, куды таго яшчэ на пачатку саракавога года паслалі на

доўга ім круцію. Але хутка астыў: — А можа, твая маці і мае рацыю. Дасць Бог, і сапраўды пранясе… Пляменнік ды пляменнік прыехаў, няма дзе жыць, а ў мяне во дом пустуе… Так вось буду казаць… Можа, дасць Бог, на якую работу з цягам часу ўваб'ешся… Ну, а калі што… Дык што тады ўжо, хлопча ты мой, паробіш… А да маці каб і не марыў рыпнуцца. Няхай там у вёсцы думаюць: забралі ў Германію ды забралі…

У прыпадваючага на адну нагу незайздроснага на выгляд юнака на новым месцы — ішоў час — ніхто і ні пра што не пытаўся. Усяго толькі тады, калі Баўгрык стаў падшукваць сабе работу, пацікавіліся: а што ж з нагою? Расказваў, як яно было на самой справе:

— Малым з ровара вобзем бразнуўся і, вось, адна атопа не вытрымала…

Як меўшага за спіною дзесяцігодку ды скончышага яе яшчэ з адзнакай, Баўгрыка, нечакана для яго самога, прызначылі настаўнікам у пачатковую школу. А пазней накіравалі на вучобу ў так званы паскораны педінстытут. Адвучыўшыся ўстаноўлены тэрмін і атрымаўшы дыплом выкладчыка геаграфіі, ён зноў заявіўся да дзядзькі. Той якраз чуўся вельмі кепска. Праз месяцы тры і памёр, паспеўшы сказаць пляменніку, што і ягонай маці ў жывых ужо няма, але каб ён усё роўна ў сваю вёску не пёрся, і што цяпер усё тут — і дом, і што ў ім ёсць — належыць яму. Дзядзька, аказваецца, яшчэ да вяртання Баўгрыка з вучобы пабываў у сельсавеце і перапісаў нерухомасць і маёмасць на яго…

Міналі потым год за годам — толькі паспявай лічыць. Працавець у школе Баўгрыку падабалася. Клопаты з дзецьмі неяк прытупляліе тое, у чым ён быў вінаватым, яно паволі адыходзіла. Жыў увесь час адзін. Шанцу ажаніцца, лічыў, у яго няма. Часам, праўда, падлоўліваў сябе на тым, што ніяк не можа пазбавіцца пачуццяў, якімі некалі поўтарбайтарам Германія вырашыла выплаціць кампенсацыю. Звяртацца па яе ці не — аб гэтым Баўгрык думаў не адзін дзень. «Не ў мора ж ад дажджу мне кінуцца, — разважаў ён. — Запішуся, а возьмуць ды ператкрасуць маё ваеннае мінулае, і шыла з мяшка возьме вытыркнецца. Тады што?.. Суд? — ад усведамлення магчымасці такога павароту вочы быццам засціла туманам. — Ды не! Да гэтага, пэўна, не дойдзе, — бадзёрыўся і заспакойваў сябе. — Мне ж ужо, як той казаў, плюс-мінус восемдзесят… Толькі размоў, калі што выплыве на паверхню, тады ўсялякіх хопіць — у мех усё не ўтопчаш… Але дзе ж яно выплыве? СССР няма. Германія ўз'яднаная. Хто ведае, чаго дзе шукаць?» Кола ягонага жыццёвага млына міжволі адкручвалася назад, у той самы дзень, калі прама з урока яго выклікалі ў кабінет дырэктара школы.

З-за дырэктарскага стала на яго глядзеў сталы, з нейкім надта засяроджаным тварам, чалавек у цывільным, а не ў форме вайскоўца, як таго чакаў Баўгрык. Моўчкі паказаў яму на крэсла насупраць. Чамусьці ўсміхнуўся і спытаў:

— Вы нічога не маеце паведаміць органам?

— Аб чым гэта вы? — пасмялеў Баўгрык.

— У сваёй аўтабіяграфіі вы ўказалі, што былі вывезены ў Германію. Пры якіх акалічнасцях гэта адбылося? — «асабіст» другое сваё пытанне прагаварыў павольна, матанонна.

— Папаў пад аблаву…

— А як, дзе?

— Дзе ж, у сваёй вёсцы…

— Я не памыляюся, у вас нешта з нагою? Калі былі ў Германіі, штосьці здарылася? — падобнага пытання Баўгрык чакаў і не чакаў, адказваў спакойна:

— Не!.. Я траўміраваўся ў гадоў шэсць… Няўдала вучыўся ездзіць на веласіпедзе…

— М-да! А немцы — што? Яны ж звычайна такіх не бралі на работы… — Баўгрык скеміў, куды хіліць «асабіст» і, да канца не даслухаўшы, чаго дамагаецца той, пачаў гаварыць дзе праўду, дзе хлусіць.

«Асабіст» маўчаў, атрымлівай асалоду — ці што? — ад часам відавочнай разгубленасці Баўгрыка, якую, канешне ж, улоўліваў. Прыціснуты цяжарам нахлынуўшага раптам клопату, «падследчы» насцярожана чакаў новага пытання. Нейкім унутраным бачаннем раптам ён злавіў, як слізганўў па ягоным твары позірк работніка «органаў». Ён замёр у чаканні чарговага пытання.

— М-да! Калі ўсё было так, як вы расказваеце, то… — чалавек як выціскаў з сябе: — Карацей кажучы… Ну, ідзіце, праводзьце ўрок!

Устаючы жвава і адначасова нервова з крэсла і баючыся, не дай Бог, пахіснуцца ці за што зачапіцца, Баўгрык, між іншым, падумаў: «А пра Сцёпку, пра Гальку то ж ані слова не спытаў?!.» Вяртаючыся з успаміну пра тое трывожнае нядоўгае дазнанне ў дырэктарскім кабінеце, Баўгрык выдыхнуў рэзка: «А! Правераны ж я, выходзіць. Пра іншае мне зараз і думаць не варта, як толькі афармляцца на кампенсацыю. Даюць — трэба браць! Лішнімі грошы ці ж хоць каму і калі былі?»…

…Баўгрык як рашуча адсунуў новенькія еўра, гэтаксама і прыгроб іх да сябе. Узяў у рукі, пачаў тасаваць і тасаваць, нібы ігральныя карты… Раптам яму прымроілася, што насупраць за сталом сядзяць Гэлька, Сцёпка і яго маці.

Успомнілася чамусьці, як людзі пазаворвалі: «За грэх нябожчык і з таго свету адпомсціць…» У вачах у Баўгрыка затрымцела. Па целе пракаціўся холад, і тут жа яму зрабілася горача, пасля ўсяго пранёў востры боль. Стала цяжка дыхаць. Адчуў, быццам чыясьці рука дакранулася да яго твару і пачала пяшотна гладзіць. Рука нібыта Гэльчына, нібыта Сцёпкава. Толькі не, не тая брудная і валасатая, са страшнымі кручкаватымі кіпцюрамі. А можа, і яна…

З гэтым Баўгрык і ўпаў у забыцё. Назаўсёды…

…Што з Баўгрыкам нешта нядобрае здарылася, першай западозрыла ягоная суседка. Яна працавала паштальёнам. Жанчына прынесла апусціць у скрынку газеты і, павеўшы позіркам па вокнах, заўважыла: «Занавескі ж ягоныя з ночы не кранутыя. А так доўга гэты чалавек вылежвацца ў пасцелі не можа. Ён хоць і адзін усё жыццё, але ва ўсялякую пару года і ў любое надвор'е — пітушачка ранняя. А тут?!»

Калі запёртыя знутры дзверы суседцы і пакліканым ёю на дапамогу прыяцелькам усё ж удалося адчыніць, гаспадара жытла ўбачылі сядзячым ля стала з нейкімі каляровымі паперкамі ў руцэ нежывым.

— Бач ты!.. Гэта ж еўра… — выказаў сваё здзіўленне нехта.

— І якраз во… Будзе хоць за што пахаваць чалавека.

г. Іўе.

Усміхнёмся!

Адзін мужык кажа прыяцелю:

— Уяўляеш, мая жонка ўжо другі месяц выконвае спецыяльную дыету — есць адны бананы і какосавыя арэхі.

— Ну і як, вынік прыкметны?

— Ды яшчэ як: бачыў бы ты, як яна лазіць па дрэвах!

Адна з запрошаных на вяселле пытаецца ў маладога чалавека ў дарагім касцюме:

— Вы і ёсць жаніх?

— Не, я выбыў у паўфінале.

З падручніка па рускай мове для 2-га класа:

«(Якая?) (што?) завяла нас у (які?) лес».

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі. Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4366. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12